| Шотландзец . . . . . | 103 | „ |
| Англічанін . . . . . . | 101 | „ |
| Ірландзец . . . . . . | 97 | „ |
| Амэрыканец . . . . . | 77 | „ |
| Француз . . . . . . . | 76 | „ |
| Немец . . . . . . . . | 70 | „ |
| Сібірак . . . . . . . . | 58 | „ |
| Кіргіз . . . . . . . . | 43 | „ |
| Расеец . . . . . . . . | 20 | „ |

---

## Аб Расейскім гасударстве.

Усіх людзей у Расейскай дзержаві 133 мільёны 592 тысячы душ. Ўсяго жыве ў Расеі больш як 140 розных націй; вось яны:

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Вялікаросоў . | 55 | міл. | 668 | тыс. |
| Украінцоў . . | 22 | „ | 383 | „ |
| Беларусоў . . | 8 | „ | 500 | „ |
| Палякоў . . | 8 | „ | 159 | „ |
| Літвіноў . . . | 3 | „ | 096 | „ |
| Малдавян . . | 1 | „ | 145 | „ |
| Немцоў . . . | 2 | „ | 184 | „ |
| Армян, Грэкоў | 2 | „ | 190 | тыс. |
| Грузіноў . . | 2 | „ | 442 | „ |
| Фінноў. . . . | 5 | „ | 573 | „ |
| Жыдоў . . . | 5 | „ | 063 | „ |

і другіе.

Хрысьціян у Расеі больш 110 мільёноў, а нехрысьціян — больш 20 мільёноў.

На сто душ у Расеі

| | |
|---|---|
| Праваслаўных . . . . . . . | 69 |
| Староверoў . . . . . . . . | 2 |
| Армян уніятоў . . . . . . | 1 |
| Каталікоў . . . . . . . . | 10 |
| Лютэран . . . . . . . . . | 2 |
| Жыдоў . . . . . . . . | 4 |
| Магомэтан . . . . . . . . | 11 |
| Буддыстоў . . . . . . . . | 1 |

У Расеі найбольш родзіцца і памірае людзей. Толькі праз тое, што многа народу родзіцца, мы і ня вымерлі, бо у нас памірае столькі народу, як нідзе. С кожнай тысячы нарадзіўшыхся у нас памірае да 20 гадоў 563 душы, а па іншых дзержавах памірае куды менш.

Граматных ў Расеі вельмі мала: на сто душ народу граматных ёсьць 16, а неграматных 84.

Умірае ў Расеі ад гарэлкі што году 6 тысяч душ, а хворых ад гарелкі, як сьведчаць дахтары, ня менш як палавіна людзей у Расеі. Да гэтаго трэба дадаць тое, што больш пьяніц гіне ад нешчасных прыпадкоў. У 1904 гаду у Расеі было 71 тысяча 313 шынкоў, дзе прадавалася гарэлка, цяпер ёсьць ешчэ больш. Выходзіць, што у нас адзін шынок прыходзіцца на меншае чысло людзей, чым адна школа. У другіх краёх іначэй.

**С тысячы челавек у Расеі займаюцца:**

| | |
|---|---|
| Землеробствам . . . . . | 742 |
| Промысламі . . . . . . | 98 |
| Торгам . . . . . . . . | 56 |
| Другімі справамі . . . . | 104 |
| Найміто̆ў . . . . . . . | 155 |

**Маюць зямлі:**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| менш 5 дзес. | 2 міл. | 857 | т. | сямей. |
| ад 5 да 8 „ | 3 „ | 317 | „ | „ |
| „ 8--20 „ | 4 „ | 807 | „ | „ |
| „ 20—50 „ | 1 „ | 062 | „ | „ |
| больш 50 | — | 272 | „ | „ |

## Аб Беларусі.

Беларусы пераважываюць сваім чыслом другіе націіі у шэсьці губэрнях: Магілёўскай, Мінскай, Віленскай, Вітэбскай, Гродзенскай і Смаленскай. Але апрыч гэтых губэрній, каторые называюцца беларускімі, беларусы жывуць і па другіх губэрнях Жыве беларусоў:

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| ў Магілёўскай губэрні | 1 м. | 650 т. | 069 | душ. |
| „ Мінскай | 1 „ | 755 „ | 690 | „ |
| „ Віленскай | 1 „ | 076 „ | 435 | „ |
| „ Вітэбскай | „ | 976 „ | 638 | „ |
| „ Смаленскай | „ | 947 „ | 826 | „ |
| „ Гродзенскай | „ | 861 „ | 640 | „ |
| „ Чэрнігоўскай | „ | 700 „ | 000 | „ |
| „ Тверской | „ | 125 „ | 000 | „ |
| „ Ковенскай | „ | 60 „ | 000 | „ |
| „ Пскаўской | „ | 42 „ | 000 | „ |
| „ Калужскай | „ | 41 „ | 029 | „ |
| „ Орлоўскай | „ | 38 „ | 484 | „ |
| „ Сувалкскай | „ | 22 „ | 390 | „ |
| „ Курляндзкай | „ | 20 „ | 981 | „ |

А ўсяго 8 міл. 317 тыс. 961 душ.

**На сто чэлавек жыцелёў**

| | Беларусоў. | Велікарус. і украінц. | Жыдоў. | Літвіноў. | Палякоў. |
|---|---|---|---|---|---|
| У Магілёўск. губэрні: | 82 | 5 | 12 | — | 1 |
| у Мінскай губэрні: | 76 | 6 | 16 | — | 2 |
| у Віленскай губэрні: | 56 | 6 | 12 | 17 | 9 |
| у Вітэбскай губэрні: | 53 | 14 | 11 | 17 | 5 |
| у Гродзенск. губэрні: | 44 | 27 | 17 | 2 | 10 |

Па веры беларусы дзеляцца на праваслаўных і каталікоў. Акуратнаго рахунку беларусоў каталікоў і праваслаўных дагэтуль ніхто не рабіў; меней-болей толькі вядома, што беларусоў праваслаўных ёсьць блізка ў тры разы болей, чым каталікоў.

Беларусы жывуць найбольш па вёсках і належаць да найбяднейшых націй у краю. Палякі на Беларусі — гэта памешчыкі, шляхта ды малая частка мешчан. Вялікаросы у Беларусі — гэта чыноўнікі, ваенные і часьць стараверoў, каторые працуюць на зямлі. Жыды жывуць па гарадох і мястэчках і становяць таргoвы стан. Літвіны і Украінцы жывуць у пагранічных часьцях нашаго краю ў перамешку з Беларусамі па сёлах і так сама займаюцца хлебаробствам, як і Беларусы.

**Развіцьце беларускай нацiональнай душы—гэта аграмадны дар і скарб для усесьветнай людзкой культуры**

# Важнейшіе кірмашы на Беларусі.

*Віленская губэрня.*

**Боруны.** Ў дзень сьв. Духа, 29 чэрвеня і 1 кастрычніка.

**Бутрыманцы.** 1 студня і 18 чэрвеня.

**Вільня.** З 23 красавіка да 15 мая, на Казіміра і Петра

**Ворняны** 6 і 7 студня; 2 і 5 дня Вялікадня і 1 нядзелі і панядзелку ў кастрычніку (конскі).

**Высокі Двор.** 28 мая і 1 кастрычніка.

**Вішнеў.** 1 студня, 9 мая, 15 серпня, 15 верэсьня і 28 кастрычніка.

**Гадуцішкі.** 1 студня, 20 мая і 1 кастрычн ка.

**Гольшаны.** 23 красавіка і 24 чэрвеня.

**Даўгінова.** 20 і 21 мая.

**Друя.** З 6 да 10 студня і ў першую нядзелю вялікаго посту тры дні.

**Дуніловічы.** 6 студня і 1 кастрычніка.

**Жосьлі.** 6 лютаго, 3 красавіка, 16 ліпня і 1 лістапада.

**Жупраны.** 9 чэрвеня, 25 ліпня і 1 лістапада.

**Задзево.** 6 серпня.

**Крэво.** 9 мая і 1 кастрычніка.

**Лужкі.** 24 студня і 7 верэсьня.

**Мэрэч.** 1 кастрычніка.

**Мядзіол.** 4 і 12 чэрвеня, 10 серпня і 30 верэсьня.

**Мядзіол.** (казён. мяст.). На вялікім тыдні.

**Мусьнікі.** Ў дзень сьв. Тройцы.

**Оліта.** 4 сакавіка і 1 лістапада.

**Ошмяны.** 23 красавіка і 29 верэсьня.

**Радашковічы.** С 6 да 9 мая.

**Сьвенцяны.** 1—6 студня і 1—7 верэсьня.

**Смаргонь.** С 15 студня да 18, ў палавіне вялікаго посту, з 11 да 13 мая, з 20 серпня да 1 верэсьня, 8 і 28 верэсьня.

**Стоклішки.** 3 красавіка.

**Шчучын.** С 15 ліпня і 15 кастрычніка па месяцу.

**Эйшышкі.** На Ўспэстві і на шосьнік.

*Мінская губэрня.*

**Бярэзіна.** С 6 да 9 серпня.

**Бабруйск.** 1 студня, 9 мая і 1 кастрычніка.

**Барысоў.** 1 студня і на дзесятку.

**Божнігородзк.** 1 верэсьня

**Койданоў.** 1 лютаго, 23 красавіка, 8 і 18 мая, 20 чэрвеня і 1 кастрычніка.

**Логішын.** 29 чэрвеня, 6 серпня і 1 кастрычніка.

**Лоеў.** На дзесятку.

**Любешоў.** 2 мая, 8 верэсьня, 6 сьнежня.

**Мінск.** З 25 мая да 25 чэрвеня.

**Мір.** З 9 мая падрад у 4 панядзелкі і так сама с 6 сьнежня.

**Мозыр.** С 6—27 студня і с 6—28 серпня.

**Несьвіж.** С 13—17 верэсьня.

**Навагрудак.** 19 сакавіка.

**Парычы.** 14 кастрычніка.

**Петрыкоў.** 20 чэрвеня і 1 кастрычніка.

**Пінск.** На сьв. Духа, на дзесятку і з 12 да 16 чэрвеня.

**Пуховічы**. 9 мая і 6 сьнежня.

**Рэчыца**. З 9—23 мая і с 6—26 сьнежня.

**Сьвержэнь**. 29 чэрвеня.

**Стоўпцы**. 6 сакавіка.

**Туроў**. 10 лютаго і 26 чэрвеня.

**Хойнікі**. 2 лютаго і 1 кастрычніка.

## *Магілеуская губэрня.*

**Быхоў**. На 1 тыдні вялікаго посту, на дзесятку і на апошнім тыдні піліпоўкі.

**Гомель**. 1 студня, на сьв. Духа і 14 верэсьня.

**Ляды**. Ад сьв. Духа 7 дзён і 14 верэсьня.

**Любавічы**. З 1 студня да 6 лютаго.

**Магілёў**. З 10 да 18 студня, 29 чэрвеня да 2 ліпня (конскі) і 15—24 ліпня.

**Орша**. 9 мая.

**Чаўсы**. 23 красавіка, 26 лістапада і на 1 тыдні вялікаго посту.

**Чэрыкоў**. На 1 тыдні вялікаго посту, на Тройцу, 1 кастрычніка і 10 сьнежня.

**Шклоў**. На 2 тыдні вялікаго посту і на дзевятнік.

## *Вітэбская губэрня.*

**Бешэнковічы**. 29 чэрвеня.

**Веліж**. На другім тыдні вялікаго посту і з 20 чэрвеня 2 тыдні.

**Дзьвінск**. З 25 сьнежня да 7 студня і з 6 да 20 чэрвеня.

**Люцын**. З 2 лютаго і 15 серпня на два тыдні.

**Нэвэль**. З 6 студня і 20 чэрвеня па 2 тыдні.

**Освей**. У пятніцу перэд Пятром, 24 ліпня і ў маі на Міколу.

**Островіна**. На Узшэсьце.

**Полацк**. На сьв. Еўфросінію.

**Рэжыца**. З 2 ліпня і 8 верэсьня па 2 тыдні.

**Себеж**. На 1 тыдзень вялікаго посту, 25 сакавіка, 23 красавіка, 1 серпня і 26 лістапада.

## *Гродзенская губэрня.*

**Беласток**. 24 ліпня.

**Вялікая Берэстовіца** (конскі) 6 мая.

**Влодаўка**. 1 кастрычніка.

**Высоко-Літоўск**. З 25 ліпня 2 тыдні.

**Гродна**. З 26 чэрвеня да 26 ліпня.

**Зэльва**. З 25 ліпня да 25 серпня.

**Свіслоч**. 26 серпня.

## *Ковенская губэрня.*

**Відзы**. У першую нядзелю посьле Новаго Году, у сераду 4 тыдня вялікаго посту і 16 ліпня.

**Вілкомір**. На Петра.

**Ворне і Меднікі**. У першую нядзелю посьле Петра

**Ново-Александроўск**. У першую нядзелю посьле Новаго Году і 15 серпня.

# Плата за праезд чугункай.

За праезд у II классе плата паўтара раза большая, як у III, а ў I—два с палавінай раза большая.

Калі пасажыр, купіўшы білет, захочэ ехаць не на тым поездзі, які ў білеце назначэны, то павінен заявіць аб гэтым начальн·ку станціі, бо білет страціць сілу. Начальнік станціі на білецы паставіць штэмпэль. А пасьле, як ужо пасажыру прыдзецца садзіцца на той поезд, які яму патрэбен, ён павінен ізноў заявіць білет у кассе, каб адзначылі, якім поездам пасажыр едзе.

Дзяцей да 5 гадоў можна вязьці дарма, абы толькі не займалі мейсца; с 5 да 10 гадоў плоціцца ¼ часьць білету.

Кожны пасажыр можэ вязьці з сабой 40 фунтоў багажа дарма.

# За праезд параходамі.

**Па Днепру.** За праезд плоціцца:

1) Ад Оршы да Магілева: I кл. 1 р. 50 к.; II кл. 1 р.; III кл. 45 кап.

2) Магілеў—Кіеў.

| | | | |
|---|---|---|---|
| Ад Магілева да Быхова | I кл. 1 р. 35 к. | II кл. — 85 к. | III кл. — 50 к. |
| „ Рогачова | „ 1 р. 90 к. | „ 1 р. 20 к. | „ — 70 к. |
| „ Рэчыцы . | „ 3 р. 80 к. | „ 2 р. 40 к. | „ 1 р. 40 к. |
| „ Кіева . . | „ 6 р. 75 к. | „ 4 р. 40 к. | „ 2 р. 50 к. |

**Па Бярэзіне.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| Ад Лоева да Бабруйска: | I кл. 2 р. — к. | II кл. 1 р. 80 к. | III кл. 1 р. 25 к. |
| „ Бабруйска да Бярэзіны | „ 1 р. 60 к. | „ 1 р. 30 к. | „ 1 р. 05 к. |
| „ Бярэзіны да Барысова | „ 1 р. 25 к. | „ — 85 к. | „ — 70 к. |

**Па Сожы (і Днепру). Кіеў—Гомель.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| Ад Гомеля да Паповай гары: | I кл. 2 р. 50 к. | II кл. 1 р. 50 к. | III кл. — 75 к. |
| „ Кіева да Прыпяці . . | „ 2 р. 40 к. | „ 1 р. 60 к. | „ — 80 к. |
| „ Кіева да Радуля . . | „ 3 р. 60 к. | „ 2 р. 40 к. | „ 1 р. 20 к. |
| „ Кіева да Гомеля . . | „ 4 р. 50 к. | „ 3 р. — | „ 1 р. 50 к. |

**Па Прыпяці (і Днепру). Пінск—Кіеў.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| Ад Пінска да Турова: | I кл 2 р. 70 к. | II кл. 1 р. 70 к. | III кл. 1 р. — |
| „ Мозыра: . | „ 4 р. 75 к. | „ 3 р. — | „ 1 р. 75 к. |
| „ Чэрнігова: | „ 6 р. 60 к. | „ 4 р. 20 к. | „ 2 р. 40 к. |
| „ Кіева . . | „ 7 р. 40 к. | „ 4 р. 70 к. | „ 2 р. 70 к. |

**Па Заходняй Дзьвіне. Вітэбск—Дзьвінск.**

| | | |
|---|---|---|
| Ад Вітэбска да Полацка: . . . . | I кл. 1 р. 50 к. | II кл. — 95 к. |
| „ „ „ Дзісны . . . . . . | „ 1 р. 90 к. | „ 1 р. 25 к. |
| „ „ „ Дзьвінска . . . . | „ 2 р. 30 к. | „ 1 р. 50 к. |

# Почта.

**Церавод грошы на почце.** За перавод трэба плаціць: да 25 рублей—15 капеек, больш 25 і да 100 руб.—25 кап. Ад 100 да 125 руб.—40 кап. і ад 125 да 200 руб.—50 кап.

Калі грошы пераводзяцца па тэлеграфу, трэба йшчэ даплаціць столькі, як за тэлеграму у 20 слоў.

**Сколькі трэба плаціць на почце за перасылку:**

закрытаго пісьма с кожнаго лота . . . . . . . . 7 к
аткрыткі . . . . . . . . . . 3 к.
бандэрольнай пасылкі с кожных 4 лотаў . . . . . 2 к.
за цэнные і грошэвые пакеты с кожнаго лота . . 7 к

Пад бандэрольлю можна пасылаць розные друкі, дакумэнты, рукапісы, толькі-б у гэтых паперах не было асабістай перапіскі (прыватнаго лісту), вагой ня больш 4 фунтаў.

**Заказная карэспандэнція.** Заказным можна паслаць усякае закрытае і аткрытае пісьмо, а так сама і бандэроль. На канвэрце з верху трэба напісаць «Заказное» і здаць пад распіску. За заказ даплачываецца 7 капеек.

**Накладная плата.** Заказные пасылкі, закрытые і аткрытые пісьмы і бандэролі можна пасылаць з накладной платай (каб почта узяла і пераслала грошы ад таго, хто будзе атрымываць карэспандэнцію ці пасылку). За накладной платай можна пасылаць да 5 тысяч рублёў. Плаціцца да 5 рублёў—10 капеек, а вышэй 5 рублёў за кожны рубель 2 капейкі.

**Плата за тэлеграму.** У межах Эўропэйскай або Азіяцкай Расеі за кожнае слова 5 кап. Калі тэлеграма перасылаецца з Эўропэйскай Расеі у Азіяцкую ці на адварот, то за кожнае слова плаціцца 10 капеек.

## Такса на пасылкі.

За пасылку трэба плаціць:

| | У 1 поясе | У 2 поясе. | У 3 поясе. |
|---|---|---|---|
| Да 2 фунтаў . . . . | 25 к. | 35 к. | 45 к. |
| Ад 2 да 7 фунтоў . . . | 45 » | 65 » | 85 » |
| Ад 7 да 12 фунтоў . . | 65 » | 95 » | 1р.25 » |
| Калі больш за 12 фунтоў, трэба даплаціць с кожнаго фунту . | 5 » | 10 » | 15 » |

**Не чурайцесь сваей роднай беларускай мовы!**

**Дзе толькі можна, гукайце па беларуску!**

# Юрыдычны аддзел.

Справы бываюць **гражданскіе і угалоўные.**

## Валасны суд.

### Гражданскіе справы у валасным судзе.

Валасному суду належаць усе справы між мужыкамі аб надзельнай зямлі на ўселякую суму і аб усей гаспадарцы на надзельнай зямл . (Земля купленая праз „крэсціянскі банк“ лічыцца, як і надзельная). Калі пазываюць селяне ня больш, як на 300 р., то трэба падаваць у той суд, дзе жыве атветчык, а калі справа ідзе аб нерухомай маетнасьці, то ў тую воласьць, дзе яна знаходзіцца. Валасны суд павінен прыймаць жалабы на словах, можна і на пісьме. Суд валасны дармовы.

На рэшэньне суда нездаволеная старана мае права жаліцца. Жалабы на пісьме падаюцца не пазьней 30 дзён пасьля суда на імя земскаго начальніка, праз той жэ самы валасны суд, а ён перашлець у паветовы з'езд. Да жалабы трэба прыкладаць столькі яе копій. колькі атветчыкоў. А копію рэшеньня валаснога суда для з'езду ня трэба выбіраць, можна толькі браць для сябе, каб лепей зразумець рэшэньне. Воласьць сама ўжо перашле гэтые жалабы да земскаго начальніка, каторы іншые малые справы зацьверджае свaей ўласцью, а большые перэсылае у з'езд.

### Угалоўные справы ў валасным судзе.

Угалоўные праступкі разбіраюцца ў воласьці такіе: 1) каторые зроблены ня зямлі надзельнай і калі праступкі зроблены мужыкамі і проціў мужыкоў; 2) праступкі невялікіе. Калі справа непадсудна, то суд перэдае яе сам вышэйшаму. Валасны суд судзіць, напрыклад, кражы да 50 р., (апроч скаціны і коней), бойкі, сваркі, самоўпраўства, апроч парубак і др.

Нездаволенная старана падае жалабу у з'езд такім спосабам, як і гражданскіе, толькі ня трэба копіі.

---

## Земскі начальнік і гарадзкі судзьдзя.

**Гражданскіе справы.** Земскі начальнік і судзьдзя разбірае справы між усімі станамі. Земскаму начальніку падсудны справы, калі атветчык, ці *нерухомасць, аб якой ідзе гутарка, знаходзіцца ў яго*

вучастку і справа непадсудна валасному суду. Гарадзкі судзьдзя судзіць мястэчковые справы. Ён судзіць: 1) калі пазываюць ня больш як на 300 руб. (вэксэлі, страты); 2) іскі, выходзячые з уладаньня нерухомаго, ня больш як да 500 руб. (кантракты); 3) іскі аб парушэным уладаньні (аб захватах зямлі, калі не прайшло 6 месяцоў ад захвата). Аб прагонах, праездах судз ць ужо член акружнаго суда. Жалабы аб гражданскіх справах земскаму і гарадзкому судзьдзям падаюцца на пісьме, або на словах. За кожны адзін рубель іску трэба ўнясьці 1 кап. (апроч іскоў да 10 руб.—гэтые дарма). За кожны ліст поданай бумагі па 10 кап. У кожным прашэньні павінна быць напісана: 1) хто пазывае, 2) каго), 3 сколькі грошы ці што, 4) якіе мае довады (дакумэнты і сьведкі), дзе жыве сам і усе паменёные асобы, 5) на колькі рублёў ацэнівае свой іск.

## Форма прашэньня аб гражданскай справе.

ЕГО ВЫСОКОРОДІЮ

Господину Земскому Начальнику
6 участка Вилейскаго уѣзда.

Крестьянина Краильской волости дер. Пецюли Ивана Яковлева Булды.

Прошеніе.

Мѣщанинъ Иванъ Петровичъ Чайковскій, живущій въ застѣнкѣ Щорсы Краильской волости, обязѣлвя доставить мнѣ двѣ сотни кирпича въ мой домъ въ дер. Пецюли, при чемъ деньги 3 рубля получилъ впередъ и обязался роспиской доставить мнѣ хорошо выдѣланный кирпичъ на своихъ подводахъ къ 1 сентября 1911 года,—но къ этому числу Чайковскій привезъ мнѣ всего 1⅓ сотни и то плохого кирпича, стоющихъ не болѣе 1 рубля, а почему и ссылаясь на свидѣтельство Андрея Павловича Рудого, видѣвшаго привезенный кирпичъ, прошу взыскать съ Чайковскаго въ мою пользу 2 рубля и судебныя за веденіе дѣла издержки, а въ случаѣ неявки отвѣтчика прошу дѣло разобрать заочно. Свидѣтель Рудой живетъ въ дер. Значкахъ Хотыческой волости.
Настоящее дѣло прошу разобрать въ моемъ отсутствіи.*)

*Булда.*

1911 года Сентября 15.

*) Бо калі не напісаць гэтаго, то за неяўкай пазоўцы судзьдзя справу скасуе.

## Форма прашэньня аб вэксэлі.

ЕГО ВЫСОКОРОДІЮ
Господину Земскому Начальнику
5 участка Ошмянскаго уѣзда.

Крестьянина Ивана Иванова
Дулебы, Воложинской волости
дер. Смоктуны

Прошеніе.

Прилагая при семъ вексель на 300 руб., выданный мнѣ дворяниномъ Антономъ Ивановичемъ Лабановскимъ, живущимъ въ им. Краковка Воложинской волости, прошу взыскать съ Лабановскаго означенные 300 рублей съ процентомъ со дня подачи прошенія по день уплаты *), равно какъ судебныя и за веденіе дѣла издержки и наложить запрещеніе на его имѣніе „Краковка", расположенное въ Вишневской волости Ошмянскаго уѣзда, которое отвѣтчикъ собирается продать, для чего представляю квитанціи Государственнаго казначейства во внесеніи 1 р. 50 к. за наложеніе запрещенія и 3 р. 30 к., судебнаго и листового сборовъ. Настоящее дѣло прошу разобрать въ моемъ отсутствіи, а въ случаѣ неявки отвѣтчика — заочно.

*Иванъ Ивановъ Дулеба.*

20 Января 1911 г.

Калі рэшэньне войдзе ў законную сілу, то трэба выбраць спаўніцельны ліст ад земскаго і яго прэдставіць прыставу, а той будзе ўзысківаць, калі з добрай волі не заплаціць. Не пазьней месячнаго срока нездаволеная старана можэ жаліцца у з'езд, падаючы жалабу праз земскаго начальніка ці судзьдзю, што судзіў тую справу. Падаваць трэба столькі копій, колькі было праціўнікоў, і так сама трэба прылажыць ліставы збор (10 кап. з ліста) і па 1 кап. ад рубля тэй сумы, аб каторай ідзе спрэчка. Усякіе бумагі трэба падаваць праз почту, ці самому земскаму, а не праз пісароў. Каліб збору даў менш як трэба, то земскі заведоміць і дасьць тэрмін, калі даслаць недастачу. Трэба добра прачытываць усякіе павесткі і бумагі, што прысылае суд: там надрукаваны усе правілы.

**Угалоўные справы.** Земскаму начальніку і гарадзкому судзьдзі падсудны розные праступкі: 1) зробленые у іх вучастку, людзьмі розных станоў, 2) паменёные у «Уставе о наказаніях, налагаемых міровымі судьямі», калі шкоды і страты ад праступку ня болей 300 рублёў. Калі хто прычыніць сваім угалоўным праступкам якую шкоду, то можна прасіць разам і сказаць, каб вярнуць за шкоду

*) А калі вэксэль протэставаны, то і расходы за протэст.

Пры гэтым ня трэба плаціць зборoў. Ёсьць справы, ў каторых заўсёды можна м рыцца; памірыўшыся, трэба прасіць судзьдзю, справу «прэкраціць». Мірыцца можна, калі малая бойка, лаянка, парубка, самоуправство і др., а за кражу, машэнство мірыцца ня можна (апроч паміж бацькаю і дзіцяцей). Калі справа земскаму ці судзьдзі не падсудна, то яны самі перэдаюць у другі суд. Рок (срок) абжалаваньня у з'езд праз таго-ж судзьдзю 2 тыдні.

## Форма прашэньня аб угалоўнай справе.

ЕГО ВЫСОКОРОДІЮ

Господину Земскому Начальнику 5 участ. Вилейскаго уѣзда.

Крестьянина Ивана Федорова
Рыбака, жительствующаго въ д.
Колосы Радошковской вол.

П р о ш е н і е.

Въ ночь на 20 сентября сего года съ моего двора украдена овца цѣною въ 3 р. Таковую овцу я опозналъ 6 октября у мѣщанина Феликса Антонова Петрашкевича, проживающаго въ гор. Радошковичахъ по Кейданской улицѣ Прошу подвергнуть его законной отвѣтственности и взыскать съ него въ мою пользу 3 руб. Къ разбору дѣла прошу вызвать свидѣтелей: 1) Петра Феликсова Колоду, жительствующаго въ дер. Киселяхъ, Радошковск вол., который видѣлъ, какъ обвиняемый выѣзжалъ изъ дер. Колосы въ ночь на 20 Сентября, везя овцу и 1) Василія Александрова Печельскаго, живущаго въ дер. Сыцевичахъ Радунск. вол., бывшаго со мной при опознаніи овцы у мѣщанина Ф. А. Петрашкевича.

*Иванъ Федоровъ Рыбакъ.*

10 Октября 1911 г.

---

## Паветовы з'езд.

Атрымаўшы справу ад валаснога суда, земскаго начальніка, гарадзкога судзьдзі, з'езд на усе справы будзе вызываць павесткамі староны. Можна прасіць з'езд папытаць сьведкоў, што не па праўдзі паказалі, пад прысягай і прывесьці новых. Калі прывязеш сьведкоў без павестак сам у з'езд, то трэба: 1) прасіць перад разборам справы, каб іх суд дапытаў і 2) трэба пілнавацца, каб яны ў залі суда не былі, як справа пачалася, калі іх суд не пакліча. У судзе кожны павінен гаварыць праўду, каротка і не плясьці, што не належыць да справы.

**Гражданскіе справы** з'езд рэшае аканчацельна і рэшэньне спаўняецца. Напрыклад, грошы ўзысківаюць, і трэба плаціць, с

кватэры выкідаюць, з арэнды так сама; але каб сам суд зрабіў вялікую абмылку, то нездоволены можэ ў 30 дзён жаліцца губэрскаму прысутству. Але гэтую (кассацыонную) жалабу зможэ нап сацъ толькі адвакат, просячы, каб губэрскае прысутство сказало з'езду нанова разабраць справу, дый гэта рэдка бывае. Рэшэньне спраў, што прыйшлі з воласьці, з'езд перэдае для спаўненьня ў воласьць, а ў справах ад земскаго начальніка і судзьдзі трэба выбіраць спаўніцельные лісты са з'езду самому. Калі ў з'ездзі засудзяць, то лепш плаціць самому пад распіску, бо інačэй будзе ўзысківаць прыстаў, а за гэта яму прыдзецца шмат плаціць за спаўненьне.

**Угалоўные справы.** У угалоўных справах рэшэньне так сама лічыцца аканчацельным, але спаўняецца толькі тады, калі праз 2 тыдні нездаволеная старана не абжалуе у губэрскае прысутство. А калі прыгавор увайшоў у законную сілу, то яго спаўняе сам суд.

* * *

Справы, каторые не падсудны валасному суду, земскаму начальніку і гарадзкому судьдзі, разбірае *паветовы член суда і акружны суд.*

У валасным судзе, у земскаго начальніка, гарадзкога судзьдзі і з'ездзі адвакат непатрэбен, у другіх судох без адваката абыйсьціся цяжка.

---

## Аб гэрбавых марках.

Заўсёды уважайце, каб за грошы, ўзятые ад Вас на маркі, і былі куплены гэрбавые маркі ды наклеены на Вашых дакумэнтах.

Гэрбавых марак ня трэба клеіць на паперы: 1) што датыкаюць рэкрутчыны; 2) на судзебные па угалоўным справам і па тым, што разгледаюцца у міравых і гарадзкіх судзей, у земскіх начальнікоў і у павeтовых членоў акружных судоў; 3) на чэкі; 4) на ўселякіе рахункі і дакумэнты ня больш 5 рублёў; 5) на дагаворы аб найме на сельскіе работы і на рабочые кніжкі; 6) калі просіце аб назначэньні падмогі сем'ям тых, што згінулі падчас апошняй вайны з японцамі; 7) бадай на ўсе дакумэнты, што датыкаюць прасьветы; 8) на прашэньня да Цара. 9) на прашэньня аб куплі зямлі пры помачы Крэсцьянскаго Банку. 10) на свідзецельствы аб беднасьці, што збяднеўшым выдае паліція; 11) на паперы, калі іх падае чэлавек, каторага абвесьцілі „несостоятельным" даўжнікөм і 12) на палiцэйскіе дакумэнты аб „лічності" (асобе) чэлавека, як пашпорты і т. п.

## Аб тэстамэнтах.

Тэстамэнты бываюць *нотар'яльные і дамовые.*

Нотар'яльны тэстамэнт робіцца у нотар'юса нейначэй, як пры тым, хто адпісывае, і пры трох сьведках.

Дамовые тэстамэнты пішуцца там, дзе жыве той, хто адпісывае, і

ня могуць быць раней зацыверджэны, як пасьля яго сьмерці.

**Форма дамоваго тэстамэнта:**

Во имя Отца и Сына и Святого Духа. 1912 года (*гэтаго*) месяца.. дня, я, нижеподписавшійся (*стан, імя, па бацьку, прозвішчэ*), находясь въ здравомъ умѣ и твердой памяти, завѣщаю послѣ моей смерти все мое благопріобрѣтенное имущество, движимое и недвижимое, въ чемъ бы оно ни заключалось и гдѣ бы ни находилось, *такому то* (стан, імя, па бацьку і прозвішчэ таго, каму апісываецца) въ полную собственность. (Подпись адпісываючаго). Аминь.

Калі тэстамэнт пішэ сам той чэлавек, каторы адпісывае, тады трэба, каб пад тэстамэнтам былі ешчэ дзьве подписі — сьведкоў. Форма подпісі сьведкоў гэткая:

Что это духовное завѣщаніе собственноручно писано и подпись завѣщателя (яго стан, імя, па бацьку і прозвішчэ), находящагося въ здравомъ умѣ и твердой памяти, подлинна, въ томъ свидѣтелемъ былъ и руку приложилъ ..... (подпись)

Другі сьведка тое самае пішэ.

Калі тэстамэнт пішэцца рукой другога, а не таго, хто адпісывае, —тады пад тэстамэнтам павінна быць ня толькі подпісь таго, хто адпісывае, і таго, хто пісаў, але ешчэ і трох сьведкоў. У гэтым прыпадку форма подпісоў такая:

Это духовное завѣщаніе со словъ завѣщателя ... (яго стан, імя, па бацьку і прозвішчэ), находящагося въ здравомъ умѣ и твердой памяти, писалъ (напрыклад, *валасны пісар Курыла Семёноў Алексеенко*). Къ сему духовному завѣщанію... (*стан, імя, па бацьку прозвішчэ таго, хто адпісывае*) руку приложилъ (подп.) Что это духовное завѣщаніе писано волостнымъ писаремъ Курылой Семеновымъ Алексѣенко со словъ завѣщателя (*стан, імя, па бацьку і прозвішчэ адпісываючаго*), находящагося въ здравомъ умѣ и твердой памяти, и имъ, завѣщателемъ, собственноручно подписано, въ томъ свидѣтелемъ былъ и руку приложилъ... (*шляхціц Рыгор Янкоў Ярошевіч*). Въ томъ же свидѣтелемъ былъ и руку приложилъ... (напр. селянін Фёдор Мікітоў Піліпчэнко). Въ томъ же свидѣтелемъ былъ и руку приложилъ (напр. купец Мікола Станіслав оў Афанасенко).

Калі тэстамэнт пішэцца на некалькіх аркушах паперы, тады адпісываючы павінен падпісацца пад першым аркушэм, пад другім і т. д.,—аж да самаго канца тэстамэнта.

У нас ні сьведкамі ні перапісчыкамі тэстамэнтоў ня могуць быць: 1) тые, у карысьць каторых зроблен тэстамэнт; 2) крэўные да 4 лініі і сваякі, калі тэстамэнт хоць часьцю робіцца не ў карысьць простых насьледнікоў; 3) апекуны і эгзэкутары, назначаемые (спаўніцелі) у гэтым тэстамэнці; 4) тые, што, паводлуг законоў, самі ня маюць права адпісываць; 5) усе тые, што па агульным законам ня могуць быць сьведкамі у цывільных справах; 6) безлетніе і неграматные.

# Што увальняе ад ваеннай службы.

**Сямейнае палажэньне.** Льготы па сямейнаму палажэньню бываюць троякіе: *I льгота:* 1) Для аднаго сына у бацькоў, пры няздольным да працы бацьку, або матцы удаве. 2) *для* аднаго здольнаго да працы брата пры нялетніх братох і сёстрах. 3) для аднаго здольнаго да працы ўнука пры дзеду, або бабцы, калі яны ня маюць здольнаго да працы сына, 4) адзінюка пры бацькох

чават здольных да працы, 5) для дзявочаго сына, каторы корміць матку, ня маючую другіх сыноў або дачок, здольных да працы, або калі брат няздольны да працы. *II льгота*: для аднаго здольнаго да працы сына пры бацьку здольным да працы і братох, няздольных да працы. *III льгота*: для чароднаго брата па ўзятым у салдаты браце, калі той ешчэ ня скончыў службы, або калі астаўся ешчэ служыць дабравольна; так сама па браце забітым або прапаўшым на вайне.

За здольных да працы лічацца мужчыны ад 18 да 55 гадоў, апрыч: 1) няздольных да працы праз калецтво, або хваробу; 2) сасланых; 3) прапаўшых бяз весьці ад 3 гадоў; 4) адбываючых ваенную службу. Век членоў сямьі аблічаецца да 1 студня (январа) таго году, ў каторым просяць льготы.

**Прычыны дзеля каторых рэкрутоў бракуюць пры наборы.** Салдат ня можэ быць ніжэйшы 2 аршыноў і 2 1/3 вяршкоў; абхват у грудзёх павінен раўняцца палавіне узросту.

Да хвароб, дзеля каторых найчасьцей не бяруць у салдаты, прыналежыць: пухліна ўсяго цела; застарэлы рэўматызм; хваробы скуры, калі іх няможна вылечыць: лішаі, пархі, падскурные гузы (ваўдыры), калі яны меняюць кшталт цела; застарэлые скулы; пранцы; раны, калі яны перэшкаджаюць рухацца; падучая хвароба; дрыжачка рукі ці нагі; няпоўны розум; каўтун, короткасць павек; сьлепата; зыз; зарос-шые вушы; глухата, нехват вушэй; недахват ў будове губы, калі гэта перэшкаджае есьці або гаварыць; немата; зайчые вусны (трывустнасць); нехват 10 зубоў, або 8, калі іх няма у аднэй пашчэнцы; скрыўленьне шыі; валё (зоб); скрыўленьне хрэбетнай косьці; кіла; камень пузыра; недахват мужчынскаго члена, рукі, нагі, крывагубасць (скрыўленьне вусноў), нехват бальшога пальца, або паказнога на правай руцэ; або двох зразу пальцоў на аднэй руцэ; калекіе пальцы; або калі вялікі палец зросся с паказным; калі на руцэ больш 5 пальцоў.

Калі хто з рэкрутоў акажэцца за слабы на ваенную службу, або калі посьле цяжкай хваробы выздараўлівае, ці ляжыць хворы на цяжкую хваробу, каторая не увальняе ад салдатчыны, то даецца на год адсрочка; калі і ў новым наборы аказаўся-б нездароў с тых самых прычын, тады ізноў даюць на год адсрочку; а калі і за гэты год не паправіцца, то залічаюць у апалчэнцы, або зусім звальняюць ад службы.

---

**Шырце беларускае друкаванае слова паміж сваімі суседзямі, сябрамі і знаёмымі!**

# Рады для гаспадароў.

«Каб хто ведаў, дзе ён паваліцца, то пэўне-б тое мейсцо абыйшоў», гэткая у нас ёсць прыказка; найбольш успамінаюць яе нашы гаспадары: „каб хоць тыдзень спусьціўшы пасеяў, быў бы авёс, як мядзьведзь, а так прапаў да званьня“, кажэ адзін; „трэба-ж было прыпазьніцца мне з гарохам: дзянькі тры раней, — і ня трапіў-бы пад суш, а так і з насеньня звядзецца“, жаліцца другі; —„л ха надало майму аблажыць усю аселіцу, а тут—гуру - руру —і замокла ўсё сянцо—дзеж сваей сямьёй ухопіш усё“, нарэкае баба на свайго мужыка, і так усьцяж! Каб ня тое—было-б гэтак!

Добра толькі тое, што ёсць на каго бяду зваліць: то суш вінавата, то ізноў дождж не дагадзіў; то вецер выбіў. то сонцэ выпякло і т. д. Але гэткіе нарэканьня вядуцца толькі ў нас—у Беларусі; за граніцай даўно ад гэтато адвыклі, бо ўсё ім удаецца, хоць і там з Богам кантракту не пісалі. А чаму? Бо там іначэй жывуць людзі і паміж сабой. Там, калі каторы і спаткнецца, дык суседзі падхопяць, каб не паваліўся. А у нас?У нас гатовы ешчэ папхнуць, дый прытаптаць, каб не устаў. Чаму так? Ці-ж мы такіе ўжо дрэнные з натуры? Не! Ня мы дрэнные, але варункі нашаго жыцьця дрэнные; а дрэнные варункі і з добраго чэлавека зьвера робяць... Але само нарэканьне нічога не паможэ, трэба самым кратацца, а не спаць у шапку. Трэба добра ведаць, чаго нам трэба, чаго жадаць, чаго спадзевацца...

Для гаспадара варажыць, ці будзе дождж, ці пагода—німа чаго. На «а нуж» спадзевацца нельга; трэба толькі спосабы работы выбіраць як найлепшые. Калі толькі гаспадар ні з работай, ні з насеньнем не змахляваў, то гэткая праца на дзесяць год раз мо' толькі спудлуе, а у нас так вядзецца, што на дзесяць год раз толькі удаецца.

Гаспадар.

## Што трэба канешне зрабіць вясной.

На вясну кожны гаспадар хоць крыху павінен ахвяравать часу, каб падпарадкаваць свае сенажаці, гумнішчы, палеткі, дарогі і т. д. Работа гэта ня лёгкая, не малая, і за адзін год усё зрабіць, разумеецца, ня кожны зможэ. Дый лепш зрабіць менш, але акуратна, як многа, ды абы як. Найгоршымі ворагамі і замінішчамі пры гаспадарскай працы ў нас бываюць *кусты, зарасьнякі, каменьня, крушні, купіны, равы, ямы* і т. д.

*Кусты*, якіе-бы ні былі, калі церабіць толькі зверху, то гэтым іх не звядзеш, а некаторые с паміж іх праз гэта ешчэ больш набіраюць сілы у карэньнях і ўскорасьці ешчэ буйней разрастаюцца. У кожным кусьце ёсць глаўны—сярэдні карэнь; вось да яго і трэба канешне дабрацца і выкарчэваць, тады пабочные—драбнейшые лягчэй ужо будзе выдзерці да чыста, і такім парадкам, хоць марудней—менш зробіш, але пазбудзешся гэтаго воўка. Мейцсо, дзе быў куст, трэба заpaўнаваць, і калі гэта было на сенажаці, а не на гараным полі (бо і тут у нас іх хватае!), засеяць, калі ёсць, аўсом с канюшынай, а не—то патрухой ад добраго сена.

*Зарасьнякі* дзе трэба выцерабіць, то і з імі амаль не тая самая работа, як і с кустамі. Іншая зусім справа, калі трэба зніштожыць топаль, або асіну: іх карэньні ідуць у такую даль, што німа сілы павыдзіраць іх да чыста, і як толькі зрубіш дрэво, то с карэньнёў скрозь пойдуць, як бач, адросткі, і тады трудна ужо даць ім рады: пазбіваеш у адным мейсцы,—выскачаць у другім. Дык вось гэткіе дрэвы, каб іх зусім звясьці, ня трэба зразу ссекаць, а толькі акарыць кругом пень, каб ён на мейсцы засох. Гэткім парадкам засохнуць разам з дрэвам і яго карэньні, а адросткі больш не пакажуцца.

*Крушні*, дзе землі камяністые, спаткаць можна на кожным кроку: на сенажацях, па полі, нават у садох, гародах. Крушні—гэта гнёзды мурашэк, чарвей, мышэй, рознаго дзікаго зельля і уселякай брыды. Іх трэба хоць па колькі, год у год, пазбывацца. Каб разабраць крушню, трэба рыдлёўкай зняць кавалак дзірвана, а пасьля ўжо ломам аднаму падварачываць, а другому перэймаць камяні. У крушні надта вялік х каменьнёў не бывае, хіба 1—2 і то пад самым нізам—у зямлі, каторых некалісь-то гаспадар паленаваўся, або ня змог дастаць. І вось на іх-то час ад часу і сталі па каменьчыку дакідаць, ажно пакуль ня вырос цэльны курган. Гэтымі каменьнямі найлепш замяніць усе свае платы. Выкладаючы імі плот, ня трэба толькі перэсыпаць зямлёй, ані перэкладаць дзірваном, бо скора абрастае травой, а тады жывёла не так ужо баіцца, як голаго каменьня. Дробнымі каменьчыкамі можна вылажыдь ямы, равы, выбіць імі дзядзінец, торпы у будынінах, паправіць дарогі палетковые і т. п.

*Каменьні* хто мае на сваім полі, той добра ведае, якая там няспорная работа і колькі прападае снасьці, а які там выработак зямлі —то гаварыць німа чаго. Пакуль зямлі было даволі, камяніцу кідалі, але цяпер прыходзіцца хоцькі ня хоцькі брацца і да іх.

Трапляюцца каменьні надта вялікіе, па колькі дзесяткоў пудоў, але такіх бывае мала і з імі рады німа інакшай, як перш закладаць пад іх набоі с пораху, ці дынаміту, каб разарваць на часткі, і тады ўжо можна іх асіліць. Работа гэта трудная, дый небеспечная. Найбольш-жэ ў нас дробных каменьнёў і сярэднякоў. Дробные, разумеецца, збіраць хоць марудна, але не цяжка; с сярэднякамі — іншая справа, бо *бываюць паміж іх па пудоў 10—20.* Гэткіе каменьчыкі найлепш даставаць вясной, калі земля слабкая. Двух-трох мужчын,

падкапаўшы рыдлёўкай пад камень ямку, каб можна было залажыць туды вялікі, доўгі і моцны кол—бому, падважываюць сперша з аднэй стараны і; як толькі камень скранецца, падсовываюць пад яго другі, трэйці кол і гэтак без вялікай нават сілы аграмадны камень вылушчыцца на верх. Трэба толькі да гэтаго злажыцца, а работа ідзе скора і не цяжка, бо нават падростак пры гэтай занятцы можэ замяніць сталога чэлавека. Іншая справа звязьці гэтае дабро, бо на калёсы яго не узложыш. У кніжках чытаў я раду, каб вялікіе каменьні абцягнуць ланцугамі моцнымі, прыладзіць ворчык і, падчапіўшы каня, гэтак вазіць. Ні бачыў я, як гэткая работа ідзе, толькі, бадай, ці кожны (напр. круглы) камень лёгка і скора можна узяць у ланцугі. Я ў сябе раблю іначэй. Да перэдка ад калёс прывязываюцца дзьве дылёвые па аршыны 3 даўжын дошкі; канцы гэтых дошэк, што ляжаць на зямлі, падсовываюцца пад сам камень, і тады яго сунуць, хто рукамі, хто калом, па дошках у верх. Як толькі камень паехаў у гару, тады і дзіця падыйме з зямлі за канцы дошэк, пад каторые падстаўляюць другі перадок ад калёс, толькі аглаблямі ў зад. Да пярэдняго перэдка запрагаюць каня (дзе лягчэй, можна і саматугам) а за аглоблі задняго перэдка, што тырчаць у зад, бярэцца чэлавек, другі—ідзе з боку, падтрымлівае крыху камень на дошках, і тады вязі яго, куды хочэш. І гэта работа, абы злажыўся, так сама ідзе скора, прыступна, і не скажу, каб надта цяжка.

*Купіны*, пазрэзаўшы, складаць у высокіе копкі. Як перагніюць, найлепш звязьці пад стайню, ссыпаць у сухое мейсцэ і час ад часу пасыпаць гэтай зямлёй конскі гной. Тады ня толькі гною прыбудзе, але гэткі гной будзе шмат лепшы і трывалейшы, бо зэмля затрымлівае у сабе ўсю моц, якая прападае без яе с конскай мачы.

**Сябрук.**

---

# Як прыдбаць больш корму у селянскій гаспадарцы.

Ведама, што *дзеля* палепшэньня селянскай гаспадаркі трэба пабольшыць збор корму, каб можна было дзержаць патрэбнае чысло жывёлы, каб угнаіць зямельку, поле, а нават і пожні; ведама *также*, што у нас, у беларусоў, *глаўны корм для* жывёлы—апрыч поля, каторае даець салому, мякіну, вотрыны,—збіраецца з пожэнь. Сена мы дабываем з пожэнь заліўных—гэта сена мурожнае. Аб палепшэньні гэтых мурожных пожэнь я і хачу пару слоў сказаць.

Цяпер нашы мурожные пожні перасталі саўсім радзіць і перарабіліся з пожэнь у нейкіе заросшые мохам гразкіе перэлогі. Дык вось, каб нашы пожні лепей радзілі, трэба іх паправіць: дагэтуль нашы дзяды, бацькі і мы самі *толькі* ссалі пожню, а ей у абмен нічога не давалі, дык і дзіва німа, што ураджай сена вельмі паніз̇іўся. Значыць, для нашых пожэнь патрэбны дагляд; ужо невялічкі *дагляд удвоіць, а то і утроіць ураджай. Спосабоў дагляду* ёсьць многа: зрабіць асушку канавамі і дрэнамі (трубамі); сыпаць уселя-

кіе парашкі; вазіць пясок на торф. Але усе гэтые способы дорага каштуюць і спачатку нет ведама, ці прыносяць якую карысьць, дык на няпэўнае німа што выдаваць грошы; за то ёсьць многа такіх способоў, што прынясуць карысьць, а гаспадару нічога не каштуюць: трэба толькі прылажыць крыху сваей працы. Першым дзелам, на што і працы ніякай ня трэба, *ня можна пускаць жывёлы з вясны* на пожні, бо гэткая паша карысьці ніякай не прыносіць, жывёла варочаецца дамоў галодная, а атталые пожні жывёла вытаптывае, робіць сьцежкі, курганы, і дзіркі; гэта ўсё не дае умацавацца маладым расьлінам, задзержывае рост і перэшкаджае раскушчывацца траве. Паглядзім на пожні па лепшых дварох, дзе не пасуць: там, хоць пожня адзінакавая з нашай, сена заўсёды больш збіраюць: а мы пасём да Тройцы, а то і да Дзесятухі і хочэм, каб была трава! З аднаго вала двух скур не дзяруць! Другі дагляд, каторы варта ўсякаму папрабаваць, гэта баранаваньне пожэнь; яно многа прыносіць карысьці; *першае*, земля, разрыхленая бараной, дае доступ паветру у зямлю; *другое*, ад баранаваньня карэньня траў пачынаюць лепш раскушчывацца, і апроч таго пожня ачышчаецца ад моху. Найлепш баранаваць у восень,—у пяць, шэсьць зубоў, аж пакуль земля добра не пачарнеець Да баранаваньня пожэнь ёсьць асобные бароны, але яны дорага каштуюць, і аб іх цяпер замаўчым, бо гэтые бароны можна замяніць звычайнай дзерэўлянай бараной з жалезнымі зубамі, а ўжож толькі ня смыкам, бо з яго мала карысьці.

Так як і чэлавек любіць страву з добрай затоўкай, дык і земля не атказываецца ад затоўкі, а пожні тым болей. Але дзе браць гной на пожні, калі яго нават і на поле не хапаець? Ізноў жэ, падумаўшы з сэнсам і разгледзеўшыся добра, пабачым, колькі у нас гною—праўда, не хлеўнога, але ешче лепшаго—пуста прападае. Трэба, каб кожны гаспадар вычышчаў с хлявоў перагніўшую зямлю, абчышчаў у сябе двор, дрывотню, вуліцу проці сваей хаты і гар,оду, каб абкашываў летам каля хаты, хлявоў, платоў і на межах у гародзе дзяды, блякотнік, краціву і ўсякіе другіе раскудные травы, ды ўсё гэта—і зямлю з хлявоў, і паскудные травы—выбраўшы мейсцэ, зваліваў *у кучу*. Трэба, каб кожны гаспадар зрабіў сабе у зацішным мейсцы яму хадзіць да ветру (тады можэ і каля вуглоў былоб чысьцей), і каб перэсыпаў гэту яму ад часу да часу торфам, а разы два-тры на год каб вычышчаў гэту яму, складываючы кал разам с травой *у кучу*. Гэтак праз нейкі час у гаспадара збярэцца—проста з нічога—агромная куча гною, што іначэй завуць компостам. (Як рабіць компост—глядзі далей). Гэты компост перакапываецца, і як перагніець зусім, дужа добра яго вывязьці і пад яблыні, і на поле, а найлепш—на пожню разсыпаць дробна і забаранаваць. Нашы мурожные пожні—перад усім сіўцы—надта любяць компост: трава зараз пераменяецца на лепшые гатункі, і ўжо ў першым гаду збіраецца куды больш сена! Патруху с пунь, с току добра такжэ вывазіць проста на пожню, або ў тую самую компостную кучу.

*Маючы гэтак трохі больш корму* с пожэнь, трэба падумаць і аб

тым, як *яго* пабольшыць і с поля. Трэба, каб кожны гаспадар канешне сеяў канюшыну, а найлепш яе сеяць не на аддзельных кавалках поля, а увясьці ў пладазмен. Каліб гной на папар вывязьці раней, тады-б можна пасеяць віку—(добра меццъ з яе к зіме крыху добраго корму), а на жыта гэта сеўба вікі не зашкодзіць, толькі папар тады павінен быць загоран з восені. Ешчэ трэба, — калі гаспадар захочэ пабольшыць на зіму запас корму,—каб засеяў (найлепей у гародзі, бо на гэта трэба дужа добрай зямлі) кавалачэк кормнымі буракамі або кормнай морквай ці рэпай; пасеяўшы фунт, можна мець 80—100 пудоў найлепшаго корму; фунт насеньня каштуе 40—50 кап. Найлепей сеяць іх як расаду—(каля Благавешчэньня) у расадніку, а пасьля—у маі месяцы — разсаджываць флянсамі; а калі проста торкаць зерняткі, то іх перш трэба намачыць праз які дзень.

Ешчэ ёсьць спосаб, што дасьць большы запас корму к зіме. У восень выкапываецца яма на высокім мейсцы, каб вада часамі не падыйшла, і абкладываецца знізу і збоку дошчкамі, або аполкамі, і ў тую яму кладуць, парэзаўшы на сечку, ня змёрзлы ешчэ і зялёны бульбешнік, лісьця капусьцяные ці бурачаные, а такжэ атаву ад канюшыны, калі пагода не пазваляець яе дасушыцца; да гэтаго добра дадаць крыху звычайнай солі, але можна і бяз солі; ўсё гэта крэпка утаптываецца, закладаецца зверху аполкамі шчыльна і засыпаецца зямлёй, каб паветрэ (воздух) туды не даходзіло. Пасьля Каляд, адкапаўшы, мы маем дужа добры замарынаваны корм, ад катораго малако удваіваецца і каторы завуць сілос.

Усе гэтые спосабы пабольшыць корму у гаспадарцы зусім не каштоўные: абы ахвота у гаспадара да працы! А за гадоў колькі— як гаспадар, дасьць Бог, умацуецца—можна будзець узяцца каля пожэнь і другімі спосабамі, на якіе апроч працы трэба будзе патрасьці і кішэнь!

„Банадысь“.

## Шпэргель.

Недахват добрай пашы дакучае селяніну амаль не праз усё лета,—і гэты недастатак пашы як-ні-як, а адбіваецца німала на нашых ураджаях Адбіваецца, бо дзеля пашы позна загорываецца папар і жыта або позна прыходзіцца сеяць, або сыпаць зерне ў неадлежалую ральлю. Адбіваецца гэта і на ярыне, бо дзеля пашы позна загорываецца аржоньне, дык насеньне зела не пасьпевае ўзыйсьці і зацьвісьці, каб перад зімой, яго мароз зніштожыў, а астанецца ў ральлі і на вясну глушыць ярыну. Апрача таго, позна загаранае аржоньне ніколі добра непадапрэе. Вось і трэба так старацца рабіць, каб праз усё лета мець хоць невялічкіе кавалачкі, але добрай пашы, тады толькі ў нас рукі будуць развязаны і ўсю работу можна будзе зрабіць у пару.

*Шмат ужо каторые с селян нашых зразумелі гэту важную для*

сябе справу і стараюцца, каб мець хоць загончык канюшыны ў запасе, або сеюць віку ў папары. Але ёсьць ешчэ адна вельмі важная трава, здатная на пашу—*шпэргель*

Шпэргель можна сеяць і з вясны, і каля Петра, і нават пасьля Петра, разлічаючы так, што ад дня пасеву у тыдні 4—5 можна ўжо на ім прыпасываць скаціну.

Шпэргель родзіць хоць і на пешчаным грунце, абы не зусім ўжо пустым. Найлепш сеяць яго ў папары, хто мае нарыхтаваны гной пад жыта. Гэты гной трэба, значыцца, вывезьці пад першую скібу, дробненька яго прыгараць і, прыбіўшы ральлю крыху ў доўжкі, разсеяць шпэргель і забаранаваць. Садзіцца яго на морг паўтара пуда. (Сёлета цэна трымае 10 злотых за пуд). Расьце шпэргель зусім падхадзя на сьвінакроп. Каровы яго надта ласа ядуць, а малака ня толькі прыбывае, але робіцца яно наўздзіў тлустае. Ішчэ што мае да сябе шпэргель, гэта тое, што калі на якім кавалку ня можэш звясьці пырніку, то пасеяны там шпэргель зніштожыць яго да званьня; але за тое і сам ён любіць засевацца, ды ня трэба чэкаць, ажно пакуль завяжуцца галоўкі, а калі ўсяго не спасьвіў, то лепш скасіць і высушыць на зіму.

Купляць шпэргель найлепш у хаўрусных гаспадарскіх складах па гарадох.

*Вілейскі павет.* **Гаспадар.**

# Як з балота зрабіць сенажаць.

Мокрые балотные мейсцы, як ведама нам, сельскім гаспадаром, не даюць зусім ніякай карысьці. Тымчасам, такіе мейсцы можна перэрабіць на добрые, даходные сенажаці.

Я хачу кароткімі славамі апісаць, як мы перэрабілі балота на добрую сенажаць.

Сенажаць перш асушылі канавамі ў такі спосаб: па сярэдзіне выкапалі шырокую канаву глыбінёй 2 аршыны і шырынёй 1—1 с палавінай сажня; посьле што 10—15 сажнёў адна ад аднэй правялі бакавые канавы, глыбінёй 1 с палавінай аршына і шырынёй да 1 с палавінай аршына. Асушэнае мейсцо посьле ачысьцілі ад кустоў, пнёў і купін і добра перэбарнавалі. Каб злёгся верхні слой глебы посьле барнаваньня, без ніякіх гнаёў можна пасеяць чырвоную канюшыну з цімафейкай па 1 с палавінай пуда на дзесяціну. На другі год можна угнаіць, сеючы толькі штучные гнаі: томасшляк і каініт, 24 пуды на дзесяціну. Томасшляк лепей за ўсё высеваць за 3 тыдні да пасеву расьлін, змешаўшы іх добра перэд самай сяўбой і добра забарнаваць. Добра сеяць такую мешанку: канюшыны чырвонай 30 ф., швэдзкай канюшыны 25 ф., белай канюшыны 15 ф. і цімафейкі 35 ф. на адну дзесяціну.

*Перароблене такім спосабам хоць якое балота праз першые* тры гады аплачывае усе расходы на канавы і другіе работы ды дае ешчэ чысты даход.

Возьмем прыклад з асушэнай у нашай вёсцы сенажаці, каторая перш не давала ніякого даходу. А посьле таго, як мы яе асушылі, яна дала нам: у першы год з дзесяціны каля 200 пудоў сена; у другі год каля 600 пуд. і на трэцьці каля 400 пуд., значыць усяго сабралі з дзесяціны праз тры гады каля 1.200 пудоў сена. Калі палічым пуд сена толькі па 20 кап., што у нас лічыцца малой цэной, то даход будзе з сенажаці 240 рублёў, а расход быў усяго 73 рублі на дзесяціну.

**Крынічын.**

## Калі збіраць корм.

У пару і добра сабраны корм—гэта вялікая пажыва для жывёлы, а жывёла—глаўная падмога ў гаспадарцы. Шмат ёсьць такіх гаспадароў, каторые аткладаюць касьбу, ажно пакуль луг не аткрасуе і трава не устарэе; тады, кажуць яны, шмат болей сена. І праўда: на вока і вагу сена будзе болей, але карысьці з яго многа меней. Як чэлавеку лепей з'есьці менш, але чаго смачнаго ды сытнаго, чым многа перэстаяўшай якой баўтухі, так сама і жывёле лепей даць крыху, але якога маладога, пахучаго сена, чым цэлы ахапак аткрасаваўшаго, старога і як дрот цьвёрдаго. Гэткаго сена у глум ідзе шмат, бо скаціна есьць яго не ахвотна і, перэбіраючы, не мала выкідае і топчэ пад ногі; а і пажывы ў гэтым сене зусім мала. Апрача таго, калі лугавые травы (так, як і канюшыну) не скасіць у красе, а даць завязацца насеньню, то карэні гэткай травы слабеюць і на другі год луг будзе горш, слабей расьці. Вось, дзеля гэтых прычын, ніколі не чэкайце і не сьпяліце лугоў, а як толькі пакажэцца на іх самая краса—касіце.

Ешчэ болей трэба уважаць на сеяные травы: канюшыну, цімафейку і інш. Адкрасаваўшая цімафейка робіцца такая цьвёрдая, як дрот, і яе трудна нават рукамі разарваць, а жывёле тады бадай ніякога пажытку німа. Калі-ж перэстаіць канюшына, то збярэш так сама цьвёрдые цыбукі, каторые, хоць і на сечку зрэзаць, жывёла есьці ня хочэ.

**Я. Ш.**

## Як трэба збіраць сена.

Калі мы збіраем сена, дык заўсягды павінны рупіцца, каб найшыбчэй яго высушыць і ня доўга трымаць на зямлі, бо, калі трава шмат ляжыць на пожні, тады зямля пры помачы расы выцягівае з гэтай травы ўсе самые лепшые і пажыўнейшые часткі. Дзеля таго, як пожню мы косім касой, а, значыць, трава кладзецца бітымі радамі, ў каторых адразу яна акуратна ня можэ высушыцца,—мы павінны зара за касцом як найшырэй разбіць рады. Калі гаспадар *гэтаго ня зробіць, тады грубые рады толькі зверху сохнуць,* а спады-споду астаюцца мокрымі,—і трава сохне куды даўжэй, а,

значыць, і болей траціць пажыўных частак. Вось дзеля чаго зара за касцом трэба шырока разбіваць рады, а прад вечэрам сабраць у копкі, бо, як настане раса, тады земля, як ужо казаў, пачне выцягіваць с травы ўсе найлепшые сокі. На другі дзень, як раса зусім абсохне, трэба раскідаць тые малые копкі, а перад вечэрам канешне ізноў злажыць сена, але ўжо ў большые копы. А на трэйці дзень—пры добрай пагодзі—ўжо можна везьці сена ў пуню.

Калі хто мае кслые, дрэнные травы на мокрых, або тарфяністых лугах, тады гаспадар павінен іначэй збіраць сена. Зара за касцом павінен ён так сама разбіць рады, але прад вечэрам злажыць траву ў вялікіе копы—на якіе 4 вазы, ды ешчэ акуратна прытаптаць пласты. Калі ў гэтых копах патрымаць сена дзень, або два, тады яно, хоць сагрэецца і пацямнее, але будзе мецi вельмі прыемны запах, бытцам ад сьвежаго спечэнаго хлеба. А калі трава ўжо гэтак сагрэецца, што, як усунеш у сярэдзіну руку, будзе парыць,—тады трэба параскідаць тые копы; праз колькі гадзін — як будзе добрая пагода—вязі ўжо сена ў пуню! Гэты спосаб тым добры, што збор сена мала каштуе, а цьвёрдые травы памягчэюць і набяруць прыемнаго запаху. На пужайцеся, што сена будзе мецi цёмны колер—счарнее: за тое жывёла будзе ахвотней есьці, як збіранае іншым спосабам.

Памятайце толькі, каб адразу не шмат скасіць, а, значыць, і паставіць не шмат копак, бо, калі раскідаеце тые копкі, а дождж спадзе, тады ён акуратна вымые сена, забярэ ад яго самые лепшые часткі,—і гэтае сена будзе тады зусім дрэннае, а нават можэ пагніць.

**Я. Окліч.**

## Як сушыць канюшыну.

Калі пагода спрыяе, то тады, ведама, дасушыцца ня трудна, а і то трэба зважаць, каб не перэсушыць, бо ўся сіла і смак канюшыны—яе лісточкі—абатруцца, а голые дудкі хіба на падсьціл толькі будуць згодны. Але найчасьцей бывае так, што калі касьба, тады і дождж. Вось, тады с канюшынай трэба рабіць так: як завяне, а дзень выпадзе пагодны, зраньня, абы абсохла раса, трэба яе павярнуць (але не разбіваючы) на друг. бок, стараючыся, каб яна стаяла шатыром; пад вечэр паскачываць яе ў маленькіе—з аршын вышыні—копачкі, як іх завуць, хохлікі, або чубы, зважаючы, каб вярхочкі былі войстра закручэны і не так зацекала вада. Праз другіе дні гэтые хохлікі, не раскручываючы, трэба перэкуляць з боку на бок пад вецер, а калі ветру німа, то пад сонцэ. Гэтак канюшына скора і добра даходзе, а і лісточкі астаюцца цэлые. Есьць ешчэ і другі спосаб. Бяруць тры тоўстые, сукаватые, моцные па аршын шэсць жэрдкі і ставяць іх сукамі на двор у казлы; на сукі с трох старон кладуць у поперэк калы аж у верх, а на іх, як у азяроды, кладуць прывяўшую канюшыну, але так, каб асяродак пад казламі быў пусты і ад зямлі на якіе поў аршыа нканюшыпу трэба аскубсьці,

каб вецер прахадзіў; зверху гэткі стажок трэба добра завяршыць і укруг яго абгладзіць так, каб не зацякло. У гэткіх дручкох канюшына можэ стаяць хоць да зімы.

Калі каго беда прыцісьне, што мусіць складаць ці то лугавы, ці сеяны корм ня добра высушэны, хай робіць так: купіць солі і ў печы добра яе высушыць; наклаўшы рад пластоў у тарпе, пасыпаць крыху іх скрозь гэтай солей, дый зноў рад пластоў класьці, пасьля так сама дасаліць і гэтак аж у верх. Сушэная соль уцягне у сябе вільгаць і зробіцца зусім мокрай, але сена не сагрэецца, і гэткі корм жывёла есьць ласа. **Я. Ш.**

## Веснавое барнаваньне азіміны.

Азімае поле выходзіць с пад сьнегу крэпка збітым, сціснутым і патрэскаўшымся. Крэпкая кара і трэшчыны на ральлі памагаюць зямлі скарэй высыхаць і гэтым затрымываюць як рост, так кушчэньне расьлін.

Барануючы азімае поле вясной, гаспадар пушыць верхні слой зямлі, нішчыць зельле і закрывае трэшчыны; усё гэта разам робіць тое, што перэбарнаваная азіміна лепш кусьціцца і лепш расьце, бо карэньня маюць больш вільгаці, і расьліна акружэна больш пушнай зямлёй. Такім спосабам веснавое барнаваньне азіміны, асабліва пшаніцы, каторая больш кусьціцца вясной, дужа карысна для расьлін, толькі трэба выгадна выбраць час да барнаваньня Калі прапусьціць час і земля падсохне, то барана выварачывае вялікае комье разам з расьлінамі, і такое барнаваньне зробіць толькі шкоду гаспадару; пры дужа ранным барнаванні, калі земля ешчэ лішне мягкая, барана толькі гладзіць зямлю, а не разрыхляець яе, і ад такога барнаваньня німа карысьці; значыць, трэба барнаваць азіміну тады, калі земля средне мокрая і добра разбіваецца на дробные камочкі. Барнаваць трэба ў два сьляды (узад і ўперад па адным і тым-жэ самым мейсцы) і не баяцца таго, што посьле барнаваньня поле пакажэцца чорным і якбы зусім выдзертым з расьлін, бо выйшоўшые з зямлі лісьці азіміны ні маюць вялікаго значэньня і без вялікай шкоды можна іх зрываць бараной; кушчэньнеся-ж і рост лісьця ідзе на перэбаранаваным полі шмат хутчэй і за тыдзень барнаванае поле выглядае шмат лепей, чым не барнаванае. Таго, што барана зрывае шмат зялёнаго лісьця, ня трэба баяцца. Барануючы азіміну ніколі ня трэба агледацца назад, каб не баяцца сваей работы. *Што належыць да таго, чым барнаваць азіміну,* то трэба сказаць, што да гэтаго найлепшые жалезные бароны дзеля таго, што ход іх больш роўны, чым дрэўляных, і *яны, лепш пушачы зямлю,* менш вырываюць с карэнямі расьлін, але і барнаваньне найлягчэйшай дрэўлянай бараной шмат карысьней, чым пакідаць азімае поле не барнаваным на вясну.

# Як дагледаць бульбу у часе росту.

Ці то расьліна, ці жывёла, на тое, каб здарова і добра расла, а гэтым самым была карысна гаспадару, вымагае дагляду.

Бульба, як і уселякая іншая расьліна, вымагае добрай зямлі і абароны ад зельля, каб магла выдаць ураджай. Як чэлавек, так і усякая расьліна мае сваіх ворагоў, і, калі чэлавек усё сваё жыцьцё будзе толькі бараніцца ад ворагоў, каб захаваць сваё жыцьцё, то ён у іншым кірунку не здалее нічога зрабіць. Так і расьліна; асабліве, калі гэта расьліна родам з далёкай старонкі (напр. бульба родам з Амэрыкі), пасаджэная на нашай зямлі, спатыкае многа новых, незнаных ей ворагоў, с каторымі змагацца не умее. І калі мы, пасадзіўшы бульбу, пакінем яе самой сабе, яе заглушаць другіе травы і яна праз увесь час узросту будзе траціць свае сілы не на тое, каб выдаць як найбольшае патомства, але на тое, каб як небудзь пражыць. Вось-жэ інтэрэс гаспадара і ёсьць у тым, каб расьліна як найменш зужывала сіл на барацьбу, а як найбольш на тое, каб выдаць новае патомства. Дзеля гэтаго гаспадар павінен пільнаваць, каб не узнялося зеліво, каб яно не заступало сонца, каб не адбірало корму, каб земля была пухляная для карэньнёў і каб карэньням гэтым хапало у зямлі вільгаці.

Посьле таго, як бульба пасаджэна, яе іншые прыкатываюць калодай. Робіцца гэта затым, каб земля прылегала цясьней да паложэнаго у зямлю насеньня, бо гэта вызывае прыток вільгаці з ніжэйшых слаёў зямлі. З гэтаго мы лёгка зразумеем, што укатываньне бульбы можэ быць карысна пры сухой пагодзе і пры познай пасадцы. У нашым клімаце шмат больш прыгодна барнаваньне. Баранують да усходу бульбы і як толькі пакажуцца першые лісткі. Баранаваньне мае на мэці разрыхліць верхні слой зямлі, выдзерці зеліво і аблягчыць выход расткоў на верх.

Калі бульба абыйшла, яе матыкуюць і аборываюць. Матыкуюць дзеля таго, каб захаваць вільгаць у глебі і зніштожыць зельле. Часта змешываюць нашы гаспадары матыкаваньне і аборываньне; тым часам кожная з гэтых работ мае асобную мэту. Аборываюць і асыпаюць бульбу дзеля таго, каб разрыхліць зямлю і узмацаваць прырост націны і карэньнёў, а такжэ і як абарону ад зеліва.

Першы раз аборываюць у той час, калі бульба паднімецца на 4—6 цалёў ад зямлі. У мокрым і сцюдзёным клімаце, дзе садзяць бульбу мяльчэй, там абсыпаюць больш, а ў сухім і цёплым менш. Першы раз абсыпаюць мелка, каб не задзержываць росту. Так сама ня трэба с першай абсыпкай і аборываньнем лішне сьпешацца, як роўна і ня лішне пазьніцца, бо работа гэта мае на мэці пабольшэньне *ураджаю праз тое, што*, засыпаючы вядомую частку сцібла, мы прымушаем расьліну выпускаць новые карэньня і новые веткі сцібла.

*Праз два-тры тыдні, посьле першаго аборываньня і абсыпкі,*— абсыпаюць другі раз. Трэцьці і апошні раз абсыпаюць тады, калі бульба паднялася на 10—12 вяршкоў, але трэба маркаваць, каб ра-

бота гэта была зроблена перад красаваньнем, пакуль ешчэ сцібло не агрубело.

Аборываючы, трэба пілнавацца, каб не засыпаць усходоў зямлёй, бо гэта зменшывае ураджай, затрымываючы рост бульбы.

Іншые посьле аткрасаваньня бульбы зжынаюць націну, але гэтаго рабіць нікому не варта, бо гэта адбіваецца на ураджаі.

Абрываньне кветак—гэта карысная рэч: яно збольшывае ураджай, дзеля таго што карэньня не выдаюць сокоў на семя (яблычкі), але зужываюць іх да свайго узвосту.

Адным словам, расьліна жыве і ей да жыцьця, калі мы хочэм, каб нам была карысьць, павінны даць як найлепшые варункі.

**Свой.**

# Аб пасевах.

Аб палепшэньні сенакосоў і аб гнаях, бадай найважнейшай справе у гаспадарцы, мы ўжо пісалі,—але, угнаіўшы зямельку, трэба яе і вырабіць добра і засеяць.

Засеяць трэба старацца добрым зярном, „бо якое семя—такі і прыплод“, казалі нашы прадзеды, а мы часта аб гэтым забываемся і сеем іншы раз, абы тольк абкідаць поле, а з гэтаго малы толк. Зярно на насеньне трэба выбіраць як найбуйнейшае, як найлепшае і як найчысьцейшае; ніхай яно сабе і даражэй абойдзецца, на гэта глядзець німа што, бо зярно у зямлю кладзеш і спадзеваешся прыплоду з яго, а які-ж можэ быць прыплод, калі зярно будзе тошчае, худое? ведама, што і прыплод будзе тошчы, хулы. Гэта так сама як і з жывёлай. Калі, скажэм, целіцца у гаспадара худая, хворая карова, ніхто ня думае цёлку ці бычка з гэткай жывёлы пускаць на племя; а чаму-ж мы робім інакш з зярном? Ачышчаць зярно трэба добра, каб на сваім і так скупым палетку не засеваць замест збожжа рознай травы, бо травы і так лішне многа укарэнілося на нашых палетках! Ня трэба браць на семя збожжа з магазыноў, бо ў магазынах часта бывае зярно пралежалае, пратухлае і або зусім няўсходнае, або з малым клёкам. Лепш за ўсё на семя купіць зярно у дварох, дзе відаць, што гаспадарка вядзецца добра, або ў сельскагаспадарских суполках. Ня добра сеяць пастаянна сваім зярном, бо гэткім парадкам зярно вырдажаецца і мала памалу перэстае радзіць. *Калі ёсьць сваё добрае зярно, то замяні яго з суседам з другой воласьці на такоеж насеннае добрае зярно; перэмененае добрае зярно дае заўсёды лепшы ураджай на сьвежым мейсцы праз колькі першых гадоў, а посьле трэба ізноў заменяць.*

**Лемеш.**

# Карысьць з новых адмен збожжа.

Столькі гаворуць і пішуць цяпер аб новых палепшэных адменах збожжа і бульбы, што нават найцямнейшые гаспадары, бывае,

паслухаюць намаўляньня і якіх пуды два-тры гэтаго дарагога насеньня купляюць. Ды, не разумеючы, якая карысьць з гэтаго, яны часта думаюць, што ураджай свой з гэтаго насеньня удасцца ім прадаць так сама па вялікай цэне. Калі гэты інтэрэс ім непаручыць, то нераз нарэкаюць.

Збожжэ, засеванае па вёсках, розніцца ад таго, што с трудом выгадавана у школках збожжа, як, прымерам, чэлавек цёмны ад вучонаго. Бо збожжа гэтые, нераўнуючы, як дзеці у школах гадаваны і вучоны. Тые, што ў гэта кладуць сваю працу, то добрые людзі, бо яны прыспарываюць сьвету хлеба; яны вучаць збожжэ таго, што найбольш патрэбна—зрабіцца ураджайным.

Праца гэта ня лёгкая. З цэлаго поля выбіраюць адзінакавые найпаўнейшые каласы, ды з гэтых ешчэ найхарашэйшые і найцяжэйшые зерняты, каторые посьле і сеюць у школах З сабранаго з гэтых зернят ураджаю ізноў збіраюць найлепшые, найбуйнейшые і ізноў сеюць у школцы. Тутака часта адно зярно адзін колас пакazывае асобны гатунак, тады яго разводзяць, а як гэта прыкмета паўторыцца у пакаленьнях, то робіцца новая адмена. Многа трэба вучыцца, многа пасьвяціць грошы і працы, каб гэту справу давясьці да канца. Дзеля гэтаго добрые адмены збожжа такіе дарагіе. Калі ужо іх развядуць усюды, цэна на іх спадае, а зярно памалу выраджаецца, асабліва там, дзе няўмеюць з ім абхадзіцца: за густа сеюць, дрэнна збіраюць і чысьцяць. Дзеля гэтаго найбольш бывае, што хоць дарага заплаціш за насеньне, гэтай цэны за ўласны ураджай ужо ня возьмеш. Але, падумаймо, ці ж нам аб гэта ідзе? Ці ў гэтым глаўная карысьць? Ды не, ня ў гэтым. Карысьць у тым, што маем сягоньня з дзесяціны аўса (напрыклад, адмена—„Рыхлік Собешынскі“) і жыта Пэткускаго да ста пудоў і болей, бульбы Вольтманкі па 1000—1500 пудоў і больш. Ці даўней хто чуў, каб гэтак радзіла? З палавіны гэтаго рады былі.

Хто палічэ, колькі гэты прыбытак хлеба накарм ў галодных, колькі малака напіліся дзеці дзеля таго, што пабольшало пашы у гаспадарцы? А хто палічэ, сколькі край наш разбагацеў бы, каб сьвятло навукі усякаму гаспадару атчыніло вочы і каб ён з добраго насеньня пры добрым вырабе с кожнаго загона падвоіў ураджаі.

У гэтым была-б найлепшая нагрода за ахвярную працу вучоных, каторые нашэ поле і збожжэ вучаць зрабіцца ураджайнымі.

А *калі хто гэтай працы нават зразумець ешчэ ня зможэ,—ніхай*, ідучы сьледам за іншымі, для свайей карысьці гэтые «вучоные збожжа» купляе-ткі і сеець, дый с пабольшэнаго ураджаю ніхай грош які *адложыць на школу для дзяцей. Яны гэта калісь напэўна зразумеюць.*

**Гаспадар.**

## Як рабіць компост.

Компост (чорназём) з розных атпадкоў, гэта—сільны навоз, прыгодны *для ўсіх расьлін*, а асабліва *для фруктовых дрэў і кустоў*, *для гародоў і лугавых траў.*

Робяць яго такім парадкам: выбраўшы мейсцо шырынёй да 2 аршын (даўжыня можэ быць усякая) зрэзываюць дзірван і на яго мейсцо накладаюць слой гліны, каторую добра убіваюць і абкладаюць кругом дзірваном так, каб улажылася бытцым скрынка са сьценкамі з дзірвана, а дном з гліны. На гліну насыпаюць торфу або зямлі, з гародоў, ці разбітых курганоў (купін, таўшчынёй вяршкоў на 6. На прыгатаванае такім спосабам мейсцо зваліваюць, ссыпаюць, і скідаюць усякае сьмяцьцё с хаты, клеці, пуні, току сажу, попел, памыі, ваду з жлукта, папсуты корм, трыбухі і трупы жывёлы, скуру, косьці, рогі, капыты, дзірван, зямлю с канаў, іл с сажалак, старую гліну ад печоў, птушачы гной, трэскі, кару, апілкі, лісьце, мох, торф, гнілое сено, салому, мякіну і другое,—адным словам, усё, што праз менш ці больш доўгі час можэ перапрэць.

Калі компостная куча пачынае сьмярдзець, то яе трэба пасыпаць попелам, вапнай, або сухім торфам ці зямлёй. Калі куча узрасьце да двух аршын вышыні, то верх яе абсыпаюць торфяной зямлёй і усыпаюць верх так, каб на гэтым версе быў равок, у каторым бы затрымывалася дажджэвая вада, каторая патрэбна на тое, каб куча была ў сярэдзіне вільготная. Калі-б компост пры доўгай сушы пачаў высыхаць, то тады трэба у устроеную на версе канаўку ліць навозную юшку, або проста ваду. Калі першая компостная куча дойдзе патрэбнай вышыні, закладываюць другую, трэцьцюю і т. д. Першы год компост можна пакінуць у спакоі, затое на другі год яго трэба разы два-тры перэкапаць. Калі усё ўжо ў компостнай кучы перэгніе і будзе мець выгляд чорнаго парашка, бытцым добрая расадная зямля, то ўжо компост гатоў. Яго вывозяць на поле, на луг, ці на гарод і раскладаюць кучкамі, а посьле растрасаюць і разбарановываюць. Фруктовые дрэвы і кусты абсыпаюць компостам, каторы посьле, перэкапываючы, мешаюць з зямлёй кругом пня. Як ён карысьцен у гаспадарцы і як ён аплачывае паложэную на яго працу, гаварыць ня будзем, ніхай лепш кожны гаспадар сам выпрабуе хоць у малой меры гэты карысны навоз, а тады можна заручыць, што заўсёды будзе рабіць у сябе компост.

## Як палепшыць песчаную зямлю.

У нас у Беларусі ёсьць шмат песчанай зямлі, і гаспадары німаюць з яе ніякай карысьці. А земля гэта, гэто багацтво для тых, хто ведаець, што з ей рабіць.

Песчаная земля маець такіе недахваты:

1) часьці яе (пясчынкі) мала, або і зусім не звязаны с сабой, 2) слаба задзержываюць ваду, 3) лішне нагрэваецца летам і прамерзаюць зімой, 4) мала маюць у сябе пажыўных часьцін. Гаспадар павінен зрабіць, каб гэтых недахватоў не было, тады песчаная земля будзе так сама радзіць, як ўсякая другая.

Успаханая і слаба угноеная песчаная земля ужо злепляе пясчынкі, і вада у ей дзержыцца даволі доўга, гной так сама не-

даець лішне нагрэвацца ніве. У тых мейсцох, дзе вада пад песчаным грунтам стаіць высока, баяцца таго, што вады будзе мала, німа чаго, бо вада у сьпеку можэць паднімацца па карэньнях расьлін у верх.

Каб направіць песчаную зямлю і зрабіць яе прыгоднай да пасевоў, у паўднёвай Еўропе сеюць вельмі карысную расьліну лубін. Жоўты лубін (*Lupinus Luteus*) расьце на сухой песчанай глебе бяз гною і дае добры ураджай быльля, багатаго азотам. Сіні (вузкалістны) лубін (*Lupinus augustifolius*) лепш расьце на цяжкой глiністай зямлі і вымагае ужо не зусім пустой зямлі. Прафесар Богданоў пішэ аб лубіне: «німа другой расьліны, каторая-б расла так добра на самых худых песках і давала так многа таго, чаго тутка патрэба: надта многа зялёнай масы, багатай азотам».

Як усе гарашкавые расьліны (канюшына, гарох, віка), так сама і лубін тым адзначваецца, што маець на карэньні невялічкіе шышэчкі. У гэтых шышэчках жывуць нявідзімые простым вокам жывучкі (мікробы), каторые збіраюць с паветра азот, газ, патрэбны для жыцьця кожнай расьліны. На тым мейсцы, дзе ніколі ня сеяліся гарашкавые расьліны, лубін дрэнна расьце (дзеля таго, што земля не заражэная жывучкамі). На такіх мейсцах трэба перад пасевам лубіну раскідаць зямлі с таго мейсца, дзе лубін ужо рос даўней, або насеньне лубіна збрызгаць вадой, у каторай былі перш расцерты карэньня з добраго лубіну тагож самаго гатунку.

Зямлю пад лубін трэба араць з восені і тым лепш чым глыбей. Вясной пахата другі раз не арэцца, калі гэта зроблена восеняй; перэд пасевам лубіну разсеваюць попел з дрэва і баранують яго (сеюць лубін у маі месяцы). Высеваюць лубіну на дзесяціну пудоў 10, 12 і 18. Лубін, калі ён сеецца не на семя, а на зялёны гной, то яго трэба заворываць у самы час красаваньня, калі краскі йшчэ не паадпадалі. Заворываць найлепш плугам.

Апрыч лубіна палепшаюць пяскі: 1) попел з дрэва—на дзесяціну 30—50 пудоў, 2) томасшляк, супэрфосфат, каініт, вапна (15—30 пуд. на дзесяціну). Вапну пасыпаюць посьле фосфорнаго квасу, без чаго вапна можэ нават пашкодзіць зямлі. І касьцянная мука (парашок с паленых касьцей). 3) Торф вывозіцца на ніву толькі сухім, а йшчэ лепш вывазіць торф, каторы улежаўся пад жывёлай.

Гаспадары, каторые прачытаюць гэту гутарку аб палепшэньні пяскоў, ніхай не кажуць, што гэта усё добра... для паноў.

Пасейце на вашай убогай ніўцы колькі пудоў лубіну, і гэта найлепш пакажэ вам, што лубін гэта расьліна бязцэнная найбольш для бедных люцзей, у каторых нехват жывёлы, каб добра угнаіць свае поле, а проста незамянімы ён для песчаных зямель.

М. В.

## Як выбіраць добраго рабочаго каня?

У добраго, моцнаго каня галава павінна быць вялікаватая, з шырокім лобам і патыліцай, вушы не вісячые, як у каровы (асьце-

рэгайцеся клапавухіх каней), бо ужо па вушах відаць, што конь слабасільны і ляны. Апрача таго абвіслые вушы бываюць у старых каней. Вочы у каня павінны быць вялікіе, круглые, ня косые, вясёлые і рахманые, а не запаўшые і хмурые. Купляючы каня, трэба прыглядзецца к вачам, ці шэрсьць пад вачамі не абапрэла ад сьлязы, ці конь не баіцца, калі рукой пагладзіць каля вока, бо калі пачне пужацца, дык значыць, што каню ўжо лячылі вочы. Губы у каня павінны быць моцна сціснуты, бо калі ніжняя ужо вісіць, вочы запалі, вушы апусьціліся на бакі, то значыць, што конь спрацаваны і з яго карысьці ня будзе. Агледаючы галаву, ня шкодзіць залажыць руку пад сківіцы і паглядзець, ці німа якіх гузікоў, бо паміж сківіц павінен улазіць свабодна кулак; калі сківіцы шырока разстаўлены, то і гарляк свабодна там ляжыць, а ў цяжкай працы, або ў ездзе па гарах такі конь не засапецца.

Вялікаватая, цяжкая галава павінна сядзець на тоўстай шыі, бо тонкая і доўгая шыя ў каня паказывае, што ён да работы мала варт. Калі у каня ёсьць пад горлам якіе скулы, ды еще з ноздраў ідзе гной, дык такога каня нельга купляць, бо ня толькі ён сам здохне, але заразіць усю жывёлу, а падчас і людзей. Аглядаючы шыю у каня, трэба адгарнуць грыву і паглядзець, ці конь не залупліваецца і ці німа там балячэк, бо часта пад грывай бываюць фістулы, што ніколі не перэстаюць гнаіцца; іх называюць *„нарыца"*.

Грудзі ў каня павінны быць шырокіе ў лапатках і глыбокіе; коні з вузкай грудзінай замуліваюцца, кашляюць і часта бываюць з дыхаўкай. Дыхаўку лёгка спазнаць з вясны у каня на траве, дык трэба добра прыглядзецца к пахвінам, і калі конь цяжка дыхае, кашляе і пахвіны уздыймаюцца „с падхватам", як у гармоніцы, то ў гэтаго каня напэўна дыхаўка і яе вылячыць ня можна.

Крыжавіна ў каня павінна быць шырокая. Коні с шырокай крыжавінай маюць шырокі зад, і ногі у такога каня пярэдніе і заднія стаяць далёка адна ад другой, а клышавые коні да работы не здатны. Шырокім канём мы завём каня шырокай косьці, а не тлустаго, бо часта бывае, што як конь да работы не здатны, дык яго аткормяць атрубамі і бульбай і прадаюць за добрые грошы. А чэлавек без практыкі купляе і думае, што купіў „аснавітаго" каня.

Чэраво у каня не павінна быць вялікае, абвіслае, бо такіе коні, „мякіннікі"—як іх у нас называюць, да працы слабасільны.

Ногі у каня не павінны быць доўгіе і тонкіе, бо на тонкіх нагах конь ходзіць, як на кавёлах, а працаваць ня можэ. Апрача гэтаго трэба глядзець, каб хахол ля капыта ня быў доўгі і лежачы, бо такіе ногі у каня скора псуюцца. Аглядаючы ногі, трэба добра абшчупаць капыты, бо капыты с трэшчынамі, уздоўжнымі, ці папярэчнымі, надта шкодзяць каню і іх ніколі ня вылячыш; а канюхі умеюць замазываць смалой шчыліны на капыце, каб не відаць было задзірын і трэшчын. Капыт не павінен быць тоўсты, „лапцеваты", бо такіе коні ня могуць прапаваць без падкоў. Капыт павінен быць „купкавіты", слаісты, з добрым полерам. Маючы капыт у руках, трэба падняць нагу і паглядзець з нізу, ці стрэлка цэлая і не гніе,

бо як толькі сьмярдзіць і выцекае гной с капыта, каня купляць нельга.

Калена у каня павінно быць шырокае, мускулы добра відные ад лапаткі па ўсей назе.

Купляючы каня, трэба ўзяць з рук канюхоў і адвясьці ў закіпэк, а пасьля прабаваць вадзіць ступой, трухтам, праехаць верхам і запрэгчы у цяжкі воз. Конь павінен лёгка выкідаць пярэдніе ногі і шырока стаўляць задніе. Калі конь будзе якбы кульгаць на пярэднюю нагу, то трэба прабаваць на бягу завярнуць крута яго на той бок, на каторую нагу ён кульгае, а калі здаецца, што кульгае на заднюю нагу, то трэба асадзіць каня назад крокоў пяць, а тады ізноў уперад. Калі конь спраўдзі хворы, дык зараз пачне кульгаць.

Не варта купляць вялікіх каней, бо і не ў велічыні каня сіла, дый з вялікім канём многа клопату гаспадару — ані на пашу яго пусьці, ані з рук гадуй. Самы лепшы конь—гэта мерны ростам: 2 аршыны і два вяршкі, а меншые не вытрымываюць цяжкай працы.

Мы тут разглядзелі ўсе прыкметы добраго рабочага каня, але гаспадар, купляючы яго, павінен звертаць увагу ешчэ і на зубы. Па зубах можна спазнаць годы каня, але толькі па пярэдніх на дольнай ск'в цы. Зубы гэтые называюцца *рэзцамі* і іх у каня шэсьць; два крайніе называюцца *акрайкамі*; два зубы, сідзячые паміж двумя акрайкамі, называюцца *сярэднімі*, і два, сідзячые ў сярэдзіне паміж сярэдніх,—зачэпамі. Па гэтых зубах і пазнаюць, колькі гадоў каню.

**Юрка Бусел с пад Слуцка.**

## Як выбіраць добрую карову.

Пачнем агледаць карову ад галавы. Галава павінна быць не вялікая, сухая, с тонкімі рагамі; лоб вузкі, вочы рахманые і вясёлые, вушы вялікіе, морда мокрая, зубы моцные. Бугаеватая галава —самая кепская. Шыя павінна быць тонкая, доўгая, із мягкой скурай, каб, збіраючыся ў складкі, вісела пад грудзінай. Корпус (усё цела) каровы павінен быць доўгаваты, сьпіна—роўная, рэбры тонкіе і крутые з добрым прасьветам (каб паміж рэбер змясьціліся тры пальцы). Зад у каровы мусіць быць шырокі, хвост тонкі і доўгі, ногі нізкіе і простые з добрымі капытамі. (Сьцеражыцеся клышавых і цыбатых кароў). Але самая важнае ў каровы гэта вымя: вымя павінна быць вялікае і мягкое (не мясістае), выдаіўшы карову, на вымені павінны рабіцца складкі, і, ўзяўшы рукой за вымя, можна яго адцягнуць, як рэзіну. На вымені павінны быць цыцкі таўстые і кароткаватые, а вымя без валасоў. Трэба агледаць добра цыцкі, каб не было папсаваных. Жылы на чэраве ад вымені да пупа павінны быць тоўстые з гузочкамі, каб іх можна было разглядзеці, не мацаючы рукой.

Па рагах і зубах можна пазнаць, колькі гадоў карове: на рагах у каровы робяцца рубцы пасьля кожнаго целяці, а ведама ўсім,

што карова целіцца не раней, як 3-х гадоў; дык калі угледзіш, што на рагах, напрыклад, тры рубцы,—значыць, карове шэсьць гадоў.

Добрая карова павінна быць рахманая, не баяцца чэлавека, стаяць спакойне і не затрымываць малака.

**Юрка Бусел с-пад Слуцка**

# Ці варта купляць дробным гаспадаром цэнтрыфугі?

Купляць дробным гаспадаром цэнтрыфугі німа ніякога рахунку, дзеля таго:

1) Што добрая цэнтрыфуга дарага каштуець. Цэнтрыфугі танные—гэта машыны слабые і непрыгодные да вырабу масла. Толькі машына, што каштуе даражэй за рублёў 60, будзе добрая.

2) Цэнтрыфуга не зменшаець працы каля вырабу масла, бо яна толькі аддзеляе сьметану, а далей ўсё трэба так сама рабіць, як і без цэнтрыфугі. Мыцьцё ж машыны занімаець гэтулькі часу, колькі і само збіраньне сьметаны лыжкай. Такім спосабам праца пры вырабе масла не зменшаецца пры цэнтрыфузе, і яна не палепшаець гатунку гэтаго тавару.

3) Цэнтрыфуга служыць да тато, каб больш сабраць з малака масла, але трэбуе умелаго дагляду, і, як вучыць практыка, у руках няўмелых хутка псуецца і не аддзеляе добра сьметану ад малака.

Добры даход з малака можэ даць толькі *хаўрусная цэнтрыфуга*, бо толькі хэўрай можна купіць дарагую і добрую машыну. Калі ёсьць хаўрусная цэнтрыфуга, то ўвесь клопот каля малака агранічываецца тым, каб ранкам і вечэрам даставіць малако ў машыну і забраць збіранае. Хаўрус ставіць спэцыяліста — маслороба, каторы умее хадзіць каля машыны і кіраваць вырабам масла. Масла с хаўруснай цэнтрыфугі, гдзе вырабам яго заведывае спэцыяліст, бывае заўсягды лепшае. Добрае масла лёгка прадаць, і за яго плацяць лепшую цэну. *Хаўрусная цэнтрыфуга*—гэта найлепшы спосаб павялічыць даход з гаспадаркі і пазбыцца ўсяго таго клопоту, які робіць хатні выраб масла.

Добры прыклад маемо на іншых краёх, гдзе праз розных агентоў і рэклямы танные цэнтрыфугі разышліся па мужыцкіх гаспадарках, і вось там гаспадары мала маюць карысьці з малочнай гаспадаркі, бо масла вырабляецца няўмела, выходзіць тавар горшы, і на яго трудна знайсьці купца, а калі і знойдзецца, то дае малую цэну.

Даход з малочнай гаспадаркі звялічваецца толькі тады, калі яна вядзецца *хаўрусам* і ёсьць *хаўрусные цэнтрыфугі*. Гэта правіла, ўзятае с практыкі другіх краёў. Гаспадары павінны цьвёрда помніць яго і ўсемі сіламі старацца зявадзіць малочные таварыствы с хаўруснымі цэнтрыфугамі.

**Хаўруснік.**

# Нашы сады.

З давён-даўна для нашых садкоў заведзены такі парадак: капаюць яму аршын—паўтара глыбіні, аршыны два шырыні, пасыпаюць яму ураджайнай землёй, або нават перагноем, ці самым гноем, змешаным з зямлёй, і садзяць у гэтую яму дрэўца. Першые гады дрэўца ідзе-расьце, ажно люба глядзець: і ў шыркі, і ў вышкі, чыстае, гладкае, ўжо і фрукты пачынаюць паказывацца,—не нацешыцца гаспадар. Але прайшло гадоў 5—8; ні с таго, ні с сяго дрэво пачынае хварэць, кажанець, прырост зусім слабы, канцы галінак сохнуць, нападае мох, лісточкі бледные, жаўтаватые і т. д. Пачынае гаспадар нарэкаць на ўсё і на ўсіх, але толькі не на сябе. А віна якраз толькі яго і ёсьць.

Капаючы ямкі пад сад, трэба вялікую увагу мець, які у глыб ідзе грунт. Калі там адна гліна, скала, ці камяніца, то чым глыбейшую выкапаеш яму, тым глыбейшая будзе магіла твайму дрэўцу. Бо калі засыпэш гэткую яму хоць і найлепшай зямлёй, то пасаджэнае дрэўца ў добрую, пухляную зямлю пазапушчае у глыб свае карэнчыкі і, год раней, год пазьней, а выссе ўсю сілу з гэтай добрай зямлі і ўрэшці уткнецца карэньнямі у дзіч—у пустыню; вось з гэтаго часу і пачынае яно гібець, і ніякая рада яму не паможэ; пацехі з гэтаго дрэўца не прыждаць.

Хочучы узгадаваць на такіх грунтах сад і каб мець з яго карысьць, трэба рабіць зусім іначэй. Яму пад дрэўцы капаць толькі такой глыбіні, як ідзе ураджайны грунт, ў шыркі-ж можна ўзяць аршыны тры і болей. Дрэўца садзіць зусім на верху і прысыпаць навезенай з другога ураджайнаго мейсца зямлёй. Гэткае дрэўца будзе сядзець бытцым на невялічкім курганку, але за тое карэньні яго будуць разхадзіцца толькі па паласе ураджайнаго грунту.

Хто вясной маніцца капаць пад сад ямкі, ніхай звертае увагу на свой грунт.

**Сябрук.**

# Коопэрація*).

## Колькі слоу аб карысьці крэдытных хаурусоу.

Куды цяпер толькі ні глянь—ці гэта дзе пад Мінск, ці пад Полацк, ці пад Магілёў, або пад Вільню—ўсюды пабачыш беднасць, усюды пачуеш нарэканьня на нехват грошэй, каторых нашаму хлеборобу-беларусу нават пазычыць за невялікі працэнт або зусім

*) *Коопэрація—гэта супольная, хаўрусная праца.*

нельга, або вельмі цяжка. Тым часам кожны фабрыкант, купец, ці які гандляр ніколі гэтым шмат не клапоціцца, бо можэ карыстаць з банкоў, каторые знаходзяцца ў кожным горадзі і ахвотне пазычаюць яму грошы. Наш селянін найбольш ніколі ня мае сваіх уласных грошэй, назьбіраных, як кажуць, на чорную гадзіну; калі-ж прыйдзе беда, то—хоць павесься—нігдзе ня мае патрэбнаго крэдыту *). Па вёсках ды мястэчках банкоў німа, а гарадзкіе банкі бедным хлебаробам не пазычаюць.

Грошы наш хлебароб бярэ або з зямлі, або з заработкоў. Зямлі мае мала, дый і тая кепска родзіць, бо цяпер бадай кожны гаспадар з яе толькі цягне і цягне, а нічога не дае—не дае пажывы, гною і т. п.; заработкоў так сама мала, а гдзе цык і зусім німа. Тымчасам гаспадарыць так, як даўней гаспадарылі нашы бацькі ды дзяды, цяпер ужо ня можна, бо у нашых варунках гаспадарка толькі тады нешта дасьць, калі будзеш каля яе добра хадзіць, будзеш яе папраўляць, палепшаць. На гэта канешне патрэбны свабодные грошы. Апроч таго ў гаспадарцы патрэбны грошы і на іншые рэчы: акалеў конь—трэба купіць новаго; з'езьдзіўся плуг —трэба замяніць новым і т. д. У Расеі, гдзе ёсць добрые земствы, можна дастаць бадай усе гаспадарскіе прылады на крэдыт. У нас іначэй: калі маеш грошы, тады і ўсё маеш... Дык нашаму селяніну, найчасьцей зусім голаму, вельмі трудна палепшыць гаспадарку, а, значыць, і сваё жыцьцё, бо ён, можна сказаць, з аднэй гаспадаркі толькі і жыве. Во, тутака і ёсць тое зачараванае мейсцэ, з якога, калі мы самі не парупімся, нас, як той казаў, і сам рагаты чорт ня выцягне.

А тымчасам трэба ткі жыць, трэба плаціць падаткі ды купляць усё патрэбнае да хаты і ля хаты. Сваіх грошы—німа, а жыцьцё не чэкае. Што рабіць?—Трэба пазычыць. — Вось, нашым селянам і прыходзіцца ісьці за пазыкай да ліхвяроў ды багатыроў—да гэтых нашых «банкіроў». Даходы гэтых „банкіроў" растуць вельмі скора, а тые, што пазычаюць ад іх, на шмат гадоў закладаюць пяцлю на сваю шыю. Браць грошы у ліхвяра, хаця бы на вельмі карысную справу, ня толькі ня выгадна, але проста руіна для кожнаго гаспадара.

Найчасьцей бывае, што чым бяднейшы гаспадар, чым болей патрэбны яму грошы, тым большы працэнт ён плоціць. Гэткіе прыпадкі, калі бедны чэлавек аддае свайму дабрадзею — ліхвяру два рублі замест аднаго, зусім ня рэдкі (100% ў год). А часта бывае, што пазычаеш рубель, а праз месяц аддаеш ужо 1 рубель і 20—30 капеек (20%—30% у месяц; значыць, у год 240—260%, ня лічучы тых грошэй, каторые аддаў на пачастунак—гарэлку).

---

*) *Крэдыт* так сама слова не беларускае. Па нашаму яно значыць *вера.* Гэтак, калі Гаўрыла даў, ці, як кажуць, пазычыў Януку грошы на некалькі часу, дык выходзіць, што ён тые грошы як бы *паверыў* Януку. Тады і будзе называцца, што грошы адданы ў крэдыт. Той, што дае грошы, завецца *крэдыторам*, а той, што бярэ—*даужнікам*. Грошы або тавар, каторы даецца ў доўг, завецца *пазыкай*.

Ў гэткіх самых благіх варунках жывуць і нашы майстры, што займаюцца якім хатнім рэмеслом. Ня маючы ніколі свабодных грошы, бяруць яны ўсе патрэбные матер'ялы на павер, а пры разрахунку плоцяць бадай у два разы больш таго, як яны папраўдзі самі каштуюць. А тутака ізноў, як што небудзь зрабіў, дык зара і прадавай, бо крэдытар у карк гоніць: «аддавай грошы!...» I вось наш майстэр ня можэ дачэкацца акуратнай цэны і аддае гандляру-скупшчыку свой тавар за бязцэнак.

Як бачым, пакуль па вёсках і мястэчках ня будзе гэткіх інстытуцій, гдзе бы наш селянін ці рэмеснік мог дастаць грошы за невялікі працэнт, дык патуль, можна сьмела сказаць, будзе беда, а ўсе палепшэньня ў гаспадарцы дый ў жыцьцю будуць толькі дзеля багатыроў: рубель рубля спаганяе. На цэлым сьвеці гэткіе інстытуціі ўжо даўно заведзены, дый заведзені яны самімі селянамі і рэмеснікамі.

Гэта—хаўрусные банчкі *). Зусім ня трудна самім хлебаробам, калі добра возьмуцца за справу, нарыхтаваць сабе гэтак крэдыт, каб кожны з іх у патрэбі мог дастаць грошы за якіе 8—10% у год. Трэба толькі згоды колькіх чэлавек (ня меней 20), каб у сваей, ці ў суседняй вёсцы зрабіць такі хаўрус, каторы, калі добра і акуратна нарыхтаваны, можэ ратаваць сваіх членоў ад ліхвяроў і часта ставіць на ногі тых, у каго гаспадарку бадай зусім зруйнавалі даўгі.

Гэткіе інстытуціі дробнаго крэдыту—крэдытные храўрусы і пазычкова-зберэгацельные кассы—аткрываюцца па ўсей Расеі, але ешчэ іх зусім мала, калі прыраўнуем да ліку гэткіх самых хаўрусоў за граніцаю—ў Заходняй Эўропе.

Напрыклад, у Немеччыне хлебаробы маюць дужа пекные ураджаі, лепшые за нашы ў колькі разоў, бо яны маюць розные хаўрусы ды суполкі, што пазычаюць ім грошы, прадаюць іх дабро і купляюць патрэбные прылады да гаспадаркі, і такім парадкам могуць карыстаць з апошніх выдумак гаспадаркай навукі. Цяпер у Немеччыне у мужыкоў бываюць такіе ураджаі, якіх наш беларус ніколі у сябе ня бачыў: немец з аднэй дзесяціны зьбірае гэтулькі, колькі мы ў ураджайнае лета з 2—3 дзесяцін добра гноенай зямлі. Да ўсяго гэтаго не адразу яны дайшлі, але за тое яны і не чэкалі так, як мы чэкаем, нейкіх заморскіх людзей, каторые бытцым павінны завясьці у нас новае, лепшае жыцьцё без нашай працы. Яны толькі, як пабачылі карысць з акуратна выробленай зямлі ды пекные ураджаі ад добраго насеньня, пачалі злучацца ў хаўрусы, каторые і памагаюць ім купляць гаспадарскіе машыны і прылады ды выгадна прадаваць свае — ўжо шмат лепшае— зерне і тавары. Вядомая рэч, што, каб у таннейшым часі купіць жывёлу і ўсе гаспадарскіе прылады, трэба так нарыхтаваць усю

---

*) Хоць хаўрусоў ёсць шмат уселякаго гатунку, але цяпер мы будзем гукаць толькі аб самых важнейшых для нас, значыць аб крэдытовых хаўрусах, пазычкова-зберэгацельных *кассах і аб хаўрусных крамах.*

справу, каб на той час гаспадар заўсягды мог дастаць патрэбные грошы. Немцы тое, як бачым, адразу уцямілі: у іх да 1 лютаго 1908 г. было 14 тысяч 359 крэдытных хаўрусоў, 2 тысячы 86 суполак для куплі і прадажы, 2 тысячы 911 млечных суполак, 173 хаўрусы для прадажы толькі аднаго малака і 1894 уселякіх іншых хаўрусоў,—адным словам, разам 21 тысяча 420 сельска гаспадарскіх хаўрусоў!

Калі прыраўнуем тые аграмадные цыфры да ліку хаўрусоў у Расеі, дык проста сумна робіцца. Напрыклад, да 1 сакавіка 1908 году крэдытных хаўрусоў было толькі... 2 тысячы 28, а тымчасам у Немеччыне—14 тысяч 359. Але ў Расеі хлебаробоў бадай у тры разы больш, як у Немеччыне,—значыць, і крэдытных хаўрусоў павінно быць якіх 40 тысяч (14 тыс.×3) а не 2 тысячы 28. Але, гледзячы на статыстыку апошніх год, можна спадзевацца, што скора, калі толькі возьмемся ўсей грамадой, і мы можэм дайсьці да таго, да чаго ўжо немцы даўно дайшлі. Вось, у 1907 гаду адкрылося 800 крэдытных хаўрусоў, а праз апошніе тры гады лік гэтых хаўрусоў павялічыўся ў 4 разы, лік членоў—у 5 разоў, пазычкі—ў 9 разоў, ды ўласные капіталы хаўрусоў—у 6 разоў. Трэба толькі, каб мы акуратна прыгледзіліся да немецкай грамадзянскай працы і парупіліся, каб і у нас яна загарэлася вялікім чырвоным цяплом, каторае кідало бы свае агніста-залацістые прамені на ўсю нашу абездоленую старонку—Беларусь.

„...Хай нарэшце людзьмі
„Пасьля мук зажывём,
„Песьню ўсімі грудзьмі
„Пасьля сьлёз запяём!..“

Янка Окліч.

## Хаурусные крамы.

Дужа важная рэч для кожнаго гаспадара — знайсьці грошы за малы працэнт, але так сама яму вельмі важна, каб мог танна купляць усё, што патрэбна ў хаці і ля хаты. Многа тутака перэплачывае ён лішніх капеек, а з гэтых капеек складаецца што-год колькі лішніх рублёў, каторые ідуць у кішэнь гандляра, бо на гэтым і апіраецца ўвесь гандэль.

Шмат тавароў, пакуль с фабрыкі дойдуць да нас, праходзяць праз цэлую літанію пасрэднікоў—перакупшчыкоў. С фабрыкі тавар ідзе перш-на-перш у рукі гуртаўшчыка, ад гуртаўшчыка — у краму, а адгэтуль ужо—да нас. А ёсьць гэткіе рэчы, што праходзяць і праз 5—10 рук. Асабліва гэта бывае з загранічнымі таварамі. Бадай гэтую самую дарогу праходзяць і тые рэчы, што вырабляе наш гаспадар-селянін. Напрыклад, збожэ. Гаспадар прадае свае жыта вёсковаму агенту скупшчыку; той скупленае з некалькіх вёсак збожэ вязе дя вялікаго гуртаўшчыка; гуртаўшчык ужо пасылае яго цэлымі вагонамі ў вялікіе гарады; тамака пекарні купляюць

муку ды пякуць хлеб і булкі; з вялікай пекарні хлеб забіраюць дробные гандляры ды прадаюць ужо гарадзкім жыцелям. А часам бывае, што селянін купляе абаранкі на гасьцінец у хату, ды яны зроблены з яго збожа!

Ведама, што кожын гандлюе дзеля таго, каб зарабіць; вось, падумайце толькі, колькі лішніх грошы павінен кожны з нас аддаць за тавар, каб зарабіў і фабрыкант, і цэлая грамада гандляроў, бо кожны с пасрэднікоў на цэну тавару накідае за сваю працу па колькі грошэй ці капеек.—Гэтак цэна тавару расьце і расьце.

Так сама, калі німа блізка вёскі мястэчка, а, значыць, і крамы, дык колькі нявыгады мае наш селянін! Часам чэлавек знарок едзе 10—15 вёрст, каб нешта купіць,—а як тамака ня згодзіцца на цэну ці гатунак тавару, дык і дзень сатрэ дарма, і каня намучыць, і ешчэ купіць ня тое, што хацеў.

Каб не было гэтых клапотоў, людзі ўздумалі, што найлепей будзе закладаць у сваіх кутох хаўрусные крамы, дзе можна было-б купіць танна і у добрым гатунку ўсё, што патрэбна ў жыцьці. Гэткіе крамы перш-на-перш закладаліся толькі па гарадох ды работнікамі ў фабрыках, але цяпер скрозь пачынаюць да іх брацца вёсковые людзі, бо бачуць, што гэта вельмі важная і карысная рэч. Хаўрусные крамы выпісываюць усе тавары або проста с фабрык, або ад вялікіх гуртаўшчыкоў, з складоў і т. д., дый гэтак, мінаючы перакупшчыкоў, маюць усё за меншые грошы. Так сама крама можэ прадаваць і свае селянскіе вырабы.

Ня кажучы аб усіх выгодах, якіе дае сваім членам хаўрусная крама, яна шмат можэ зрабіць і дзеля грамадзянскай справы. Ведама, што кожын год крама будзе даваць сякі-такі даход. Павэдлуг статута гэты даход дзеліцца між членамі так, каб той меў больш даходу, хто больш у яе тавароў купляў. Але с чыстаго даходу можна што год аддаваць частку на культурные патрэбы грамадзян: на бібліотэкі, чытальні, школы і т. д. Дык калі крама пойдзе добра, калі ўсе хаўруснікі будуць рупіцца аб ёй, тады будзе больш чыстаго даходу, і больш грошы можна будзе аддаваць на карысные грамадзянскіе справы.

Калі мы прыглядзімся да працы загранічных хаўрусных крам, то пабачым аграмадную карысць, якую прыносяць яны сваім членам. Напрыклад, Рочдэльская хаўрусная крама (ў Англіі), як закладалася (ў 1844 гаду), дык мела толькі ўсяго на усё 280 рублёў, — а ў 1891 гаду ўжо мела чыстаго даходу больш за 3 мільёны рублёў. З гэтаго тамака шмат даюць на розные культурные справы. Цяпер рочдэльцы,—ня лічучы ўжо ўласных фабрык і ўласных будынкоў пад крамы,—маюць вялікую школу, ў каторай вучыцца каля 450 дзетак, маюць аграмадную бібліотэку-чытальню, дзе можна знайсьці ўселякіе кніжкі і газэты; апроч таго, дзеля навукі і прыемнасьці сваіх членоў тамака робяць тэатры і забавы, ігрышчы, чытаюць лекціі аб усім, што робіцца на сьвеці, і т. д. Праўда, Рочдэль—горад фабрычны, дзеля таго і тая крама маючы шмат членоў, можэ шмат рабіць карыснаго. Дык, вось, апішэм хаўрусную

краму, што працуе ў расейскай вёсцы, значыць, бадай у такіх самых варунках, як жывём мы. У галодным 1902 гаду адзін хаўрус у Ташыйскай воласьці (ў Расеі) пачаў перш-на-перш купляць на старане збожэ і прадаваць яго сваім селянам,—а пасьля члены яго пастанавілі аткрыць ў аднэй з сваіх вёсак хаўрусную краму. Гандэль адразу нарыхтаваўся, пайшоў добра і ўжо ў першым гаду даў чыстаго даходу 926 р. 35 кап., а ў другім—2 тысячы 231 руб. 54 к. С чыстаго даходу за першы год хаўрус даў 342 руб., каб направіць школьны будынак, 127 р. на земскую аптэку і 100 р. на папраўку муру на магілках. З даходу другога году 500 р. ізноў далі на школу (дзеля таго, што недаўна напраўленая спалілася), 35 р.—на чытальню і больш за 400 р., каб перэрабіць хату, ў якой знаходзілася крама. Шмат ешчэ можна было-б апісаць такіх хаўрусоў, каторые не мала грошы даюць на грамадзянскіе справы дзеля палепшэньня нашаго супольнаго жыцьця. Значыць, ізноў бачым, што сваімі сіламі пры добрай ахвоці мы маглі б многа зрабіць дзеля таго, каб лепей нарыхтаваць сваё жыцьцё.

Я. Окліч.

Хто надумаў бы узяцца за аткрыцьце у сваім куце хаўруснай крамы, той ніхай напішэ пісульку у *Віленское Товарыство для помачы Коопэрацыі.* (Вільно, Б. Погулянка д. 4, кв. 18). Адтуль прышлюць яму усе патрэбные рады і навучаць, як што рабіць.

---

### Аб бацькаўшчыне розныхъ расьлін.

Ня думайце, што ўсе гэтые расьліны, якіе бачыце ўвакол сябе, растуць у нас спрадвекоў, бо ёсьць у нас шмат такіх, каторые і былі прывезены з розных старонак. Гэтак спаміж глаўнейшых нашых расьлін жыта прывязлі да нас з Сыбіры, бульбу і тутун з Амэрыкі, гарох і цыбулю з Эгіпту, агуркі з Усходняй Індіі, авёс с поўначы Афрыкі, пятрушку з вострова Сардыніі, рэдзьку з Японіі і Кітая, мак так сама з Усходу, а падсоўнечнік с Пэру.

### Загадка.

Нехта у турме каже другому аб адным арэштанці: „Братоў і сёстр ня меў і ні маю я, але бацька гэтаго чэлавека быў сынам майго бацькі“. Кім арэштант яму прыходзіцца?

Сынам.

### Загадкі.

Дзесяць падарожных зажадало сабе пакоеў у гасцінніцы... «Маю толькі 9 пакоеў» — сказаў уладзелец гэтай гасцінніцы — „але думаю, што ўсіх намешчу“. Пасьля папрасіў першаго пачэкаць, другога памесьціў у першым пакоі, трэйцяго у другім, чацьвёртаго у трэйцім, пятаго у чацьвёртым, шостаго у пятым, сёмаго у шостым, восьмого у сёмым, девятаго у восьмым, урэшці вярнуўся да апошняго і памесьціў у 9 пакоі. Як гэта было?

# Лекарскі аддзел.

## Як гадаваць нашых дзяцей?

Як часта прыходзяць да дахтароў кабеты с хворымі дзяцьмі і чаго тады дохтар ад іх не наслухаецца!

Папытаецца толькі: „чым дзіця корміце?“.—„А вось, што самі ядзім, то і яму даём“... А дзіцяці йшчэ да году далёка!

„А як часта корміце?“—„Як крычыць, дык і кормім“...

І посьле дзівуюцца, што дзіця хворае! Гэта-ж яно часам аб'елася, ажно жывот баліць, і крычыць; а маці яму ізноў цыцку ў губу суне.

І як тут дзівавацца, што дзеці нашы хварэюць і гібнуць, як мухі?!

Не умеюць нашы кабеты гадаваць дзяцей, а да дахтароў нясуць у апошняй бядзе. Невялікае дзіва, што і дохтар тады ніякай рады ні дасць. Хоць бы і даў, дык маці, да хаты прышоўшы, скажэ: „Вось, дзіця галоднае, крычыць,—як жэ яму ні даць ссаць?“ — Або у летку у дзіцяці вольнасць, дохтар парашкоў запішэ і кажэ: „Праз цэльнную пару нічога апрача гарбаты або румянку дзіцяці не давай“. А каторая дохтара паслухае? „Замарыць ён хочё дзіця, ці што? Як гэта пражыць дзень на аднэй вадзе?“—скажэ маці і дасць яму у рукі абаранак, агурок, ці яблыка.

Горэ дахтаром з нашымі кабетамі! Ня слухаюць, дый годзе. А лепш бы ім дзеці гадаваліся, каб інačэй іх даглядалі.

Як толькі дзіця родзіцца на сьвет і аддзеліцца ад маткі, трэба яго выкупаць і вымыць. Галоўку можна мыць жаўтком з яйка, усё цела намазаць аліваи, а посьле вымыць добрым мылам (—*марсэльскае* мыла можна дастаць у аптэчным складзі). Уважайце толькі, каб начоўкі, гдзе дзіця купаеце, былі чыста вымыты, а вада не была гарачая, а толькі так цёплая, каб руку свабодна ў ёй можна было дзержаць. Выкупаўшы, трэба выцерці суха мякінькай рызінкай і, ўзяўшы на чыстую ватку крыху парашку *гіпсу* (на 5 кап. узяць у аптэчным складзі), абярнуць ёю пупок дзіцяці. Кожны дзень зменяць гэту павязку.

Посьле дзіцяці лепш не купаць болей, пакуль пупок не зажыве, а толькі чысьценька падмываць; падмыўшы, высушыць рызінкай ці ваткай і прысыпаць хаця-бы картапляной мукой.

Калі пупок зажыве, можна ізноў пачаць купаць дзіця—да пяці месяцоў што дзень, а пасьля—два разы ў тыдзень у цёплай вадзе.

Ак жэ і калі трэба карміць дзіця?

Найлепшы корм для дзіцяці—малако маткі.

Першы раз маці корміць дзіця, пачэкаўшы 6 або 8 гадзін посьле радзін.

Карміць трэба не тады, калі дзіця крычыць, бо крычыць яно часамі ад таго, што аб'елося і жывот яму баліць Трэба карміць дзіця акуратна праз кожные тры гадзіны, а у ночы найбольш два разы,—калі-ж сьпіць, дык будзіць ня трэба. Значыць, у пару да 5 месяцоў трэба карміць 8 разоў: 6 разоў у дзень і 2 разы у ночы. Ад шостаго месяца у ночы саўсім карміць ня трэба.

Маці павінна уважаць, каб даваць дзіцяці кожын раз з іншай грудзі: раз—з левай, другі раз—с правай, бо іначэй дзіця будзе раз сытае, а другі раз—галоднае.

Каб дзіця мело чыстую страву, трэба грудзі кожын раз перад тым, як даваць ссаць, абмыць перакіпеўшай вадой, а йшчэ лепей узяць ложэчку борнаго квасу (—дастанеш у аптэчным складзі) на шклянку перэгатованай вады і гэтым уселякі раз абмываць грудзі.

Гэта чыстата патрэбна і для дзіцяці і для маткі, бо у маткі часта грудзі баляць, робяцца ранкі, або прыпадзе грудніца.

Як толькі забаліць у маткі сасок, трэба перэстаць карміць дзіця, малако здаіваць, а сасок на грудзях абмываць разы два крэпкай водкай. Часамі цераз дні тры ранкі зажывуць і можна карміць далей.—Горэй, калі прыпадзе грудніца. Грудзі робяцца цьвёрдые, гарачые і пачынаюць дужа балець. Тады так сама трэба перэстаць карміць дзіця, малако здаіваць, а на грудзі кожные дзьве гадзіны прыкладаць рызінку, намачыўшы яе у крэпкім спірце (—дастанеш у манапольцы); на рызінку палажыць ваты і цёпла, моцна увязаць. Калі цераз два дні баліць так сама, то замест спірту лепш мачыць рызінку у чыстай халоднай вадзе, на рызінку палажыць цыраткі, або хаця васковай паперы (з аптэкі), на гэта—вату і хусткай акуратне абвярцець ды ехаць да дохтара.

Бывае, што часамі матка ці хворая, ці малака у яе нехват, ці трэба йсьці на работу, а дзіця дома пакінуць. Як-жэ яго тады карміць? Бяруць малако ад каровы і гатуюць яго, пакуль не закіпіць. Тады йшчэ мінут 10 трымаюць яго на агні. У аптэчным складзі купляюць *млечнаго цукру* (ён не дарагі і здаравейшы для дзіцяці). Гэтаго млечнаго цукру бяруць 2 гарбатніе ложэчкі на шклянку перакіпеўшай вады і мешаюць гэту салодкую ваду з малаком такім способам: *для дзіцяці да аднаго месяца* бяруць адну часць малака на дзьве часьці гэтай салодкай вады, а *для дзіцяці да пяці месяцоў* — папалові малака і вады. Ад 6 месяцоў можна карміць дзіця ўжо цэльным малаком.

Мы ўжо ведаем, колькі разоў у дзень трэба карміць дзіця. Колькі-ж дзіцяці даваць за-раз гэтаго малака?

*Першы тыдзень трэба даваць за-раз ня болей, як 2 ложкі* сталовые гэтаго малака. Пачынаючы з другога тыдня, можна даваць ужо па 4 ложкі за раз. Двухмесячнае дзіця будзе выпіваць за-раз *6 ложэк;* чатырохмесячнае—*8 ложэк;* шэсьцімесячнае—10. Старшые

дзеці—па 12 ложэк малака за-раз.—Каб кожын раз не лічыць ложэк, можна з якой пасудзіны зрабіць сабе мерку; трэба толькі, каб уся пасудзінка для дзіцяці была вельмі чыстая і каб матка перад тым, як пакарміць дзіця, сама малако папрабавала, ці не кваснае яно, і, падагрэўшы крыху, ці не гарачае. Малако даюць дзіцяці с чысьценькай бутэлькі, налажыўшы на яе соску. Соска павінна быць чорная (белые нядобрые); дзірка ў сосцы—невялічкая. Соску трэба кожны раз посьле яды чысьценька вымыць.

Але і дзіця пры грудзі трэба прывучаць да інакшай яды, трэба яго прыкармліваць. Пачынаць прыкармліваць дзіця трэба, калі яно кончыць 6 месяцоў. Летам лепш не пачынаць прыкармліваць, бо у летку дзеці часта хварэюць на жывот; лепей пачэкаць да восені.

Прыкармліваюць гэтак: даюць перэгатованае кароўе малако, разбавіўшы яго на палавіну перакіпеўшай вадой. Гэткаго малака даюць па 8 сталовых ложэк 1 раз у дзень. Так тры дні. Посьле па 8 сталовых ложэк па 2 разы ў дзень; ізноў тры дні. Калі дзіця здаровае, дык на сёмый дзень даюць яму кашку. Значыць, кормяць яго так: 3 разы ў дзень грудзьмі, 2 разы малаком і 1 раз кашкай.

Да малака прыліваюць усё меней і меней вады, а цераз 2 месяцы даюць ужо цэльнае малако. З дзевятаго месяца можна дзіцяці даваць раз у дзень жаўток з яечка і трохі сухой булачкі, толькі ня чорнаго хлеба. А з дзесятаго месяца, калі той не выпадае у летку, трэба адлучыць дзіця, бо і мацъ яно сцягне, і дзіцяці з гэтаго малака ўжо невялікая карысць. Летам лепш не адлучаць, а пачэкаць да восені. Але на што нашы кабеты кормаць дзіця да $1^1/_2$ і да 2 гадоў, гэтаго і яны самые, мусіць, добра ня ведаюць!

Калі матка нясе з сабой дзіця ў поле на работу, то яна яго і накорміць і дагледзіць; але бывае і гэтак, што яго ў хаці пакіне, даўшы соску ў губу, або памачыўшы хлеба ў рызінку паложыць, ці малаком з маку яго напоіць, каб дзіця лепш спало. Гэткіе найпэўней сваіх дзяцей на той сьвет скора павыпраўляюць!

Есць ешчэ у нас па вёсках благі звычай, што матка укручывае дзіця як можна тужэй, каб яно ні рукой ні нагой не крануло, бо—кажэ—яно бытцым-то спаць іначэй ня будзе. Нігдзе больш гэтаго ўжо ня робяць, толькі у нас па вёсках, а сьпяць жэ дзеці на ўсім сьвеці.

Так сама, кажуць, дзіця бытцым-то не засьне, пакуль яго не пакалышуць. Каб здароваго сталога чэлавека гэтак калыхалі, як нашы кабеты сваіх дзяцей, дык ён бы уцёк ад гэткай радасьці, а не заснуў бы! А, нябось, ноччу добра сьпіць.—Чаму-ж гэтае калыханьне дзіцяці патрэбно? Ізноў гэта толькі наш звычай. У другіх народоў бачыў—нігдзе дзяцей не калыхаюць, а яны самі сьпяць, як ня трэба лепей.

Ды йшчэ каб калыхалі толькі,—а то гунькай закрыюць калыску, і ажно дзіва, як дзіця там не задушыцца? Закрываць калыску трэба толькі ад мух летам і то чым тонкім, каб паветрэ лёганька прахадзіло.

Добрая яда, чыстата і сьвежы воздух—гэта найважнейшые рэчы для дзіцяці, і каб нашы гаспадыні больш аб гэтым думалі, былі-б і дзеці здаравейшы, і меней бы грошы пайшло на дахтароў і лекі. І. Б.

## Сухоты.

Сухоты—гэта надта цяжкая хвароба, надта заразлівая. Што год ад сухотоў зьмірае многа народу,—маладых, паджылых і зусім малых дзяцей. Гэтая хвароба ёсць па ўсіх краёх, па гарадох і па вёсках, у багатых і у бедных. Але ня трэба баяцца, што ад яе ўжо і рады няма. І рада ёсць, і асьцерагчыся можна, але трэба пілнавацца. Трэба ведаць, аткуль бярэцца гэта хвароба і як зараза прыстае да здаровага чалавека ад хворага. Хвароба гэта робіцца ад малюсенечкай жывёлачкі, як-бы рабачка (мікроба), па дохтарску яе завуць „тубэркулёзная бацілла". Чалавеччым вокам разглядзець яе нельга, яе толькі можна ўбачыць праз шкло такое, што кожную рэч паказывае вялішкай у сто, трыста або і ў тысячу разоў: праз гэтакае шкло адзін надта знатный дохтар Кох дагледзіў першы гэтаго рабачка, што сухоты робіць. Гэтый рабачок—мікроб, як упадзець каму у нутро, то і пачынае яго есьці і пладзіцца тамака. Праз гэта самае чалавек хварэець, сохнець дый паміраець. Найчасьцей заводзіцца гэтый мікроб у грудзёх, у лёгкіх, але ён можэ быць і у вантробі, у нэрках, у кішках, у мазгу, у касьцях, у-ва ўсім целі. Ён надта жывучы і пладавіты. Як упадзе ў лёгкіе і пачне пладзіцца, то робяцца там гузакі з гарошыну або і з яблык. Гузакі панарываюць і пасярод іх робяцца кобкі. Што далей, кобкі ўсё разрабляюцца і лёгкае разгніваецца. Хворый ня мае чым дыхаць, ды і кроў яго ад гэтай атруты псуецца —і ён праз гэта паміраець. Ад сухот найбольш паміраець людзей маладых; хвароба надта лёгка ад хворых пераходзіць на здаровых, а лячыць сухоты трудна, і сухотаў трэба сьцерагчыся, як найцяжэйшай хваробы. Людзям паджылым—так за гадоў 50—сухоты ня дужа страшны.

А якім спосабам сухоты ад хворых пераходзяць на здаровых? Усяк, але найчасьцей праз харкавіны (ахракі). Хворые многа кашляюць і плююць на зямлю, а у тых харкавінах заўсягды ёсць многа мікробаў. Як толькі харкавіны высахнуць, ды с пылам разатруцца, змешаюцца, пыл тады падымаецца ўверх, а людзі дышуць, і гэтый пыл набіраецца ў нос і ў лёгкае; там мікробы аджываюць, як насевьне ў полі, дый пачнуць глуміць чалавека. Ешчэ зараза можэ прычапіцца ад бруднай бялізны, ад насатак, калі у бабы, што будзе мыць бялізну, на руках ёсць якіе-небудзь ранкі. Для таго, каб асьцерагчыся сухот, трэба, каб хворые ня плюлі на падлогу або на зямлю, трэба, каб у кожнай хаці, хоць бы хворых і не было, стаяла у кутку гдзе-небудзь пасудзінка з вадой. У гэту пасудзінку ніхай усякі, каму трэба, плюець і харкаець, а у вечары гаспадыня павінна гэтые харкавіны закапаць гдзе-небудзь у гародзі, досі глыбока-

У хаці, гдзе ёсць хворый на кашэль, трэба у гэту судзінку падліваць карболкі або чаго другога папрасіць у дохтара для „дэзынфэкціі“, і у вечар так сама выліваць і закапываць. Ешчэ можна сухотоў набрацца і ад кароў. На сухоты жывёла часта хварэе, і ад хворай каровы малако людзём шкодзіць.

Калі ня ведаеш напэўна, ці жывёла здарова, лепш ня піць сырога малака, але гатаванае. Мяса ад сухотнай жывёлы так сама можэ зашкодзіць,—трэба яго добра угатаваць або усмажыць. Ёсць здаровые людзі такіе, што ім ні малако, ні мяса ад сухотнай скаціны не зашкодзіць; нават паміж хворых жыць будуць, і то не захварэюць. Але такое шчасьце не ўсякаму Бог дае, трэба лепш помніць прыказку: сьцеражонаго і Бог сьцеражэць!

Кажуць людзі, што ад бацькоў сухотнікоў дзеці сухотнікамі родзяцца; гэта ня пэўна: бывае і гэтак, але найчасьцей ад сухотнікоў родзяцца дзеці слабые, а слабые сухот набіраюцца надта лёгка.

Калі сухоты гэткая цяжкая і ліпкая хвароба, то ці можна ад яе вылячыцца? Можна, але трудна. Каб ад сухот вылячыцца, трэба мець добрую ежу (малако, мяса, яйкі), прабываць шмат часу на сьвежым воздусі, быць спакойным. Гэтаго дома ні бедный ні багатый не патрапіць хвораму даставіць. Багатый дасць добрую ежу, але як ня будзе добрай, цёплай пагоды, то хвораму прыходзіцца сядзець у хаці, ў духаце. А спакойнасьці як дасі? То дзеці плачуць, то сварка якая, то йшчэ якое ліха. А ўжо беднаму то йшчэ горш. У бальніцы сухотнікам так сама ня надта добра, бо там усякіе хворые, ды і паветра мала. Для сухотнікоў будують асобные бальніцы з вялікімі сьветлымі пакоямі, ды ў сасновым бары. Сасновый дух надта памоцны ў сухотах. Гэтые будынкі называюць не бальніцамі, але *санаторыямі*, і там хворые маюць усё, што ім трэба: і даглёд, і лекі, і харчы. Калі зачаць лячыць сухоты ад самаго пачатку, ды ў санаторыі,—то можна і вылячыць; а хто запусьціць, таму хоць паправа і будзе, ды ўжо хто да астанняго схварэе, таму, ведама, нічога не паможэ. За граніцай такіх санаторый для сухотнікоў шмат ужо ёсць, у нас ешчэ ня дужа; але т-кі людзі, жывучы, павінны старацца, каб сабе памагаць у кожнай бядзе, і трэба мець надзею, што і у нас сананоры пабудуюць.

## Беларускіе назвы месяцоў.

*Студзень* дужа сьюдзёны.

*Люты*—люты, сярдзіты.

*Сакавік*—дрэвы пачынаюць сок пускаць.

*Красавік*—першые краскі на полі.

*Май*—ад багіні Маі, каторую сьвяткавалі у першы дзень гэтаго месяца.

*Червень*—з'яўляюцца чэрві.

*Ліпень*—красуе ліпа.

*Жнівень*—усюды жніво.

*Верэсень*—красуе вeрэс.

*Кастрычнік*—ад кастры.

*Лістапад*—падае лісьце

*Сьнежень*—ад сьнегу.

# З нашаго жыцьця.

## Новагоднiе думкi

Вось і Новы Год ідзе. С чым спатыкаем мы яго, што прынясе ён нам з сабой?

Гэта думка падыймаецца ў галаве кожнаго чалавека. Гэтае пытаньне страшэнна важна і для нас, беларусоў, бо ж мы жывем найбольш надзеей на *будучыну*.

На вялікім абшары раскінулася наша бацькоўшчына. Мільёны мазалістых рук працуюць на роднай зямлі. Гляньце, як гэтые сермяжные палкі возьмуцца за свае аружжэ—сохі, плугі, бароны: тады с папароў і дзірваноў робяцца шэрые неаб'ятные прасторы, а праз колькі надзель морэ жывой зелені пакрые гэту як бы мёртвую шэрызну. І, бачучы гэта, ў сэрцы родзіцца вера-надзея, а з грудзей вырываецца моцны і сьмелы крык: „жыве Беларусь“!.

Жыве Беларусь, але хто жыве на ёй? Спытайся у людзей і напэўна пачуеш атказ: „тутэйшые“, „простые“... Народ забыўся, хто ён. Забыўся, але душа ў ім жывая, і гэтые мільёны беларусоў раней ці пазьней стануць тым, чым павінны быць: сьведомымі беларусамі-людзьмі, роўнапраўнымі грамадзянамі серод братніх народоў. Жыцьцё робіць сваю работу: мы ўжо пачалі будзіцца і, пазнаўшы вялікіе ідэалы, перэказаные нам сьветачамі чэлавечэства, мы пойдзем назначэнай імі дарогай да лепшай будучыны ўсіх народоў.

На гэтай дарозі мы спаткаем у кожным народзі таварышоў і ворагоў. С першымі с кожным крокам упярод будзем зблiжацца, будзем лепей разумець адны адных; з непрыяцелямі будзем усё болей раздзеляцца, і нашы дарогі разыйдуцца так, каб ніколі не сустрэціцца: мэты нашы розные. Наша дарога с тымі, што умеюць шанаваць кожын народ і не зачыняюць нам дзьвярэй к сьвету; мы разам з імі будзем дабівацца мейсца для кожнай націі ў вялікай людзкой грамадзе!

Праз кніжку, навуку, праз захаваньне свайго нацыональнаго я—сваей душы—ўвойдзем і мы, беларусы, да людзкой грамады. З гэтымі думкамі і ідэаламі пачынаем мы Новы Год, маючы веру і ахвоту да працы, апіраючыся на падмогу ўсяго народу, ў каторым нацыональная сьведомасць будзіцца с кожным днём болей.

Як змагаецца весна з зімой, так трэба і нам змагацца з доляй-нядоляй. Як зіма процi вясны не устаіць, як пад праменьнямі сонца

ажыўляецца зямля, скаваная ледзянымі путамі, так і ўвесь край наш і народ беларускі ажывіцца пры супольнай дружнай працы сьведомых беларусоў: бо душу нашу гартавалі сталецьця, бо мову нашу складалі пакаленьня, бо нас не адзін чэлавек, а дзесятак мільёноў!

Вера і надзея наша ў нас самых. Мы сваімі рукамі будзем каваць сабе новае жыцьцё і выкуем: іскра жыцьця не затухла ў народзе, і прыйдзе час, што яна разгарыцца яркім полымем.

Ніхай жэ гэты Новы Год набліжае нам ясьнейшую будучыну! Ніхай злучыць у адну сямью ўсіх беларусоў, каторых доля-мачыха дагэтуль сварыла між сабой і цкавала брата на брата! Да працы над гэтым мы клічэм усіх.

## Вёска і городъ.

Як урадлівая зямелька чэкае вясной пасеву зернят, каторые кідае па ральлі рука працоўнаго хлебароба, так з году ў год наша шэрая вёска с пачаткам цёплых дзён жджэ свайго пасеву — корму для душы і розуму, які нясе з гарадоў і с чужыны вучашчаяся моладзь. Кожын год у гэты час вертаюцца ў родную хату сотні маладых людзей, каторые пазнаюць сьвет навукі—часта за апошніе капейк гаротных бацькоў. Як-е-ж зерняты новаго знаньня, новых думак нясе гэта моладзь пад саламяные стрэхі?

Сумна і нудна робіцца на душы, калі прыгледзімося, якой становіцца наша вясковая моладзь, пабыўшы у горадзі. Зразу пападаючы між чужых, вясковы хлопец ці дзяўчына сперша чураюцца іх, але пазней, чуючы насьмешкі над роднай мовай і ўсім тым, што ў хаці бацькі вучылі любіць і шанаваць, памалу самі навучаюцца сьмеяцца і пагарджаць гэтым, саромяюцца матчынай гутаркі, пераймаюць чужую і разрываюць тую жывую звязь, якая злучае чэлавека з мейсцэм, дзе радзіўся, і з людзьмі, с каторымі праводзіў першые гады жыцьця. І гэтая звязь, раз разарваная, не аднаўляецца і ў далейшым жыцьці, калі чэлавек выйшоў „у людзі“: свая старонка робіцца бытцым чужой. Так вырастае як бы сьцена між вёскай і інтэлігентам, што выйшоў з народу: хто, радзіўшыся беларусам, перайшоў „у палякі“, ці стаў „расейцам“, той у вёсцы чужы. Ён, гэты гадунец, узгадаваны на крывавай працы мужыцкай, ад каторага вёска чэкае добраго пасеву, нічога ей не прыносіць: ён свае сілы аддае расейскаму, або польскаму народу.

Так вядзецца гадамі і дзесяткамі лет, а шэрая вёска жыве ў беднасьці і цемнаце, бо яе культурная страва—гэта той невялічкі запас ведамасьцей, думак, поглядоў, што асталіся ад дзядоў або прыпадкам са сьвету хто прынёс. Ня дзіва, што вёска заснула. Ніхто і не будзіў яе...

. . . А на кожнай скібе чорнай.
Жджэцца севу, жджэцца зёрнаў...

І цяпер—з новай вясной, вясной адраджэньня—падыймаецца ў галаве пытаньне: скуль жэ тых зёрнаў, тэй сяўбы чэкаць?

Як дагэтуль горад забіраў з вёскі найлепшые сілы, блізка нічога за гэта ей не даючы, так цяпер ад яго вёска павінна ждаць падмогі. І гэта падмога прыйдзе: трэба толькі, каб горад добра пазнаў вёску, каб зразумеў яе душу і ушанаваў яе ў маладых пакаленьнях, што ў горад за навукай бягуць. Калі горад ня будзе забіваць у душах гэтай моладзі таго, чым яна звязана з вёскай: любві да ўсяго роднаго,—тады і народные інтэлігенты поўнымі жменямі панясуць зерняты культуры ў вёску, а яны тамака паўсходзяць і узгадуюць тысячы карысных і сьведомых працаўнікоў па карысць нашаго нороду.

Дык ніхай па нашых гарадох збудзіцца ў сэрцах даўных эмігрантоў з села пачуцьце, што і яны—беларусы; ніхай яны парупяцца аб тое, каб вясковая моладзь ў іх знайшла праўдзівых братоў па мове і духу,—а тады будзе звернен стары і вялікі доўг горада вёсцы.

Г. В.

# Што рабіць?

Сотні гадоў узгадовываецца народ наш на чужым грунце, чэрпае ўсё знаньне с чужых культур. Володары народу сотні гадоў навязывалі яму чужыншчыну, хацелі перэрабіць яго на свой капыл. Дабіваліся гэтаго шырэньнем асьветы ці ў польскай ці ў расейскай мове—чужой для народу. Жадалі, каб ён з матчыным малаком выссал сьведомасьць належнасьці сваей да чужой нацiі. Ды ўсё без карысьці. Народ ня толькі не апалячыўся, або не абрусеў,—ён нават ані крыху не пасьвятлеў, не прыдбаў больш навукі для сябе, бо навуку гэтую падносілі яму ў чужой, мала зразумелай для яго мове. А не разумеючы гэтай чужой мовы, забіты беднасьцю і непамернай працай, ён усёж такі глыбока захаваў у сваіх брудных вёсках бацькоўскую мову, карыстаючыся ей для свайго хатняго ужытку.

Як навука ў чужой мове да беларуса дрэнна прыстае, то і ня можэ ён быць асьвечоны, бо другой, роднай навукі і ў вочы ня бачыць. Навучыцца, накрыклад, хлопец чытаць у школі (пэўне, што не па своему), прачытае колькі кніжок пасьля скончэньня навукі, а ам, глядзі, ўжо і чытаць кінуў! Праз колькі гадоў нават і саўсім граматы забывае, або помніць з яе толькі адно: нейкімі дзіўнымі літэрамі за паўгадзіны часу напісаць свае прозьвішчэ. Чаму гэта так бывае? можэ мы, беларусы, не здатны ні да якой навукі? Дык не-ж! Вялікая навука і нават у нашай роднай мові панавала калісь на Беларускай зямлі, а цяперашняя неахвота да кніжкі ідзе у нас ад таго, што кніжка чужая. Не разумеюць яе збольшкі, а калі хто і разумее, то не гаворыць яна да яго сэрца. Трэба, каб яна была пісана ў тэй мові, да каторай прывык чэлавек, каторая яму жывой здаецца, а ня мёртвай, як чужая.

Вось чаму, калі мы хочэм падняць наш народ с цемнаты няведаньня, мы павінны несьці яму яго рэдны сьвет навукі, не пры-

браны ў чужую, хоць часам і пекную, апратку. Трэба прывучаць яго, каб шанаваў свае роднае, бо толькі той можэ шанаваць чужое, хто сваё наперш шануе. Даючы яму нацыональную асьвету, трэба будзіць у ім жаданьне сьвету бо цёмны ешчэ ён, ня можэ сам знайсьці выхаду з свайго небарачаго жыцьця.

Трэба падыймаць культуру ў народзі і культуру сваю, беларускую; гэта і не так лёгка, як здаецца. Мала ешчэ кніжок у нас; выходзіць усяго адна газэта. Але мы павінны моцна трымацца за тое, што ўжо маем, шырыць слово беларускае, шырыць думкі беларускіе, каб пайшлі яны да курных хат селянскіх.

І дзеля гэтаго трэба працаваць над адраджэньнем і развіцьцем роднае мовы. Але ешчэ болей, канечне трэба, каб народ наш сам рабіў большую часьць работы дзеля збудаваньня вялікаго нацыональнаго гмаху. А для гэтаго ён павінен быць больш асьвечоным, умець хоць трохі разбірацца ў розных здарэньнях жыцьця, адным словам, зрабіцца больш культурным.

Што-ж можна зрабіць цяпер у нас, калі німа ні школ беларускіх, ні кніг паддастаткам, ні ўсяго таго, што патрэбна да навукі? Трэба выкарыстаць як можна лепш хаця тое, што ужо маемо — напрыклад, трэба, каб больш ішло ў вёску беларускіх кніжэк, беларускай газэты. Ніхай кожны наш чытацель, кожны шчыры прыяцель сваім родным і знаёмым расказывае аб ей, тлумачыць тую вялікую работу, якую можэ яна зрабіць. Чым шырэйшы круг чытацелёў, тым большую вагу мае кожнае нашэ слова, бо шмат людзей да яго прыслухіваецца, шмат людзей карыстае з невялікай пакуль што скарбніцы культуры.

Кожны беларус павінен шырыць друкаванае слова у роднай мове. Ніхай ён ведае, што і ягó праца не прападзе дарма, што і ён улажыў сваю цэгліну у вялізны будынак культуральнаго багацьця народу. Толькі тады, як мы ўсе дружна возьмемся за прасьвету ў народнай мові, калі мы дамо яму ўсе патрэбные да навукі рэчы ў яго мові, калі ў кожным глухім кутку будуць чытаць беларускую кнігу і газэту,—толькі тады мы зможэм чым колечы памагчы у змаганьні з беднасьцю і цемнатой народнай. Прыбліжаць сьвятлейшые дні для народу павінен кожны з нас. Німа пекнейшаго назначэньня, як набліжэньне праўды і сьвету.—Гэта сьвятая павіннасьць.

**С. Пэлуян.**

*Кіев.*

## Аб нашай мове

Праціўнікі адраджэньня культуры беларускай на ўселякіе спосабы стараюцца заглушыць ўсё разрастаючыйся рух да адраджэньня беларускаго народу. Каб рух гэты паганьбіць у вачах народу, пускаюць розные баламутні, розные непраўды. Кажуць, бытцым мовы беларускай саўсім німа, а ёсьць толькі *нейкая мешаніна слоў поль-*

скіх і расейкіх без ніякаго звязку. Але што-б ні казалі праціўнікі нашы, зацямніць праўду яны не здалеюць, бо праўда астанецца праўдай заўсёды, і мова беларуская горшай ад гэтаго не станецца, ані будзе менш дарагой нам, бо-ж кроўю дзядоў і прашчуроў цячэ яна ў нашых жылах і нам яна так сама дорага, як немцу немецкая, французу французская. А калі хто і мае яе за горшую, чым сваю мову, то-ж яго ніхто не прымушае гаварыць па нашаму, а калі мы самі між сабой гаворым у гэтай мове, то гэта-ж наша ўласная народная справа.

Праўда, што за апошніе 200—300 гадоў мова беларуская не развівалася, бо багацейшые станы—баяры і шляхта—пайшлі за чужой мовай, культурай і навукай, сваей атчураўшыся. Прыбярог яе ў жыцьці толькі гарапашнік мужык. У курнай хаці перэхаваў гэтае найбольшае нашэ народнае багацьце. Але ня толькі мужык перэхаваў беларускую мову, перэхавалі яе ешчэ і старые кнігі, каторые вялікай працай і коштам друкавалі нашы памяці годные продкі, прахавалі яе ешчэ нязлічэные дакумэнты, пісаные за каралёў літоўскіх і польскіх мовай нашай беларускай.

Аб нашым слаўным прошлым кажэ беларускі песьняр Васіль-Васілёк.

„Слаўна наша прошласьць! мову шанавалі,—
Не чуралась ёю Польшча і Літва,
У ёй правовалісь, кнігі ў ёй пісалі,
Быў час, не чуралась ёю і Москва".

Так, мова Беларуская рана развілася, — раней за польскую і расейскую. Расейцы і палякі вучыліся з нашай мовы, а ня мы з іхняй, а што нашу навуку і культуру заглушылі чужые, то так сама не віна нас, селянскаго стану, але віна станоў тых, каторые панавалі над намі і лёгка, як пасталы, перэменяць маглі сваю веру, народнасьць і мову на чужую.

Няпраўда, што бытцым у беларускай мові шмат польскіх слоў, бо раз наша навука старэйшая за польскую, то ня мы карысталі з польскай мовы, але палякі з беларускай. Бо беларускі перэклад біблії друкаваўся на 40 гадоў (1517 г.) раней, чым польскі, бо ў самым сэрцы Польшчы-Кракові ня польская друкарня была першай, але беларуская; бо статут (—законы для ўсей Літвы і Русі) укладаўся перш па беларуску, а посьле з беларускай мовы рабілі перэклад на польскую і разам с тым прыймалі беларускіе словы ў польскую мову цэліком; ўрэшці з беларускай мовы карысталі палякі нашаго краю, пішучы позвы судовые і розные акты і ізноў прысваівалі словы беларускіе. Так сама заходне-рускіе перэклады Біблії і псалтыроў ішлі ў Расею.

Няпраўда, бытцым беларуская мова нездатная і бедная, ў каторай няможна пісаць рэчэй мудрых. Няпраўду гэту збіваюць сотні кніжок старых, напісаных мовай беларускай лёгкай і пекнай, збіваюць мудрые уставы статута Літоўскаго і шмат др. рэчэй.

Мова наша—гэта скарб наш багаты і пекны, а дарагі і мілы нам затое, што ён наш родны. Гэта спадчына, каторая асталася ад

дзядоў і прашчуроў нашых, і мы яе павінны любіць і шанаваць, не зважаючы на зьвягу праціўнікоў нашых. Людзей цёмных або збаламучэных трэба старацца асьвечаць, шырачы паміж іх любоў да роднай зямлі, айчызны нашай, да мовы спрадвечнай нашай Беларускай.

**Вінцук Цітовіч.**

## Калі друкавалася першая беларуская Біблія?

Першай друкаванай кнігай была Біблія Гутэнбэрга; — гэтыж самы Гутэнбэрг першы і выдумаў друк, а да яго кнігі былі пісаные рукой. Выдрукаваў ён гэту першую кнігу ў 1455 г. у горадзі Нюрэнбэргу.

У беларускай мове пачалі друкавацца кнігі ўжо на 28 гаду пасьле Гутэнбэрговай Бібліі, сперша глаголіцай, а праз 10 гадоў і, славянскімі літэрамі (кірыліцай).

У Заходняй (Белай) Русі асьвета, як на тые часы, стаяла вельмі высока; патрэба друкаванаго слова была такая вялікая, што Заходня-Рускіе лепшые людзі, каб здаволіць духовые патрэбы свайго краю, залажылі друкарню. Першая Беларуская друкарня была заложэна ў Кракові. І ў 1483 гаду вышла з гэтай друкарні першая беларуская кніга „*Трыод цветная*“, а ў 1491 гаду друкавалася ў Кракові ўжо другая беларуская кніга „*Октоіх*“.

Першая Польская друкарня заложэна была такжэ у Кракові ў 1505 гаду, як бачым, праз 22 гады пасьле надрукаваньня першай беларускай кнігі.

З славянскіх народоў першые друкавалі Біблію Чэхі ў 1488 гаду; другая з чэрады Біблія Беларуская друкавалася ў 1517 гаду ў Празе; трэйцяя Краінская у 1555 г.; а чацьвёртая — польская Біблія друкавалася ў 1561 г. у Кракові; Літоўская Біблія друкавалася ў 1590 гаду у гор. Кенігсбэргу, Латышская—ў 1587 г. у Рызе.

Першая Беларуская Біблія перэтлумачэна была з лацінскай мовы на беларускую Францішкам Скарынай с Полоцка. Францішак Скарына маладым хлапцом прыбыў с Полацка ў Вільню, каб прыдбаць сабе навукі. Праз сваю здольнасьць звярнуў увагу людзей багатых, каторые і заапекаваліся ім; больш за ўсіх цікавіўся Скарынай Бургомістр (галава) Віленскі, Якуб Бабіч.

Калі Францішак Скарына скончыў навукі у Вільні, Бабіч сваім коштам паслаў яго вучыцца вышэйшых навук у Кракоўскую Акадэмію. У Кракові Скарына атрымаў ступень доктара мэдыцыны і штук пекных. Высокіе навукі Скарыны і абшырнае веданьне звярнулі увагу Беларускіх вяльмож, каторые шукалі тагды чэлавека, знаючаго вышэйшые навукі, каторы ўзяўсяб перэкласьці Біблію. Скарына згодзіўся на гэту вялікаю працу і праз колькі гадоў споўніў яе. Відаць, тагочасная Кракоўская беларуская друкар-

ня была за мала для друкаваньня Біблії, дзеля таго Скарына паехаў друкаваць яе ажно у Чэскую Прагу, гдзе і пачаў друк ў 1517 гаду, а працаваў там да 1520 г. Тым часам у Вільні стараньнем тагож Бабіча заложэна была вялікая друкарня. Тады Скарына вярнуўся ў Вільню і тут ужо дакончыў друк Біблії ў 1525 г.

Апроч Біблії Скарына выдаў колькі другіх ешчэ кніжок: „*Канонік*", „*Псалтыр*" і інш.

## Песьня і народ.

Якая птушка—такая і песьня, кажуць людзі. Гэтая разумная прыказка а птушчынай песьні мае ешчэ большая значэньне для песьні людзкой, бо песьня людзкая адбівае ў сабе душу чэлавека, яго боль і горэ, яго патрэбы, жаданьня і самае жыцьцё. Як па тва-ру пазнаюць чэлавека, так па песьні, асабліве народнай, пазнаецца цэлая нація, яе характэр і душа. Разам з гэтым песьня многа прынасіла і прыносіць карысьці для народу, яна бытцым зменшае людзкіе нешчасьця, пацешае ў нядолі, а калі трэба, дык і весяліць. Усім ведама, што песьня—гэта бытцым нейкая вялікая таёмная сіла—вельмі памагала будзіць народ, узахвочываць яго да працы, падымаць с цямноты, клікаць да сьвету—навукі, да абароны свайго краю, на добрые, важные справы. Дзеля таго у народоў с шырокай прасьветай песьня даўным-даўно заваевала сабе пачэснае мейсцо, яе справедліва шануюць, як вялікі ўсенародны скарб, бо яна для душы кожнага чэлавека—ці беднаго, ці багатаго, ўсё роўна—так патрэбна, як хлеб і вада для здароўя цела. І нам, беларусом, каб не замерці ў сваім духоўным развіцьці, каб вальнейшым часам павесяліцца, набраць сілы да новаго жыцьця і працы каля народных спраў,—трэба тую песьню і музыку, што зрадзілася на народнай ніве, паміж свайго народу, сколькі ёсьць сіл трымацца,—не забываць, а цэніць яе так, як вучаць і даюць нам прыклам усе разумные і практычные людзі.

...Песьні, знайце, Божы дар,
Шанаваць іх трэба.—

Так кажэ песьняр наш—Янук Купала.

...А без песень жэ народ
Што ён варт быць можэ?...

Ніхай жэ беларуская песьня, хоць не вясёлая, не залішне багатая і непрыглядная, але свая родная, ня гінець і не уціхае, а голасна і весела вырываецца з грудзей, расходзіцца па лесох, расплываецца па палёх і нівах і разганяе нуду ў мужычых чорных хатах; ніхай клічэ беларуса да працы, да навукі, да каханьня бліжняго, ніхай весяліць і пацешае яго набалеўшую душу і разам з гэтым расьце і крэпне на карысьць усяго народу...

А. Гр.

# Думкі селяніна-беларуса.

Я чытаў „Нашу Ніву“ чуць не с самога пачатку, і мне надта спадабалася, што яна будзіць ад цяжкаго сну нашых мужыкоў. Але вось аб чым хацелася бы мне крыху пагаманіць.

Скажыце вы мне, дзе нашы беларусы не бываюць!? Як ёсьць уся Расея, Польша, Каўказ, ды блізка ўсе пяць часьцей сьвету нашаму беларусу знаёмы; ён за апошніе гады разбадзяўся, ганяючыся за хлебам. Толькі гдзеб ён ні быў, як бы яму добра, ці кепска ні было, а ўсё с часам цягнецца у сваю бедную старонку. Прыбыўшы, разпраўляе—дзе бы ён ні быў, — што ўсё там лепей, як у нас: лепей зямлю пахаюць, лепей будуюцца, і сам ён быў на гэтай рабоці; а каб паказаць нам, дык нічога не пакажэ, толькі навучыць тамашніх песьняў нам непатрэбных, бо у нас сваіх ужо крышку, дзякаваць Богу, ёсьць.

Калі ён быў простым работнікам, ці хоць і майстрам, то ешчэ нашэ шчасьце: хоць з намі гаварыць не сароміцца; а калі ён занімаўся чыстай работай, напрыклад: быў кухаром, лякаём, або, Божэ барані, пісаў дзе,—дык тагды ўжо ў сьвітцы і блізка не падыходзь. А мужычкі — ведама, цёмны народ — з зайздрасьцю спагляцаюць і ціпком уздыхаюць... Бывае, што і грошы з Амэрыкі прывозяць, але чым яны памагаюць нашай старонцы? А вось што: у мястэчку, дзеля таго, што бяднейшым гною нехват, яны адзін перад адным так цэну набіваюць, што ня толькі прадаць тое дабро, што на ім вырасло, але і салому, то тагды хіба вернеш сваё. А на другі год, прачусьціўшы грошы—то бабам на хусткі, то на кумаўство (амэрыканцоў—пакуль маюць грошы—любяць прасіць за кумоў), а рэшта на дарогу: гайда ізноў ў Амэрыку. А жонка зноў чужымі рукамі пустошыць зямлю... Суседзі бедные, квапіўшыся на заработкі, худой кабылкай і дапатопнай снасьцю так сяк уздзяруць амэрыканскі шнур (як тут іх называюць), і выпалашчэ яго саўсім. Вось табе: купленны дарагі гной прапаў без карысьці... І сусед зарабіў толькі, каб з'ездзіць на кірмаш у Буду ці ў Крывічы.

А іншы хопіцца розумам, зямлі купіць на ўсе чыста грошы, ды ешчэ ў банк улезе. А прылады да гаспадаркі німа, скаціны німа; які ж з яго гаспадар? Тады мусіць у беднаго адбіваць заработкі: куды бедны едзе за восем злотых,—ён цягнецца за рубель.

Ну, але гэты хоць зямлю купіў,—і то добра! Ён ужо як-небудзь прагаруе, і надзея ёсьць, што хоць можэ дзеці як-небудзь выйдуць з бядноты. А надзея—ўсё нашэ жыцьцё.

А многа ёсьць такіх, што і з грашыма прыедуць і пражывуць іх без ніякай карысьці. Ні ў які абарот іх ня пусьцяць, а палажаць на почту, а потым патроху іх бяруць і бяруць на жыцьцё, а як ужо скончаць, тады бядуюць, што амэрыканскіе грошы ня спорны. Чаму тутэйшые грошы, дык, кажуць людзі, яны нейкіе трывалые? Кажуць людзі. А ня ведаюць таго, што грошы чы Амэрыканскіе,

чы Азіяцкіе—гатовые, дык лёгка і скорэнька пражываць; калі іх у які гандэль чы абарот не пусьціць,—не угледзіш, як яны згінуць...

Можэ хто, прачытаўшы маю гутарку, скажэ: а штож з імі рабіць тут, калі ў нас такая старана, што хоць ты як круці, а нічога з грашмі ня зробіш, апрача памаленьку пражываць; а пусьціць іх у ход—баязно, каб не пусьціць, як с пугі пастух камень!

І гэта крыху праўда. Калі займешся дробным інтэрэсам,—як напрыклад: збіваць з васьмі злотых цэны на рубель, а посьле раптам высока подскачыць, то ня дзіва, што можэ выйсьці, як с пугі... А мая рада вось якая: не лічы сябе асобным звяном калёсным, а будзь грамадзянінам, бо ўжо ёсьць і ў нас хоць мала, алеж усёткі ёсьць людзі, каторые ўжо зварухнуліся са сну; а прыказка кажэ: як стаець, дык і розуму дастаець.

Работы у нас з грашмі надта многа,—болей, як бяз грошы. Колькі інтэрэсоў ёсьць нашых у чужых руках, дык іх і за дзень не пералічыш. Але на ўсё гэта трэба грошы і навука. А у нас багатыр саўсім сына ня вучыць. На што яму? Калі будзе цесна тут, дык паедзе ў Амэрыку, бо у нас цяпер Амэрыка лічыцца самым крапчэйшым фундамэнтам. Толькі мне дурному здаецца, што гэты фундамэнт ня доўга будзе крэпкі. А каліж ужо каторы і вучыць сына, дык канешне, каб ён быў начальнікам якім; бо павэдлуг яго розуму, трэба толькі начальнікам быць разумнымі; а з народнаго вучылішча—вядома ж, якое так начальства!—Дык і зусім ня трэба.

Толькі вось добра, калі ў салдаты здадуць; а каб не ў салдаты, дык зусім ніхто-б не вучыў (бо ў нашай вёсцы, хто мае аднаго сына, дык ніколі і не успомніць пра вучылішчэ, бо яму будзе льгота). Ну добра, здалі ў салдаты! адслужыў службу, там і астаўся. Пабыў год, два, ці болей,—чуе бацька, што сын ужо ў начальнікі нейкіе папаў, ня гэткім як стражнік, ня гэткім як прыстаў, але нейкім там над усімі старшым... Сперша быў пры канях у палацы, а цяпер вунь куды папаў—у начальнікі!

Але якаяж з гэтаго карысьць бацьку? Такі сын—начальнік—сароміцца прыехаць у вёску праведаць бацьку; дый калі бацька да сына прыедзе, той яго ешчэ больш чураецца: ў кухню хіба толькі пусьціць. Вось, бацьку—як абухам па лбе. Едзе ён да дому і думае: досі гэтай навукі! меншых вучыць ня буду: карысьць адна, але хоць сароміцца ня будуць, што я іх бацька. А чаму гэтак робіцца, дык пра гэта можна і многа чаго напісаць, але гэта можэ другім разам: каротка сказаўшы, вось якая прычына: як мяне, напрыклад, самога учылі, дык у мяне такі быў дух, што каб нічога роднаго беларускаго не шанаваць...

**Мікалай Апошка.**

*Даугіноускай воласьці, вёскі Апошэк, Вілейск. пав. Віленск. губ.*

# З Роднай Нівы.

* * *

Край ты мой родны! Як выкляты
Богам —
Столькі ты зносіш нядолі.
Хмары, балоты... Над збожэм
убогім
Вецер гуляе на волі.

Поруч раскідалісь родные вёскі.
Жалем сціскаюцца грудзі! —
Бедные хаткі, таполі, бярозкі,
Усюды панурые людзі...

Шмат што зрабілі іх чорные рукі,
Вынясьлі моцные сьпіны;
Шмат іх прымусілі выцярпець
мукі
Пушчы, разлогі, нізіны.

Кінь толькі вокам да гэтаго люда--
Сціськнецца сэрцэ ад болю:
Столькі пабачыш ты гора усюды,
Столькі нуды без патолі.

Песьня пяе, як удовіна сына,
Янку, каханьне згубіло;
Там, дзе панура схілілась каліна,
Беднаго хлопца магіла.

Ў гутарках-казках аб шчасьці, аб
згодзе
Сэрцэ навін не пачуе.
Сціснуло горэ дыханьне ў на-
родзе,
Горэ усюды пануе.

Хваляй шырокай разлілось, як
морэ,
Родны наш край затапіло ..
Брацьця! Ці зможэм грамадзкае
горэ?!
Брацьця! Ці хваце нам сілы?!

Ярослауль.

Максім Богдановіч.

## ЖНІВО.

Насьпелая постаць шчасьлівых пасевоў
За вёскай, на сонным лясоў рубежы
Зсівелы ўжо колас схінула к мяжы
У сумным шэптаньні: „дзе, жнеі мае, вы?“

І жнеі зышліся.—На право, на-лево,
Кладучы ў снапы каласы-старажы,
Зашасталі глуха сярпы, як нажы,
Пад жніўные вечна-старые напевы.

Спагадная-нудная песьня плыве,
Губляючы ў пушчы свае пералівы,
У шэлестах белаго коласа нівы.

Плыве гэта песьня ка мне і заве,
І ў сэрцы звініць, як каса у траве:
„Ты так жэ, брат, сееш... а дзе тваё жніво?“

Пецербург, чэрвень 1910 г.

Янка Купала.

## НАД КАЛЫСКАЙ.

Над калыскай матка
Ночку каратае:
Хвораго сыночка
Цешыць, забаўляе.
На цьвячку павешэн
Начнічок убогі;
Сумна пазірае
Месячык двурогі;
Хараводы зорак
У гары мігаюць,
А ўнізу сьняжынкі
Срэбрам адліваюць.
Так спакойна ўсюды
І такая ціша!
Хворае дзіцятка
Неспакойна дышэ,
А пракляты кашэль
Не дае спакою:
—«Сьпі, маё дзіцятка!
Сьпі, маё любое!
Не пужайся, мілы,
Бог сьвяты с табою!!...
Вон пашоў ты с хаты,
Сівы дзед, с кульбою!
Вун, пайшоў дзед сівы,
Крывіцца і плачэ!
Уцякай адгэтуль,
Уцякай, бедачэ!
Ото—дурэнь сівы:
Думаў напалохаць!
Будзе-ж усю ночку
На марозе охаць.
А ня ходзь у хату,
А ня лезь сляпіцай!
Плач цяпер і мерзні
Ды ня будзь дурніцай.-
О! Пятрусь харошы!
Любяць ўсе Пятруся:
Любіць яго тата,
Любіць і матуся!
Купіць тата Петру
Боцікі на ножкі.
Пойдзе мой сыночэк
Праглядаць дарожкі.
Новую кашульку
Я табе пашыю,
Ў цёпленькай вадзіцы
Чысьценька абмыю,
Будзеш ты харошы!
Цётка не пазнае:
— «А чый гэта хлопчык?»
Дзядзька запытае.
Ўсе дзівіцца стануць
І хваліць Пятруся.
— «Гэта я!—ты скажэш:
«Я—сынок Габруся» —
. . . . . . . . . . . . .
Поўнач пракрычалі
Пеўні ў хату с схаты.
Ўсё курыць газніцы
Блеск падсьлепаваты.
Змучэна кабета
Мацерынскім горэм
І схілілась ціха
Над сыночкам хворым.
І калышэ сына,
Страхі адганяе,
А самой ей сэрцэ
Нешта ссе, сціскае.

Мінск.

Якуб Колас.

## С ЧУЖЫНЫ.

І душна, і цесна, і сэрцэ самлела
Мне тут на чужыне, здалёк ад сваіх...
Як птушка на скрыдлах ляцець бы хацела,
Як хваля па моры плыла бы да іх!

Знелася-б, здаецца, расінкай на хмары,
А хмары бы ветрам казала я гнаць
Далёка, далёка, гдзе сьняцца мне чары,
Гдзе боры густые над Нёмнам шумяць.

Гдзе пацеркай белай Вілья прабегае,
Гдзе Вільня між гораў гняздо сабе ўе,
Гдзе кожна дарога і крыж мяне знае,
Гдзе ўсё, усё чыста вярнуцца заве!

Там я нарадзілась і выросла ў волю,
Там першые словы вучылась казаць...
За тое сягоньня ляцела-б стрэлою
Там з імі, з усімі Год Новы спаткаць!

Ой, мілые, мілые, сьнегам пакрыты
Загоны, лясочкі, дарожкі мае!
Эх чк вы у сэрцы маім не забыты,
Як часта абраз ваш у думцы ўстае!

А вы, бледны твары, пануэны ў працы,
І ты, друг мой смутак з іх сьлёзных вачэй,
Прыміце сягоньня прывет мой гарачы,
Каб жыць нам было ў гэтым годзе лягчэй!...

Ц—тка.

Кракоў.

## ПЕСЬНЯ ДЗЕЎЧАЦІ.

Толькі што сціх дожджык, неба йшчэ хмурнее;
Многа за паўдня ўжо,—скора вечарэе.
Лёгка стала дыхаць, бытцым пасьля ванны,
Чутны у паветры водар ад дзеванны. —
Адмачыўшы добра ссохлую зямліцу,
Абрасіўшы збожа, варыва, мятліцу,
І само паветрэ значна пасьвяжэла,
Аж людзям на сэрцы неяк звесялела.
Вось, пасе кароўку дзеўка маладая
І ад горкай долі ціханька гадае.

Як згадала, хутка думка спанавала,
Да таго й зязюля ў грунь закукавала...
Цяжэнька прыйшлося ў гэта ей прадвесьня!
Вось і палілася, панеслася песьня:
„Ой, ляцелі гусі, ды с пад Белай Русі..
„Цяжка было жыці бедненькай Карусі,
„Цяжка будзе жыць ей, пакуль не сканае,
„Замуцілі гусі ваду на Дунаі“...
І сьпевае дзеўка песьню сваю далей
Аж нясецца голас з ветраною хвалей.
І панёсся, рэхам у ляску аддаўся
І на векі знік там і не вярачаўся.
Дасьпевала дзеўка слоўца „разсталіся“,
І на твар дзявочы сьлёзы паліліся.
Сонейка схавала ў лесе ясны вочы,
Рэха-ж ўсё сьпевала горкі лёс дзявочы.

Гольшаны.

Андрэй Зязюля.

## КОБЗАР.

Ой, вецер шуміць, ой, вецер гудзе,
А цераз поле чэлавек ідзе.
Ой, полем ідзе
І штось ён нясе,
І хлопец яго за руку вядзе.

Ой, праз поле хлопец старца вядзе.
Які гэта старэц с хлопцам ідзе?
То кобзар ідзе
І кобзу нясе,
А хлопец за руку к вёсцы вядзе.

У вёску прыйшоў, на прызьбі ён сеў
І ціха людзям сьпеванку запеў:
Ў круг людзі стаяць,
На старца гледзяць,
Бо да душы бедным людзям запеў.

Галавою добрым людзям кіўне,
Грудку старую шырока надзьме,
Ў струны утне,
Слова дабярэ
І песьню старую сьвету пяе.

Мінск.

Ќ. Ќаганец.

## ВЕЦЕР.

Вее вецер вольны,
Хмары шыбка гоніць;
З вадой, зямлёй, лесам
Зюкае—гамоніць!

Прыляцеў да рэчкі,
Прылёг, прытуліўся, —
Крышачку па яснай
Вірам закруціўся;

Сказаў слаўцо ласкі,
Сьвіснуў і падняўся
І за хмаркай лёгкай
Пырхнуў і пагнаўся.

Зноў прымчаў да лесу:
„О, здароў, мой браце!"
І пайшоў між хвоек
Ён дурэнь—гуляці:

Адну пацалуе,
З другой пасьмяецца,
Кіне слово—пару,
Да трэцьцяй бярэцца...

Годзе ўжо у лесе! —
Зноў у выш падняўся,
Пакруціўся крыху,
Дый у даль падаўся.

Задаў гону пылу
І у ніз ён рынуў,
Прыпаў да зямліцы —
Бытцым дзесь загінуў.—

„Ах, мая матуля,
„Як я нагуляўся!
„Бачыў сонцэ, месяц,
„Ў рэчэццы купаўся.

„Хораша на сьвеце!
„Колькі там прастору:
„Шыбанеш па рэчцы,
„Прыпадзеш да бору!...

„Я хацеў бы болей
„Ў сьвеці пагуляці, —
„Атпусьці-ж, матуля,
„Ешчэ палетаці!"

Пэўне, што пусьціла
Вецер маць гуляці,
Бо падняўся ў неба
І пачаў сьпеваці...

Вось—ненацкам скончыў
Сьпеваці гуляка,
Гікнуў і панёсся
Ў даль хутчэй за птака...

Алесь Гарун.

## САСОНКА.

За вёскай на полі ўзрастае сасонка,
Стаіць сіратою адна;
Ад ветру шуміць і гудзіць яна звонка,
І шышкі губляе яна.

І сьніцца ей, беднай, што вецер знямее,
Настане цяпло і спакой;
Як кветка, распусьціцца вольна, з надзеяй
Над чорнай, заснуўшай зямлёй.

І птушчына песьняй на гібкай галіне
Зальецца вясёлым званком;
Бедак спрацаваны яе не абміне,
Спачне пад зялёным цяньком...

Так хвойцэ ўсё сьніцца сьвятлейшая доля,
Спакойные, шчасные дні,
Хоць вецер і сьвішчэ, і гне што раз болей
Сіротку-сасонку к зямлі.

Радашковічы.

Юзя Шчупак.

# ДЗЯУЧЫНА.

Ўжо сьвечка пагасла, ўжо ноч за вакном...
Ў пасьцелі мне душна, ня сьпіцца.
О, сон! Ты самкні мае вочы скарэй,
Мо́ мілы сягоньня прысьніцца!
Гадзіны ідуць, я ў пасьцелі ляжу,
І сон не змыкае мне вочы,
А месяц праз вокны лье сьвет залаты,
Малюнкамі сьцены залоце...
Устану с пасьцелі, вакно адчыню,—
Мо́ вецер, што ў полі гуляе,
Мне скажэ, што робіць мой мілы цяпер,
Мяне як даўней ці кахае?...
У небе спакойна так зоркі дрыжаць,
А ветрык лісточкам шапочэ;
Запеў салавей звонкай трэльлю сваей,
Заплачэ, то зноў зарагочэ..
І ветрык, і зоркі, і месяца сьвет,
І звонкая трэль салаўіна,
Здаецца, што гукае гэта ўсё мне:
«Цябе ён кахае, дзяўчына...»
А ночка халодна, ўжо чую, як мне
Дрыжаньне пабегло па целі;
Іду ўжо, лажуся у цёплай маей
І мягкай і белай пасьцелі...
. . . . . . . . . . . . . . . .
Заснула дзяўчына, а месяца сьвет
На вочы і вусны лажыцца.
Праз сон штось сьмяецца дзяўчынка мая,
Відаць, што ўжо мілы ей сьніцца.

Вішнево.

К. Буйло.

# ЗАГУДЗІ ТЫ, ВЕЦЕР.

Загудзі ты, вецер,
Скалыхні вярбіну;
Засьпевай ты песьню,
Мілая дзяўчына!

Засьпевай, як птушка
Летняю парою,
Каб было мне шчасна
Пасядзець с табою;

Каб сагнала песьня
Ўсю нуду ліхую
І ўвабрала душу
Ў вопратку сьвятую

Радасьці, вясельля,
Шчасьця і любові...
Каб нуды сарвала
Моцные аковы...

Засьпевай, галубка,
Засьпевай, дзяўчына!...
Скалыхні ты, вецер,
Скалыхні вярбіну.

Вількамір 1910 г.

Цішка Гартны.

## ПЕСЬНЯ КАВАЛЯ.

Мой горан пылае,
І іскры ляцяць;
Я мех уздуваю
І буду каваць...
Працую, гарую,
Як моцы стае;
Гартую, муштрую
Жалеза мае...
У кўзьні ад раньня да ночы стаю
І молатам лепшую долю кую!...
І гнецца парою
Жалеза і сталь,
Як возьме рукою
Здаровай каваль...
Скую, вось, касу я,
Загну, закручу
І выйду у ночы —
Нядолю скашу!...
У кузьні ад раньня да ночы стаю
І молатам лепшую долю кую!...
І холад і голад
У хатцы вітае,
А праца і молат
Мне моц адбірае!...
Гэй, ўдару-ж я, ўдару!
Гарно раздзьмухну,
Сагну, загартую
Я сэрцэ—касу!
Я праўду і волю кахаю—люблю
І молатам лепшую долю кую!

Капыль. Ф. Чэрнышэвіч.

## МАЛЫМ ДЗЕТКАМ.

Рвіце, дзеткі,
Сабе кветкі,
Вянкі війце,
Мядок пійце!...

Пройдзе першае маленство,
Прыйдуць сталые гады —
Пройдзе воля, пройдзе шчасьце,
Прыйдуць клопаты тады...

Рвіце, дзеткі,
Сабе кветкі,
Вянкі війце,
Мядок пійце!...

Алена.

## ПЕСЬНЯ.

Жоўтые лісточкі
Ляцяць чэрадою,
І ні дня, ні ночкі
Німа ім спакою.

Вецер бье галінкі,
Сушаць іх марозы, —
І блішчаць сьняжынкі,
Як скрэплые сьлёзы.

Вецер пераменна
Гоніць іх па гаю;
Як ім бедным дрэнна,
Я найлепей знаю!!!

К. Бор—іч.

## ДРУЖНА, БРАЦЬЦЯ!...

Дружна, брацьця, будзьма ў згодзі
Ці ў нядолі, ці ў прыгодзі
І злучэмся ў шнур, як гусі,
На дабро ўсей Беларусі!

Бо ці хто калі патрапіць
Венік паламаць адразу? —
Не здалее,—толькі страціць
Многа поту, сіл і часу!

А, калі яго развяжэ,
Кожну ён тацы галінку,
Як вазьмецца, як наляжэ,
Пераломіць, як былінку!

Дык і мы, калі ў грамадзі
Разам станем, як сьцяною,
Дружна будзем жыць і радзіць,—
Не настрашаць нас бядою!!!

Гальяш Леучык.

## НОЧ.

Толькі спусьціцца ноч,
Ўсходзіць месяц сярпом,
Па палёх, на лесох
Усё сьпіць ціхім сном.
Буры змоўкнуць, і ціш
У таёмнай нудзе,
Памахнуўшы крылом,
Занікае ў вадзе.
І вада бытцым сьпіць,
А у люстры яе
Як-бы ўсё замерло
Ў зачарованым сьне.
А як певень крылом
А паўночы ўзмахне,
Шум і плёскат тады
Усю ціш скалыхне,
Ўсе русалкі бягуць
І ні знама аткуль,
Панырнуць у вадзе.
І сціхае іх шум...

Парэччэ, Гродз. г. Пілілоу.

## ПЕСЬНЯ.

Сядзіць голуб на бярозі,
Галубка на вішні:
—„Скажы, скажы маё сэрцэ,
—„Што маеш на мысьлі?

„Як ня хочэш, маё сэрцэ
„Дружынаю быці,
„То дай жэ мне таго зельля,
„Каб цябе забыці!“ —

—„Расьце тое ў мяне зельле
„Блізка перэлазу;
„Як дам табе напіціся,—
„Забудзеш адразу!“

—„Ой, піць буду, хоць праз сілу,
„І дзянькі, і ночы!
„Толькі-ж цябе я забуду,
„Як загаснуць вочы“...

М. Арол.

М. Гарадок, Гродз. губ.

## КАМУ ШТО.

Гультай спаткаўся с працавітым
І, як вядзецца, у дваіх
Стаялі, доўга гаварылі
Аб справах хатніх і чужых.

Во, працавіты (косьць ды скура)
Пачаў хваліцца, што нажыў
Сабе і хатку і зямельку
І грошы шмат ужо зложыў.

„Хаця здароўе і ня шанціць, —
„Хварэю часта—абы што,
„Але сяк гэта перацерпіш,
„Пераківаеш і нішто!

„Як ты?“—„А я (гультай бярэцца
Яму атказ якісь казаць,
Мык, мык, замяўся, счырванеўся
І сам ня знае, што пачаць)

„Вось,—кажэ, я (а сам як бык той)
„Здароўем крэпка падупаў:
„Здаецца-б толькі піў і еў-бы,
„Бяз конца спаўбы ды гуляў!“...

г. Мінск.

Альбэрт Паўловіч.

# С КУТКА ПРАУДЫ.

На сьвеце многа нарэканьня
Ды многа сьлёз і многа бед,
Але, як кажэ нам пазнаньне,
Вядзецца гэта з даўных лет.

На маладых старые ўзсеўшы
Ды вельмі брыдка ганюць іх;
Але, так з боку паглядзеўшы,
Німа за што хваліць саміх.

Не адзін бацька нарэкае,
Што п'яніца яго сынок, —
Але віхай прыпамінае,
Як сам у водцы мокне, мок.

Другая маці зноў бядуе,
Кляне і плачэ на свой лёс:
Яе дачушка не шануе
І часта хвігі суне ў нос.

Сягоньня гэта ёй ня міла,
Увагі к старасьці німа!
А тое бедная забыла,
Што так рабіла і сама..

І часта галавы марочым,
Хоць тут атказ, здаецца прост,
Што праўды толькі мы ня хочэм
Казаць ніколі на свой хвост.

Валожын. Стары Улас.

# Лебедзінная песьня.

Хмарнае асенняе небо плакало ільдзістымі сьлезамі, калі Грыгора Лежню выпраўлялі с хаты ў сьвет далёкі, ў маскалі. Вецер гудзеў у голых галінах крывой бярозкі, што, пахінуўшыся, стаяла каля варот. Гаманілі суседзі. Ешчэ раз на парозе матка абняла яго і зрасіла сьветлые, як лён, валасы сваймі сьлезамі; ешчэ раз Грыгор, стануўшы на калені, пацалаваў родную зямельку і, выціраючы рукавом белай сьвіткі сьлёзы, выйшоў на ганак.

— „Прашчайце, суседзі! прашчай, мацi!"—прагаварыў ён здушэным голасам, трымаючы ў руках шапку.

Каля варот, у куточку, як калінка, стаяла Ганулягя. Прыйшла папрашчацца з Грыгорам, а сьлёзы так і коцяцца з блакітных вочэк. Грыгор падыйшоў да яе і, ўзяўшы ў абоймы, крэпка пацалаваў у самые вусны.

— „Прашчай, Гануля, чэкай мяне!..."

— „Вертайся сынок, не забудзь нас у чужой староньцы!" — прычытывала праз сьлёзы старая мацi.

Сеў на сані. Сані лёгка памкнуліся гасьцінцам у старану цёмнаго бору. Матка з Гануляй доўга стаялі на дарозе і глядзелі ў сьвет за санямі; абедзьве птушкай гатовы былі ляцець за ім, абедзьвых адно горэ лучыло...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Грыгора паслалі адбываць службу у Піцер. Сперша цяжка яму было там. Сэрцэ рвалося дамоў, да сваіх, але павіннасьць трымала. І-ткі памаленьку прывык. Найгорш то з мовай бывало: не патрапіў гаварыць па іхняму сперша, дык сьмеяліся. Але наламаўся. Муштры скора паняў, артыкулы стрэльбай лепш за ўсіх выкідываў. А калі, бывала, пачнуць песьні салдацкіе пеяць, то ніхто так звычна, так ёмка, ад душы ўсей не пеяў, як Грыгор наш. На другі год нашыўкі далі яму і другіх муштры вучыць загадалі. Бывала, як прыгоняць навабранцоў,—паміж імі бывалі і Грыгоравы землякі,—дык ніхто не умеў так дакучаць їм за іх простую гаворку, як Грыгор.

Шэсьць гадоў служыў. З новым жыцьцём звыкся. А за гэты час дома мацi памерла, брат ажаніўся, толькі Гануля ўсё ешчэ ждала яго. Але не паехаў Грыгор дамоў: у Піцеры дворнікам служыць астаўся.

Вясёлы горад Піцер той! Народу процьма, дзівоў уселякіх ліку німа! Служба не цяжкая,—сыт заўсёды, адзет заўсёды, жыцьцё дый толькі! Двадцаць гадоў служыў Грыгор дворнікам у Піцеры, двадцаць гадоў раніцай і ў вечэр падметаў адну і тую-ж вуліцу, па адных і тых самых лесьвіцах насіў дровы, ў аднэй і тэй самай брамі вартаваў начамі. Каля паноў уселякіх ходзячы, ешчэ больш полеру набраўся Грыгор.

А раз, як с таго самаго села, што і Грыгор быў, прыехала адна дзяўчына да паноў на службу, то Грыгор розные кепствы падпускаў на яе гутарку і, хоць любіў з ёй гукаць аб сваей старане, але шчыра сароміўся гутарыць з ёй пры людзях.

У тэй кватэры, гдзе служыла Грыгорава землячка, жылі адны вельмі багатые паны. Кватэру займалі вялікую—6 вокан з надворку і 6 вокан на вуліцу выходзіло; ўвесь другі этаж займалі. А вуліца была шырокая, людная; вечэрам каляскі і карэты рэкой проста цякуць, а сярэдзінай у зад і у перад шые трамвай электрычны,—як жук вялікі выгледае здалёку,—народ выходзіць і ўходзіць; а электрычные ліхтарні, як месяцы ў поўні, ўсю гэту рэку людзкую заліваюць малочным сьветлом. Любіў Грыгор гэту вуліцу, любіў увіхацца на ёй паміж карэт і калясак, падметаючы вечэрам, калі найбольшы быў на ёй рух.

Пад васну раз дзень быў пагодны, на дварэ стаяла адліга, і народу гэткім днём бывае больш, як заўсёды, на вуліцы. Грыгор выйшоў падметаць. На душы яму было нейк радасна, лёгка.

Вокны на другім этажы былі насьцеж разчынены, ў сярэдзіне гарэло сьветло, і адтуль данасіўся голас іскрыпкі. Гэта здзівіло Грыгора: там раней ніхто не іграў на іскрыпцы. Граньне плыло з вокан нейкае жаласьлівае, знаёмае,—нейдзе чутае... Пачаў услухівацца. Скрыпка бытцым гаварыла нешта, нечым жалілася...—«Так зусім іграў Пранук—даўно, там—на вёсцы»,—успомніў Грыгор... А ў іскрыпчьную жальбу уплетаўся нечый звонкі галасок. Вясёлы, звонкі галасок гэты знаў Грыгор: гэта пеяла паненка. Толькі цяпер яна пяе нешта іншае, не такое, як заўсёды,—слоў яе за грукатам конскіх капытоў і званкоў трамвайных ня мог дачуць Грыгор. Апёршыся левай рукой на мятлу, а ў правай трымаючы бляшаны коўш, Грыгор услухаўся ў песьню, каторая дзіўна казытала яго сэрцэ. Але вось раздаўся нечый зычны мужскі голас, а разам з іскрыпчынай жальбой паплыла поўная задумы, добра знаная, але чужая гэтай вуліцы песьня:

...Ой, пайду я лугам, лугам,
гдзе мой мілы гарэ плугам!

Ясна, ёмка прылі словы з адчыненаго вакна. У Грыгора як бы гром ударыў. Гдзе ён чуў гэту песьню? Гдзе?... Прыпамінаў сабе. Сэрцэ моцна ударыло у грудзях. А песьня далей плыла:

...І наеўся і напіўся,
Сеў на плуг, ды засмуціўся;
Сеў на плуг, ды засмуціўся!

Аддалася рэхам закацістая апошняя зваротка.

...«Гэта-ж маці пеяла песьню гэту!»—успомніў Грыгор.

Так, гэта маці пеяла, шэптало нешта, і думкі панясьлі яго ў родную вёску. У вачах памутнела, адступіліся думы нейдзе ў даль... І здалося яму, што гэта стаіць ён не серод вуліцы, але серод поля, а кругом шуміць жыта насьпелымі каласамі. Маці ідзе

мяжой, а ён побач. У маткі на левым плячы перакінучы серп, а правай рукой вядзе за руку яго...

Каляскі каціліся шпарка—адна за аднэй, і гразь вылетала с пад гумілястыковых колаў; але Грыгор ня бачыў гэтаго: яму здавалося, што гэта буйная раса асыпаецца на твар, што гэта не трамвай звоніць, а начлежнікі с песьнямі гасьцінцам едуць і пяюць. Іскрыпка плакала, ліўся зычны мужскі голас, і шмат іншых галасоў ўторыло яму.—«Гэта за гаем дажынкі»,—думаў Грыгор. І калыхалася перад ім вуліца нівай насьпелай. . Разам абарвалася песьня, а другі голас пачаў:

.. А гдзе тая крынічэнька,
Голуб гдзе купаўся?
А гдзе тая дзяўчыненька,
С каторай кахаўся?

Цяпер здалося Грыгору, што гэта не на полі стаіць ён, а на парозе хаты сваей, і маці не пяе, а плачэ, убіваючыся па ім; а з хмарнаго неба падаюць ільдзістые каплі на твар яму і Ганулі, што, як тая калінка, стаіць пад варотамі і плачэ. Маці на парозе крычыць нема: «Вярніся, вярніся!» А яму сьлёзы здушылі горла, і ня можэ атказаць ей..

Гэта крычаў хвурман карэтны: «Эй, сьцеражыся, сьцеражыся!..»

Грыгор неўсьцярогся. Прабегла праз яго парка каней, перəехала карэта. А яму здавалося, што ён падае на зямлю, каб ешчэ раз пацалаваць яе...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

І ў бальніцы не прыйшоў Грыгор у сябе. Дахтары сшывалі паламаные косьці і звязывалі пабітую галаву, а ён маячыў роднай вёскай сваей; прашчаўся з ёй, з маткай, з Гануляй, цалаваў зямлю... Муштры вучыў салдатоў. То ізноў зрываўся, каб услухацца ў песьню, што плыла з вокан другога этажа... Сестра міласердзя клала руку на яго і успакаівала, а яму здавалося, што гэта матка гладзіць яго, то ізноў пяе сваю ўпадабаную песьню, а ён ўтурыць ёй голасна, голасна...

...І наеўся і напіўся. .

Пеяў. Было яму лёгка, добра... Захваціў поўные грудзі паветра, каб ешчэ галасьней крыкнуць за маткай; радасьць разлілася па твару... пацягнуўся і змоўк.

Сестра міласердзя сплюснула яму вочы і, нацягнуўшы белую пасьцілку, закрыла твар, шэпчучы «вечны спакой яму».

**Власт.**

# Вясельле.

Давялося удаве каршунісе (мужа нідаўна Паўлюк забіў сукам на сьметніку: надта ўжо с курыцай завёўся!) дачку замуж аддаваць. А паміж каршуноў гэтак ужо вядзецца, каб гонару сямьі свaeй не зневажыць, толькі паміж сабой і бяруцца. Вось і каршуніха, як прыстало на ганорную матку, нагледзіўшы лоўкаго, маладога каршунка, стала рыхтавацца да вясельля.

Дачка і кажэ: «замуж, мамка, пайду, — спірацца німа чаго; такая ўжо доля наша дзявочая; але вясельле спраў, як мае быць“.

Добра: вясельле—дык вясельле. Хай пацешыцца дачушка паміж сваіх елак! Дый сама каршуніха не ад таго: дарма, што мужавы костачкі ешчэ не пагнілі.

Каго-ж прасіць на вясельле? Старая каршуніха і стала вылічаць:

— „Перш-на-перш,—кажэ яна,—салавейку: ён калі завядзе, ажно за сэрцэ хапае,—так яно і трэба на вясельлі! Пару галубкоў: для прыкладу, як маюць жыць маладые. Сароку—канешне трэба: на ўсю ваколіцу разнясе, якое важнае было вясельле. Удота“!..

— „Мамка,—перапыніла маладая,—я памятаю, як ешчэ малую мяне накарміла раз удотамі,—надта сьмярдзючые яны»...

— «Маўчы, дурная!—крыкнула на дачку каршуніха: маладая ты—ня ведаеш ешчэ, як на сьвецi жыць! Сьмярдзючы удот, — то праўда; але, калі прыбярэцца, дый нашупурыцца, дык іншаму здаецца, што і трэба яму сьмярдзець: ад важнасьці, значыцца. Прасіць і цецярука: у яго такая гутарка, што ніхто яе не разбярэ, вось, і будуць думаць, што надта нешта разумнае! У музыкі клікнем дзятла з жаўной: хай у барабаны таўкуць. Дразда: падсьвістываць, бач, майстэр. Бухайлу: хоць аддае балотам, але да дуды складзен. На цымбалах добра рэжэ бусел, але з ім нам не варта займацца: праз лад ужо насаты. У нас і так будзе; хай малады с сваей стараны прымчыць“.

Слухаючы гэтых праектаў, маладая з радасьці ажно з сука на сук стала скакаць.

Толькі, як прыйшлося выбраць пасланца па госьці, аніяк не маглі прыдумаць, каго-б тут назначыць? Урэшці згодзіліся на сініцу: надта ўжо дасужая—ці трэба, ці ня трэба, ўсюды дападзе, ўсюды загляне, дый набрэхаць хоць што можэ!

І праўда: зраньня наказалі, ды йшчэ поўдня не мінуло, а яна ўжо назад з дакладам прыпёрла:

— „Так і так,—кажэ,—ўсюды была, ўсіх абляцела, з усімі гаварыла, ўсе іх гутаркі падслухала, ўсе іх думкі выведала. Надта ўжо усьцешылася і шлюць падзяку за так вялікі гонар і неспадзеваную ласку вашай міласьці, толькі баяцца»...

— „Чаго?—насупіўшыся, пытае каршуніха.—Казала ім, як я табе прыказывала?“

— „А якжэ, казала, ваша міласьць,—усё казала! —для пакоры падняўшы хвост у верх, атказывае сініца. —Казала, што ваша міласьць і ўсе вашай міласьці сваякі з вялікай сваей ласкі да вас, дробезі, ў дзень вясельля панадзяюць мягкіе рукавіцы на свае капцюры, дык, калі і выйдзе якая звадка (ведама, на вясельлі), ніякай крыўды быць ня можэ. Але, ведама, дурные! Чаго яны ня выдумаюць?! Хочуць“...

— „Чаго хочуць?“ перапыніла каршуніха

— „І казаць не адважуся“.. ізноў падняўшы хвосьцік, атказывае сініца.

— „Ну!“—налегала старая.

— „Хочуць, каб ваша міласьць і ўсе, каторые будуць на вясельлі, з роду вашай міласьці на той час п надзевалі мяшэчкі на свае шаноўные глюгі, ды і то баяцца“...

— „І так баяцца? Якая ж ешчэ трасца ім патрэбна?“—злосна спытала каршуніха.

— „Я-ж і кажу: дурные! хоць на ўселякіе шэльмоўствы, нябось, розуму хватае. Кожны з іх не такі, то сякі, а ткі мае на свaей душы грашок. Я вашай міласьці ўсю праўду выкажу. Вось, хоць бы цецярук?. Ці ж гэта выпадае на ўвесь бор—гэткі то бор гэтак балабаніць?? Ведама: бор--борам, каго толькі там не бывае, а ён балабане, балабане, дый ешчэ падшыкне!—Або сарока? вядомая брахуха! Брэшэ, абы брэхаць, а іншаму можэ здавацца і вунь што... Салавейка, дрозд нават панавучывалі ся такіе рэчы сьвістаць, што не асьмелюся і сказаць вашай міласьці.. Дый усе яны бабры-дабры, а хоць пражпарты і маюць, усё-ж такі баяцца, што як з дому скрануцца, пакуль дападуць пад апеку вашай міласьці, каб часам у дарозі“...

— „Годзе!—крыкнула каршуніха. Можэш атпраўляцца“.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

А ткі каршуніха справіла вясельле сваей дачцэ, як мае быць! І ці дасьцё веры: былі там цецярук, дрозд і ўсе другіе, толькі не ў гасьцях, а... на скавародзе!

**Ядвігін Ш.**

# Гадунец.

Каля крыжовых дарог пад узгоркам разрасліся кусьцікі: падяловец, сухадрэўка і лаза. Кусьцікі *былі дробные. Гулялі ветры* лютые і абрывалі лісточкі з іх; пралеталі навальніцы страшэнные і крышылі галінкі іх; каціліся паводкі глыбокіе і падмывалі *карэнчыкі ім. Дрэнна, зусім дрэнна стала кусьцікам...*

Вось, у цёмные ночкі сталі шэптацца паміж сабой кусьцікі, каб як долю сваю паправіць. Раіліся, раіліся і ўрэшце прыдумалі *узгадаваць паміж сябе такое велізарнае дрэво, каторае бы* густымі

лістамі сваімі ад ліхіх ветроў закрывало іх, вялікімі галінамі сваімі ад страшэнных навальніц сьцерагло, таўстымі карэнямі сваімі ад глыбокіх паводак бараніло.

Траплялося не раз—памяталі кусьцікі, як паміж іх залеталі зерняты з вялікіх дрэў, але яны увагі на іх не звярталі: паляжыць гэткае насеньне, паваляецца, і то вецер далей яго гоніць, то яно засохне і згіне. Але цяпер—пасьля нарады—на першае зерне, якое да іх трапіло, сыпнулі кусьцікі сваімі лісточкамі і іголачкамі і, гэтак прыкрыўшы, сталі шанаваць і сьцерагчы яго. С пястуна на другі год—на вясну—паказаўся расток, і пагнало яго ў гару. Цешыліся кусьцікі і, каб даць выгоду свайму гадунцу, не жалеючы, падсыпалі і падсыпалі яму то лісточкаў сваіх, то іголачэк

Шмат год прайшло с таго часу, але ўсё ж такі прыждалі кусьцікі, калі іх гадунец—дрэво разраслося на здзіў высокае, на здзіў шырокае на здзіў густое. Надзея кусьцікоў, што вось-вось цяпер настане для іх новае, спакойнае, лепшае жыцьцё, цешыла іх бязмерна.

І праўда. Таўстое карэньня, вялікіе галіны, густые лісты баранілі іх ад ворагоў: паводак, навальніц, ветраў,—але гадунец гэты закрыў ім і... сонцэ. І—пагінулі кусьцікі!

**Ядвігін Ш.**

# Ласун.

Ліха надало ўкаціцца неякай паганай хваробе ў вёску Ценькаграйку. Што яна туды ўкацілася, гэта-б ешчэ не беда,—на тое яна і Ценькаграйка; але найгорш тое, што быў ад начальства наказ у воласьць, каб хвэльчэр і старшына зараз жэ ехалі туды зрабіць дазнаньне.

Мароз трэшчаў, хоць лысых лічы; зоркі зіхацелі і міргалі, быццым паджартовывалі і з старшыны, і с хвэльчэра. Але і хвэльчэр ня дурэнь: і ён надумаў зажартаваць і з мароза і с хворых і, глыбока запхнуўшы ў сядзэньне бутэльку крэпкай гарэлкі, прыняў на свайго каня старшыню,—і пакацілі. Едуць пяць, едуць дзесяць вёрст,—пачаў да хвэльчэрскай скуры мароз цабірацца; едуць каля карчмы, ён і просіць старшыню:

— Братэнька, папільнуй, калі ласка, коніка, а я ўскочу да Янкеля пагрэцца.

— Добра,—кажэ старшыня, мацней наваліўшыся на тое мейсцэ, дзе падгледзіў хвэльчэраву бутэльку.

Хвэльчэр патупаў, патупаў каля санак, але, баючыся здрадзіцца, папёр да Янкеля. Старшыня тымчасам, запусьціўшы рукі ў сядзэньне, выцягнуў бутэльку, атпечатаў і, мляскаючы языком ды аблізываючыся, ўсю высмактаў па троху і давай пхаць бутэльку на старое мейсцэ. Тымчасам і хвэльчэр, перэкуліўшы колькі чарак

у Янкеля, выйшоў як раз у той час, калі старшыня хаваў бутэльку: спанатрыў, але, зубы сціснуўшы, замоўк.

Селі. Едуць вярсту, другую. Хвэльчэр нашчупаў пад сабой бутэльку, выцягнуў і, бачучы, што пустая, пачаў крычаць:

— Стой, стой, старшынка! Тут была бутэлька поўная атруты, дый нехта вылактаў; ці ня бачыў каго каля воза, як я у Янкеля сядзеў?

— Прапаў, братачка!—загаласіў нямым голасам старшыня: маяж гэта работа, мая! Я такі чую, што мяне нешта пячэ і млосна робіцца... Ратуй-жэ ты мяне, ратуй!!

— Німа табе, старшыначка, рады,—зельля такога пры сабе ня маю; хіба папрабуй прабегчы кавалак,—адна мая рада і ёсьць, але бегчы трэба добрай рысьсю, амаль ня ўскочку.

Саскочыў старшыня; хвэльчэр пацісnуў коніка, а той прэ і прэ за санкамі. Прасадзіў вярсту—расперэзаўся; прапёр другую—скінуў кажух; прамчаў ешчэ са дзьве—і язык высалапіў, ды давай прасіцца на воз. Зжаліўся хвэльчэр.

— Садзіся—кажэ,—братка старшыначка—ліха ўжо цябе ня возьме, але другі раз не дабірайся да чужой бутэлькі.

**А. Гурло.**

*Капыль.*

# Марымонавы сабакі.

Хоць і цяжка жылося Марымону Сьвежынскаму, але—ці то з дабраты сэрца, ці такі ўжо звычай меў,—прыплоду ад сваей жывёлы ніколі не пазбываўся Гаспадарка Сьвежынскаго ня надта крэпкая была: старая кабыла, ды сука рудая; але і з гэтай прыждаў Марымон прыбытку: васьмёра шчэнятак. І, хоць раілі суседзі звесьці гэтых дармаедоў, той ані блізка: «хай качаюцца», кажэ. І праўда: падкачаліся брэхуны і—на што тое—добра таргавала матка, а дзеткі ешчэ лепш; ані прайсьці, бывало, каля бабыля.

Вось, неяк пад восень (бадай, баб'ім летам), у сьвяточны дзень сядзеў наш Марыном на прызьбе і, пыкаючы люльку, грэў свой, як дулю, нос і угледаўся на дарогу. Ажно бачэ, плыве с пад суседняго двара панава цешча. Сунецца, прыкрываючыся чырвоным парасонам, сама тоўстая, як кадзь, спадніцы, як туга набітые абручы, сідзяць на ёй; а капялюш, капялюш! такога і з роду Марымон ня бачыў. Ліха надало падкруціцца тут рудай сучцы с сваей дружынай, і мусіць-то і ім гэты капялюш кальнуў у вочы,—быццым перакуленая ражка с пад іхняй яды; калі улягуць за паняй, толькі пыл закурыў. І не агледзіўся Марымон, як парасон, каторым прабавала было бараніцца паня, паляцеў у шматочкі, а пакуль дабег бараніць, тая ўжо, завярнуўшы аглоблі, чэсала ва ўсе лапаткі пад двор.

«Скуль толькі хада ў яе ўзялася? Мусіць-то спусьцілі сабачкі абручы гэныя?» думаў, чэшучы патыліцу, Марымон. А чэсаць патыліцу было чаго: як стой, прыпрэ пан—будзе каша! Ешчэ чаго добраго на месяцы два дармовые харчы і кватэру ўлепіць!

Толькі гэта звечарэло,—так яно і ёсьць: коціць пан да Сьвежынскаго; а ў таго і блохі ўжо падохлі.

— „Твае гэта сабакі далі пытлю маей цешчы?“—пытае, ўвайшоўшы ў хату, пан.

— „Мае, паночку, мае; каб іх воўк так пытляваў“, —атказывае, збедзіўшыся, Марымон. „Я іх у адседку ўжо пасадзіў“.

— „А ці ня можна было-б глянуць, якіе там яны“?—зноў пытае пан.

— „Чаму ня можна?—хоць зара“—кажэ Марымон і, выйшоўшы ў сенцы, выпусьціў з загародкі сабак на двор.

Доўга угледаўся пан праз вакно, як завіхалася рудая сучка абнюхіваць чужы сьлед, як у прыскочку за ёй кідалася на ўсе бакі сямейка яе, а пасьля і кажэ да Сьвежынскаго:

— „Слухай, братка прадай мне іх, добрые грошы дам“.

Глядзіць Марымон, высалупіўшы вочы: «кпіць пан, ці якое ліха»?—думае сабе. А пан ізноў да яго:

— „Ну, што тут доўга думаць?—суседзкая справа. Во табе за правадырку траячку, дый за гэтых тузганцоў па рубельчыку ад хваста. Хіба крыўды ня будзе. Сып малых у мех, ці у карзіну якую і валачы у двор, сука сама за імі паляціць“.

„Кпіны, ці не?—думае задзіўлены Марымон,—але, калі добрые грошы даюць, чаму не браць“. І, згробшы іх у капшук, зняў с калка мех, паўпіхаў у яго шчэнякоў, закінуў на плечы і цягне за панам у двор Але ў дарозі ня вытрымаў Марымон:

— „Паночку,—кажэ,—выбачайце, што буду пытаць. Мае-ж сабакі ні да птушэк складу ня маюць, ні яны ганчакі, дык на што ж вам гэта воўчае мясо? Ешчэ зноў напудзяць паню? і так мо зашкодзіло?“

— „Зашкодзіло?“—не звальняючы кроку, перапыніў пан—„Памагло, Марымонка, памагло! Вярнуўшыся пасьля гэтай лазьні, цешча і кажэ да мяне: «каб у дварэ былі гэтые марынованые зьвяры, і аднаго дня не ўсядзела б тут»!

**Галубок.**

## Сьмешны дохтар.

*С таго часу, як заўдавела Сымоніха, кепска прыйшлося кабеціне.*—Гаспадарка не пайшла рукой: зламаў конь нагу — прадала на скуру; ліхо нейкае ўбілося ў карову—дарэзала; сьвінчаці—ані падкачаць: усё капыты без пары ў гару задзіраюць; куры—і тые збялеўшые глюгі свае ў ніз паспушчалі. Сабе, як сабе—дала-б рады Сымоніха — баба шустрая была, але пасьля мужа осталося

чацьвёра дзяцей—адзін за аднаго меншы, — вось, тут і папраўся! Кідалася, кідалася баба і так, і сяк,—нічога: за жывёлай паехалі нябошчыкавы боты да Янкеля, а пасьля—опраткі, а там дзьве трубкі палатна і ешчэ, і ешчэ, ажно пакуль не апусьцела хата і не апаражніліся кубэл і зялёны ў жоўтые кветкі пасажны куфэр. Рукі выцягіваць саромілася Сымоніха. Вось і надумалася яна пайсьці да двара на раду.

— «Так і так,—кажэ кабета,—і рук не шкадую, і не засплю, і не загуляю, а ўсё як нехват, дык нехват: дзеці з голаду ажно скавычуць, сама знебылася,—хоць ты зубы на паліцу кладзі».

Глянуў пан на Сымоніху дый кажэ:

— „З вачэй і гутаркі тваей бачу, што ты—баба растаропная, а ня ведаеш таго, што цяперашнім сьветам праўдай ды працай далёка не зайдзеш; а гультаіна, каторы толькі шмат гоману робіць, туман умее людзям у вочы пушчаць, — той і качаецца, як сыр у масле».

— «Гэта нераўнуючы,—кажэ, вышчэрыўшы белые зубы, Сымоніха,—як бытцым тые паны“...

— «Бач, куды хапіла!—засьмеяўся пан.—Ты да нашай скуры не дабірайся, а лепш слухай, што я табе параю: кінься ты да знахарства—людзей лячыць; бо цяперашнім часам да праўдзівага дохтара і прыступіцца трудна, а ты не агледайся, што будуць даваць, абы часта давалі»...

— «Паночку, я-ж ня ведаю,—пачала Сымоніха,—з якога боку»...

— «Ты слухай мяне,—крыкнуў сьмехатлівы пан: як прыйдзе да цябе хворы, ты і шапчы яму на вуха, але каб ён добра не разабраў: „едзе пан „чатырмя канямі, бяжыць сучка чатырма нагамі!“ пасьля плюнь тры разы, акруціся, дый ізноў шапчы: цьфу, згінь, згінь горэ—прападзі і да нас больш не хадзі!—вось і ўсе лекі».

Мінуў год, другі; мінуў і трэйці,—Сымоніхі ані пазнаць: разтаўсьцела, пабялела, ўся у крамным; дзеці—ў чэравіках; у клеці, кубле і зялёным куфры ізноў паўнюсенька. І ня дзіва: народу да Сымоніхі валіць, як на кірмаш; едуць да знахаркі за колькі міль, а да слабейшых хворых прысылаюць па яе каней; прывозяць, адвозяць, кормяць, пояць дый грошы ешчэ плацяць.

Вось, аднаго разу заехала брычка паркай тлустых каней па Сымоніху—знахарку, каб завясьці яе ў горад да хвораго багатаго пана, ад катораго ўжо і дахтары адступіліся. Спіралася спачатку Сымоніха, але, як пачалі прасіць, згодзілася. Прыехалі. Увайшоўшы ў багатые пакоі, Сымоніха сперша збілася с панталыку, але у скорасьці, як і прыстало на знахарку, агледзілася, пасьмялела і, прыседаючы, шэпчучы дый плююючы на ўсе бакі, пачала бытцым котка да мышы красьціся да хвораго. Той лежаў, увесь абложэны пухавымі падушкамі; галава і горла абкручэны (ў горла, бач, скула забралася), дый ледзь ужо дыхае. Падыйшоўшы блізка, Сымоніха дабралася неяк да панскаго вуха, дый толькі пачала шэптаць: «едзе

пан чатырма канямі, бяжыць сучка чатырма нагамі», ажно пан, вочы вылупіўшы, стаў корчыцца неяк, я пасьля калі падскочыць на ложку, калі пырсьне пенай с крывёй, дый дзіва! зразу зарагатаў. Кінуліся ўсе да хвораго, думаючы сперша, што канае, а пасьля, што, можэ, звар'яцеў?—але пан ускорасьці ўсіх супакоіў: ад сьмеху скулу прарвало, і мог ужо сам гаварыць А сьмяяцца было чаго: пазнаў ён па шэптах даўнейшую сваю суседку—Сымоніху; а яна ледзь цяпер дагадалася, каго яна вылячыла!

**Казюк Колышко.**

# Падзякаваў.

(Народная казка).

Ішоў сабе чэлавек дарогай, угледаецца, ажно вуж пад каменем завалены ляжыць, толькі галава на версе круціцца, а ня можэ ніяк вылезьці Як убачыў чэлавека, дык кажэ:

— Выратуй мяне, чэлавечэ, з гэтуль!

Чэлавек злітаваўся над ім, падсадзіў кала пад камень, падважыў, і вуж вылез.

Ідзе той чэлавек далей дарогай і чуе — нешта халоднае на шыі. Памацаў, ажно гэта вуж, акруціўшыся кругом шыі! Пытае яго:

— А гэта што?

— А я табе заплачу так, як цяпер сьвет плаціць: ты мяне выратаваў, а я цябе задушу.

— Пастой, братка, не душы, можэ нас хто разсудзіць.

— Добра.

Ідуць дарогай, спатыкаюць ашмулянаго, старога і худога каня.

— Стой, конь! асудзі нам гэту справу.

Конь пытае:

— А што такое?

Так і так.

Конь кажэ:

— Душы! Німа праўды на сьвеці, бо і мне так зрабілі: пакуль я быў малады, моцны, мог людзям добра служыць, датуль мяне мылі, чэсалі і аброк давалі; а як я пастарэў, знядужэў, то і выгналі вон.

— Стой!—кажэ чэлавек—не душы: ён пакрыўджэны, дык не па праўдзі судзіць. Пойдзем далей!

Ідуць далей і спатыкаюць сабаку старога, каўтунаватаго і худога.

— Асудзі нам гэту справу.

— А што такое?

Так і так.

— Душы! — кажэ. — I мне так зрабілі: пакуль быў малады, сьцярог, пільнаваў хату, коні, цэлаго дамоўства, то і мяне кармілі і даглядалі; а цяпер, як пастарэў і ўжо не магу служыць, то і вон прагналі.

— Стой! — кажэ чэлавек — не душы, бо і ён пакрыўджэны. Ніхай нас трэці разсудзіць!

Ідуць далей, ажно спатыкаюць ліса:

— Ну, ліс, асудзі нам гэту справу.

— А што такое?

Так і так.

— Добра — кажэ ліс — але не магу я разсудзіць, ня бачыўшы як было: ідзі, вуж, назад, пакажы, як быў пад каменем і як цябе выратаваў чэлавек, тагды асуджу вас.

Вярнуліся назад аж да таго каменя; тады кажэ ліс:

— Падваж ты, чэлавечэ, гэты камень, а ты, вуж, улезь; а я пабачу, як ты сядзеў.

Вуж улез пад камень, а ліс міргае на чэлавека: „Пускай!“, шэпчэ, — і зноў вужа прывалілі каменем.

— Ідзем, братка згэтуль — тады кажэ ліс.

Адышлі крыху.

— А што мне — кажэ ліс — за гэта будзе, што я цябе ад сьмерці выратаваў? Дасі мне што-дзень адну курыцу за гэта?

— Дам, — кажэ чэлавек і пайшоў да дому.

Назаўтрае прыходзіць ліс, і чэлавек даў яму курыцу; і на другі і на трэці дзень даў так сама. А пасьля жонка і кажэ:

— Дурэнь ты! будзеш даваць што-дзень курыцу? Вазьмі стрэльбу, забій ліса, то будзе каўнер або тры рублі, і бяды пазбудзешся!

Чэлавек так і зрабіў.

Вось, як за дабро злым плацяць!...

Запісаў **М. Фэдэроўскі**.

# *Жарты:*

## На сходцы.

Івана выбралі старшыной.

— Шкода мне цябе, Іване! Кажэ да яго кум.

— Чаму?

— Ды, вось ты дагэтуль быў добрым працавітым гаспадаром, а цяпер ты зробішся гультаём, пьяніцай і прападзеш за ніщто.

## У судзе.

**Судзьдзя** (да сьведкі.)—Ці вы чулі, як гэты чэлавек назваў абвініцеля налпай?

**Сьветка.** Прызнацца то я гэтаго і ня чуў. Але (глянуўшы на абвініцеля) думаю, што калі ён гэтак і сказаў, дык не абмыліўся.

## На почце.

— Ваш ліст цяжкі,—трэба ешчэ дзьве маркі прыклеіць.

— Ну, паночку, тады ён ешчэ будзе цяжэйшы.

## На хаутурах.

— Пакінь ужо плакаць, Сымоніха! Нябошчыку не паможэ Ляж лепей, аддыхні, я ўжо тут усім займуся.

**Удава.** А мая-ж, ты, галубка! А схавай жэ ты грамніцу, што нябошчыку падавалі: мо́ другі будзе—прыдасцца.

## Навучыцца.

Пане, конь захварэў, ня пье саўсім.

— Дык яго ў старшыны выбярэце, то і піць пачне.

## Усяк бывае.

Адзін шэры заяц, цішком пад самым носам варты, праскочыў праз граніцу ў Аўстрыю. Сеў, пераве́ў дух і агледаецца на новы край. Падскочылі да яго аўстрыяцкіе зайцы.

— „Чаго ты ўцёк з свайго краю́? Тут, братка, такога бруха не загадуеш, як у вас. Тут скрозь платы, дроты, скрозь акцыз і каравул на нас“.

— „Бачыце, братцы, кажэ наш заяц, падняўшы вушы, у нас выйшоў учора прыказ, каб надкаваць усіх вярблюдоў!“

— „Дык, чаго ты дурень спудзіўся, ты-ж заяц, а ня вер блюд!“.

— „Добра вам гэта казаць, а у нас зловяць, падкуюць, а тады ляпай падковамі па траве, пакуль давядзеш, што ты заяц, а не вярблюд“.

6 лютаго 1911 года **АТКРЫЛАСЯ** 6 лютаго 1911 года.

самая вялікая у Эўропе

# ШКОЛА КРОЮ і ШЫЦЬЦЯ

**жаноцкіх і дзіцячых гарнітуроў, бялізны і копіроўкі модэлеў Дырэктар і асноўца больш 200 школ у Расеі і заграніцай.**

# прафэсар К. ЛЕВАНСКІ,

Майстэр Варшаўскаго Цэха, Прэдстаўнік Парыжскай Акадэміі, загадчык курсоў крою у Варшаўскім Рэмесленным Музэі; мае нагрaды «Grand Prix», гонорные дыплёмы і залатые мэдалі. Школа **К. Леванскаго**, каторая адначасьне ёсьць аддзеленьнем Парыжскай Акадэміі, вупаўняе свае празначэньне у розрых курсах, як гэта:

1. **Дамовы курс.** Жаноцкіе гарнітуры бязъ верхніх і копіроўка журналоў.
2. **Высшы курс.** Жаноцкіе гарнітуры з верхнімі і для дзяўчынак — а так сама і дамовы курс.
3. **Поўны вучыцельскі курс.** Жаноцкіе гарнітуры з верхнімі, для дзяўчынак і хлапцоў; поўны курс мужчынскай і жаноцкай бялізны, копіроўка журналоў, а так сама дамовые і выжшые курсы.

У усіх гэтыхъ курсах навука шыцьця дармовая. — Час навукі не агранічэны,—значыць, вучэніцы могуць хадзіць у школу, для практыкі, нават пасьля акончэньня курса, за што ніякай аддзельнай даплаты не бярэцца.

**Школа К. Леванскаго** прывучае да навуковай сыстэмы, а так сама памагае знішчыць ашуканства тых асоб, што нічога не разумеюць у гэтай справе. Пасьля акончэньня курса вучэніцам выдаюцца сьведоцтвы, цэховые патэнты і дыплёмы Парыжскай Акадэміі, што **даюць права на аткрыцьце школы крою**, майстэрні, права займаць мейсцы закройшчыц і вучыцельніц у школах **Леванскаго з пэнсіей ад 400 руб. і больш.**

Прафэсар **К. Леванскі вучыць без рысаваньня форм**, а толькі пры помачы зробленных ім мэханічэскіх струмэнтоў «Patron Express» і «Joupon **Kael**», патэнтаваных ў Эўропе і Амэрыцы.

Програма высылаецца дарма.

**Паперовые модные формы павэдлугъ меркі, манэкіны і журналы.**

## Запісі на навуку прыймаюцца у усіх школах.

Цэнтральная школа у Беларусі і Літве:

*Вільня, Вялікая вуліца 27* (*над кнігарняй Завадзкаго*).

АДДЗЯЛЫ:

**Могілоў**, Днепроўскі пр. д. Бака.
**Гомель**, Румянцоўская, д. Немчэнко.
**Бабруйск**, Касьцельн., д. Канеўскаго.
**Мінск губ.**, Захарэўская 34.

**Двінск**, Дваранская 48.
**Рэжыца** д. Касьцельны.
**Жытомір**, В.-Бэрдічэўская 19.
і ў інш. местах і мястэчках.

ДЛЯ ПРЫЕЖДЖАЮЧЫХ КВАТЭРА У ШКОЛЕ.

# ГАСПАДАРЫ!

Хто з вас мае хоць крыху грошы, а хочэ меці ешчэ больш, хай купіць млын, толькі ня водны ды не ветраны, а такі, што мелець пры помачы нафтоваго мотора **Буліндэра**.



Гэткі млын з мотарам Боліндэра можэ стаяць у кожным мейсцы, не вымагае асобнаго мэханіка ды ў кожны час яго дужа лёгка можна пусьціць у ход, бо кожны гаспадар сам патрапіць яго акуратна даглядзець; апроч таго ён моцны, трывалы, зусім бэзпечны ад таго, каб зрабіць пажар, ды прыносіць вялікі даход, бо зужывае мала паліва, а дае шмат мукі.

Тые млыны можна купляць гэтай велічыні:

Мотор Боліндэра 5 HP модэль A і швэдзкі млын «Эканом» "15" — Рб. 1410.00.

У гадзіну дае каля 10 пудоў мукі, а нафты зужывае на 8 кап.

Мотор Боліндэра 7 HP модэль A і швэдзкі млын «Эканом» 18" с каменьнямі з галландскаго крэмня—Рб. 1785.00

У гадзіну дае каля 15 пудоў мукі, а нафты зужывае па 12 кап.

Мотор Боліндэра 9 HP, модэль A і швэдзкі млын „Эканом" 24" съ каменьнямі з галландскаго крэмня—Рб. 2190.00

У гадзіну цае каля 20 пудоў мукі, а нафты зужывае на 15 кап.

Мотор Боліндэра 12 HP модэль A і млын „Плянэта" 42" с каменьнямі „Сатурн" Рб. 2740.00 У гадзіну дае ад 25 да 40 пудоў. мукі, а нафты зужывае на кап. 20.



Тые самые моторы могуць круціць і іншае, як гэта: крупярні, малатарні, пілы да пілаваньня ў поперак і ў доўжкі, пральні і т. д. У гэтых цэнах ужо палічэна і дастаўка на станцію, на якую загадае той, што купляе. Гаспадары каторые дадуць пэўную паруку, палову належнасьці; могуць плаціць часткамі. Млыны гэтые ўжо разам з мотарамі БОЛІНДЭРА прадае склад

## Зыгмунта Нагродзкаго у Вільні.

**вул. Завальная № 11.**

Каб паставіць млын і пусьціць яго ў рух, склад дае свайго мэханіка дарма. Кожын, хто захочэ, атрымае акуратнае апісаньне млыноў і мотороў.

Нафту, якой пуд каштуе 55—70 кап., можна купіць у кожным горадзі

# Магазын срэбных і плятэрованых вырабоў

# фабрыка ЯЗЭФА ФРАЖЭ з Варшавы

## у Вільні на Вялікай вуліцы № 58

суліць акуратна дабраные сталовые заставы (сэрвісы), як:

**Нажы, Відэльцы, Ложкі, Ложэчкі і т. д.**

гладкіе і сталовые у наймаднейшые узоры,

а таксама:

Самавары, Імбрычкі, Цукерніцы,

**Заставы (сэрвісы) да воцэту, аліва і лікероў,**

Постумэнты, Пірамідьі і Кошыкі да фруктоў і цеста,

**Тацы, Паўміскі, Рондлі і Вазы да зупы,**

Вазоны да віна і крушону,

**Масьляніцы, Компотьеры, Жардзіньеры**

Кандэлябры, Ліхтары, Люстры

**Шчоткі і іншые туалетные рэчы**

а так сама уселякіе галянтэрыйные рэчы, што вырабляюцца у фабрыцы.

**P. S.** Магазын у Вільні нідаўна адчынен дзеля таго, каб Паважаемые Пакупцы маглі дастаць праўдзівы тавар с фабрыкі „ФРАЖЭ“, а не падрабляны, нічога неварты, толькі з выгляду падобны да праўдзіваго, шмат дзэ ў апошніх часах пачалі прадаваць фальсыфікаты заместа вырабоў з маей фабрыкі.

# МІНСКІ

## Сельска-гаспадарскі Сындыкат.

**Склады машын, прылад гаспадарскіх, насеньня і штучных гнаёу**

**◂◂◂◂ У МІНСКУ, ПІНСКУ і ОРШЫ. ▸▸▸▸**

Прапануем па танных цэнах для дробных гаспадарак.

Вядомые с свасй дабраты плугі „СУХЭНІ“.

Лепшые малатарні і манэжы „ВОЛЬСКАГО“

Англіцкіе сечкарні.

Арфы (веялкі) розных сыстэмоў.

Амэрыканскіе пружыновые бароны.

Амэрыканскіе жніварні „МАК-КОРМІКА“, лёгкіе і наймацнейшые з усіх жнівярак.

АДРЭС ЦЛЯ ЛІСТОУ:

**Мінск-Губэрнскі—Мінскі Сельска-Гаспадарскі Сындыкат.**

# ПАСТАЯННЫ ДАХОД

З малака можэ мець кожын, хто ужывае цэнтрыфугу

# „Альфа-Ляваль“




## У гаспадарцы.

Дужа добра наладжэная. Найлягчэйшая для дагляду. Найпрактычнейшая, найболей эканомічная, а, значыцца, і найдзешавейшая.

**Болей за 1,250,000 цэнтрыфуг „Альфа-Ляваль“ ужо у рабоці**

**Асьцерэгацца благога падроблельня конструкції.**

Цэннікі, аб'ясьненьня, кніжкі-брошуры: „Аб вырабе масла“, „Аб спосабі павялічэньня даходу с кароў“, „Аб хаўрусных маслабойнях“, „Аб гадоўлі і даглядзе кароў“, ды іншые высылаюцца на кожнае жаданьне дарма.

## Склад Віленскага Сельска-Гаспадарскага Хауруса

ВІЛЬНЯ, Завальная вуліца № 9.

# Агрономічнае Бюро

# К. Карповіча

двор Мухоука пачт. і тэлегр. станц. Новагрудак
**Мінск. губ.**

Усім, хто толькі звернецца у Бюро да Карповіча даюцца безплатна рады, як ужываць штучные навозы (поцелы): **каініт, потасовую соль, салетру, томасшляк і супэрфосфат** на полі, на сеножацях, у садах і гародах.

Тым, хто будзе мець ахвоту запробаваць дзейство штучных навозоў на сваей зямлі Бюро высылае іх на пробу **дарма**

## Лекарня для жывелы вэтэрынарных дахтароў

# С. Бакуна і В. Шульца

Прыймае хворую жывёлу: ад 9 да 2 гадз. ў дзень, ад 5 да 8 гадз. вечэра.

У лекарні ёсьціка пастаянные стойлы для хворай вялікай жывёлы і клеткі для дробнай. У лекарні можна прышчэпляць сырватку проці шалу і чумы у сабак сыбірской язвы (карбункулу), чумы і рожы у сьвіней, халеры у курэй і т. д., а так сама рабіць аналізы хімічэскіе і бактэріологічэскіе.

**Вострабрамская вул. 10. Тэл. 880**

**С. БАКУН** ( **Вэтэрынарыйные дахтары**

**В. ШУЛЬЦ** ( **Вострабрамская вул. 16.**

## ЛЕБЁДКА

# Леонарда Іваноуекаго

Почта і тэлеграфъ **Васілішкі** Віленскай губэрні станція чугункі **Скрыбово**, Палесскіх дарог.

Прадае шчэпы фруктовые высокіе (дрэўцам) і нізкіе (кустом) найлепшых выпробаваных да нашаго клімату прывыкшых гатункоў.

Залаты мэдаль на агародніцкай выстаўцы у Пецербурзе за дабраные гатункі для Віленскай губэрні.

Ягадные кусты, парковые дрэвы і кусты. Уселякае збожа насеннае і бульба, вядомаго заводу высокае чыстасці.

**Заводные:** Сьвіньні вялікіе белые, англіцкіе. Качкі (вуткі) руанскіе. Індыкі бронзовые.

# Язэп Возніцкі

артыста рэзьбяр і прэдпрыемца будоуніцтва.

Будуе цэркві, касьцёлы, капліцы, памятнікі, дамы і др. Прыаздабляе рэзьбой і статуямі цэркві, касьцёлы і палацы. Будуе іконостасы, аутары, амбоны з гіпсу, цэмэнту, штучнаго мармуру і з дрэва.

**Будоулі жалезна-бэтонные.**

ВІЛЬНЯ, Свято-Юрскі праспэктъ № 19—15.

Працоуня на Завальнай вуліцы № 11. Тэлефон 1154.

ПРАЦОУНЯ

малярская і дэкоратыуная

# Францішка Гайковскаго

дауней А. Трэй і Ф. Гайковскі.

**у Вільні, Тверская вуліца № 10.**
**у Варшаві, Медзяная вул. № 13.**

Выпауняе уселякіе работы

Касьцёльные і цэркоўные.
Стылёвае аздобніцтво палацоў і ўсякіе работы, што належаць да малярства.



Фабрычны складъ

# Сельска-Гаспадарскіх Машын і прылад

у Вільні, Сніпішкі Кальварыйская 25

п. ф. „Колумбія“

паведамляе, што на фабрычнымъ складзе мае ўсякіе машыны і прылады.

Фабрычны склад для дробных гаспадароў больш за ўсё суліць: пара-конные ланцуговые малацілкі, катсрые розняцца ад штыфтовых тым, што ланцуговые аддзеляюць зярно, а шрыфтовые збіваюць зярно разам з саломай і гэтак прашкаджаюць у дальнейшай рабоце. Акуратные і пэўные гаспадары могуць выплачываць праз 2 гады.

На складзе ёсьць розные попелы, як: „Супэрфосфат“, „Томасоўка“ і т. д. Майстэрня пры складзе робіць усякіе папраўкі, а так сама мае запасные часьці да машын.

На жаданьне каталог і цэннікі высылаю дарма. Цэны ФАБРЫЧНЫЕ.

За акуратнасьць нашых машын і за добры ход Склад атказывае праз год.

З належнай пашанотай фабрычны склад „КОЛУМБІЯ“.

ТАВАРЫСТВО ГАНДЛЮ
аптэкарскімі і парфумэрыйнымі таварамі

у ВІЛЬНІ. „І Б. СЭГАЛЬ“ Тэл. № 547.

Галоўны склад і загад: Троцкая вул. № 7.

Аддзельные магазыны:

1. Троцкая вул. № 7. Тэл. № 89.
2. Вялікая вул. № 28 (супроціў почты) Тэл. 648.

Аддзел у ОДЭСЕ, вул. Гаванна, д. насьледн. „І. Б. Сэгаль“.

**Гуртоўные і рознічные склады**

аптэкарскіх, хімічных і парфумэрыйных тавароў, пэтэнтаваных і гатовых лекоў; туалетных рэчей і прыналежнасьцей, рэчей і апаратоў дзеля дезынфекціі, да стала і кухні, гаспадарскіх прыпасоў, хірургічэскіх струмэнтоў, дамскіх прыналежнасьцей; натуральных мінеральных вод і солей, мэдыцынскіх він, і т. д.

Дастаўка да дому на уласных конях у той самы дзень пасьля атрыманьня заказоў праз почту ці тэлефон.

Тэхнічная кантора

**Петр Земба і К-о.**

**Новомедовая № 3,**
**у Варшаві.**

СКЛАД
помп, пажарных труб,
машын,
жалэзных труб,
тэхнічных прылад і
рэзінавых
вырабоў.

**Тэлеф. 75—94.**

У Вільні
**ГАСЬЦІНІЦА**

# ЖОРЖА

**акуратна адноўлена.**

**Нумэры ад 1 руб.**

Найлепшы рэстаран
у горадзі

**Падчас абеду і вячэры**
**іграе квартэт**

Горнапрамышленная і Тэхнічная
**кантора**

# І. І. Луцкевіча і Д. Т. Семашко

прадае мінэральны апал: каменны вугаль, апаловы і ліцейны, кокс і т. п.

Прадае сталёвые трубкі, каб адвясьці пару.

Прадае катлы і іншые тэхнічные прылады для мэханічныхъ фабрык.

*У Вільні. Ягороускі праспэкт д. №4—10, тэлеф. 830.*

Адрэс для тэлеграм:—**ВІЛЬНО ГОРНОПРОМ.**

У Вільні Хаурус
ДАМСКІХ і МУЖЧЫНСКІХ
# Краўцоў

выпоўняе ўселякіе заказы, што належаць да кравецтва, як з свайго матэр'ялу, так і з матэр'ялоў заказчыкоў.

**Працоўня пад загадам вядомых спэціалістоў робіць усё дужа добра, шыбка і сумленна.**

**Вуліца Скапоўка № 6.**

**Вялікі залаты мэдаль**
у Вільні Вялікая 30
**ПОЛЬСКІ**
ГАЛЯНТЭРЫЙНЫ МАГАЗЫН
# „А. Ростковскі"
СУЛІЦЬ:
мужчынскую бяліэну, краваты, шкарпэткі, падцяжкі і жаноцкую конфэкцію.
**УЛАСНАЯ ФАБРЫКА ІСПОДАК**
(Исподкі с парукай)
Фірма атрымала на выстаўцы ў Марсэліі ў 1908 г.
**НАЙВЯЛІКШУЮ НАГРАДУ**
за добрые і густоўные тавары
Цэны пастаянные і танне, даступные для ўсіх

**Здароўе гэта найлепшы падарак.**
Вядомая ўсяму сьвету | ачышчаючая кроў т.ава „Вікторыя" рэкомэндуецца усімі вядомымі дахтарамі, пазволена дэпартамэнтам мэдыцыны. Гэрбата „Вікторыя" патрэбна кожнаму, хто хочэ быць здаровым, лечыць лішаі і ўсякіе прышчы, твар робіцца крумяным. Пэўнае лекарство на раматызм, астратызм, гомэройды і ад хвароб жывата, завострывае апэтыт, пацкрэпляе сілы і успакаівае нэрвы, надта памагае пры удушцы і болях галавы ды друг. хвароб. многа падзякавань. Цэна за пачку с перасылкай 1 рубель 25 кап. Высылаецца зараз накладной платай, пры кожнай пачцы ёсць апісаньне як ужываць.
Адрэс галоўнага прэдставіцеля
**Ф. Шостаковскій, Варшава, вул. Згода № 5.**

# АГАРОДНІЦКАЯ Суполка
**Вільня, Вялікая (Замковая) № 4, тэл. № 50**
ЗАУСЁДЫ мае на СКЛАДЗЕ
**НАСЕНЬНЯ**
**цыбулькі, кусты, фруктовые дрэўкі, флянцы і т. д.**
Агародніцкіе прылады
Попел (штучные гнаі), хэмікаліі і прылады для змаганьня са шкоднікамі
**Для сельска-гаспадарскіх хаўрусоў і хаўрусных крам вялікая уступка.**

## Рэдакція „Нашае Нівы“ (Вільня, Завальная 7) мае на складзе і прадае вось якіе беларускіе кніжкі:

### I. Да навучаньня.

* Беларускі лемэнтар . . . . . . . цэна 6 кап.
* Першае чытаньне, Цёткі . . . . . „ 6 „
Другое чытаньне, Коласа . . . . „ 25 „
Karotki katechizm . . . . . . . . „ 5 „

### II. Навуковые, даступные для ўсіх:

Гутаркі аб небі і зямлі з рыс. . . цэна 15 кап.
* Цукер, В. Тройцы . . . . . . . . „ 3 „
* Гутаркі аб гаспадарцы . . . . . . „ 3 „
* Як ратаваць уздутую жывёлу . . „ 3 „
* Як бараніцца ад халеры . . . . . „ 1 „
* Як рабіць добрые рамовые вульлі „ 5 „
* Зямельная справа у Новай Зэляндыі „ 3 „
Аб гаспадарцы на хутары і шнурох „ 5 „
* Кароткая гісторыя Беларусі Власта „ 60 „
* Беларусы і іх нацыональнае адрадзэньне . . . . . . . . . . распродано
* Як ужываць штучны навоз . . . „ 2 „
Колькі слоу аб дзявочай апратцы на Беларусі . . . . . . . . . . . „ 10 „
Пчэлінка стварэньне малае, а карысьці прыносіць шмат . . „ 30 „

### III. Повесьці, апаведаньня прозай.

Дым, Конопніцкай . . . . . . . . цэна 4 кап
Казкі . . . . . . . . . . . . . . „ 6 „
* Гэдалі, Э. Оржэшко . . . . . . . „ 6 „
* Казка аб вадзе . . . . . . . . . „ 3 „
Архіп і Лявонка, Горкаго . . . . „ 8 „
Дзядзька Голад, Віткевіча . . . . „ 2 „

### IV. Вершы.

Вязанка Я. Лучыны . . . . . . . цэна 4 кап.
* Тарас на Парнасе . . . . . . . . „ 5 „
Дзед Завала, Ядвігіна Ш. . . . . цэна 5 кап.
Снапок, зборнік вершаў А. Паўловіча . . . . . . . . . . . . „ 15 „
Адвечная песьня, абразок у XII зьявах Я. Купалы . . . . „ 20 „

| | | |
|---|---|---|
| * А хто там ідзе. Песьня Я. Купалы з нотамі . . . . . . . . | „ | 10 „ |
| Biełaruskije pieśni z notami. Sabraŭ A. Hryniewič . . . . . . . . | „ | 30 „ |
| * Беларускі песеньнік з нотамі . . | „ | 15 „ |
| Песьні жальбы, Якуба Коласа . . | „ | 30 „ |
| Huślar, zbornik wieršaŭ J. Kupały | „ | 50 „ |
| Кацярына, Т. Шэвчэнка . . . . . | „ | 10 „ |
| Жалейка. Зборнік вершаў Я. Купалы . . . . . . . . . . . . | „ | 50 „ |
| Pan Tadeuš, A. Mickiewiča pierekł. Marcinkiewiča . . . . . . . . | „ | 25 „ |
| Hapon, apowieść Marcinkiewiča . . | „ | 15 „ |
| Wiečarnicy, apowieści Marcinkiewiča | „ | 15 „ |
| Ščeroŭskije dażynki, Kupałła, Marcinkiewiča . . . . . . . . . | „ | 20 „ |
| Dudka biełaruskaja M. Buračka . . | „ | 25 „ |
| Smyk biełaruski S. Reŭki . . . . | „ | 20 „ |

## V. Беларускіе тэатральные творы.

| | |
|---|---|
| Модны шляхцюк, камэдыя у 1 дзеі Каганца . . . . . . . . . | 25 кап. |
| У зімовы вечэр. Абраз Э. Оржэшко у 1 дзеі . . . . . . . . . | 35 „ |
| Пашыліся у дурні. Жарцік Крапіўніцкаго у 3 дзеях . . . | 60 „ |
| Сватаньне. Жарцік Чэхова . . . . | 25 „ |
| Міхалка. Камэдыя у 1 дзеі . . . | 35 „ |
| Па рэвізіі, абраз у 1 дзеі Крапіўніцкаго . . . . . . . . . . | 35 „ |

## VI. „НАША НІВА“ за гады.

| | |
|---|---|
| * 1906 . . . . . . . . . . . . . . | 50 „ |
| * 1908 . . . . . . . . . . . . . | 2 р. — „ |
| * 1909 . . . . . . . . . . . . . | 2 „ — „ |
| * 1910 . . . . . . . . . . . . . | 2 „ — „ |
| * Беларускіе календары за 1910—1912г. па | 15 „ |

Кніжкі адзначэные зоркай * друкаваны лацінскімі (польскімі) і рускімі літэрамі.

B000000022390 1